



*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

Доўга я пражыў на гэтым свеце, нашмат даўжэй, чым абяцаў аўтар псалмоў простым смяротным. І, дзякуючы абставінам, пра якія чытач далей даведаецца, маё жыццё з ранняга дзяцінства і да нядаўняга часу развівалася ў розных краінах, я меў розныя заняткі і вёў справы з самымі рознымі сацыяльнымі класамі - ад ніжэйшых да вышэйшых, гэта рабіла мяне сведкам ці нават дадатковым чыннікам розных цікавых падзей і гістарычных дэталяў, не заўсёды вядомых даследчыкам. Бо, паўтаруся, перыяд маіх цалкам ясных успамінаў ахоплівае цэлых семдзесят гадоў, і пачаліся яны на маёй радзіме, яшчэ ў па-сапраўднаму феадальныя часы і дайшлі да часоў, калі на трэцяй частцы нашага кантынента ўсё жыццё еўрапейскіх народаў развіваецца пад уладай камунізму, яго пагрозай і пастаянным страхам перад ім. Таму матэрыял для назіранняў і ўспамінаў я маю даволі багаты.

Ужо перад сусветнай вайной (тут і далей, Першай сусветнай - *Л. Л.*) многія мае сябры пачалі падахвочваць мяне пачаць пісаць дзённік. Я іх не слухаў, бо я чалавек дзейны і працавіты нават і ў глыбокай старасці. Таму я не меў схільнасці паглыбляцца ў сваё мінулае, бо пакуль, каб запоўніць сваё жыццё, свой час і свае думкі, мне дастаткова сучаснасці. І калі, амаль раптоўна, у 1920 годзе надышоў перыяд поўнай бяздзейнасці і жыццёвага вакууму, узнік сімптом, якога я не пажадаў бы ніводнаму разумова гнуткаму чытачу, - старэчая лянота і абыякавасць. Іх магла пераадолець толькі нейкая "іскра".

Затрашчала гэтая "іскра" восенню 1925 года ў таварыстве паляўнічых. Паміж двума калегамі адбылася размова пра 1918 год. Адзін з гэтых паноў пражыў той час па гэты, а другі - па той бок "кітайскай сцяны", створанай фронтам. [...] Калі я атрымаў параду пісаць ад адукаванага, начытанага пана і выключна кампетэнтнага дарадцы, дык падумаў, а што яшчэ я магу зрабіць карыснага, і ўзяўся за працу. На самым пачатку ўзнікла некалькі пытанняў. Па-першае, на якой мове мне пісаць? Я шмат пісаў і публічна гаварыў па-польску, па-руску і па-французску. Але галоўнай скрыпкай для мяне заўсёды была французская, віяланчэллю - польская, кантрабасам - руская мова. Для мяне было б забавай пісаць па-французску, але па-польску гэта стала сапраўднай працай. Тым не менш, я спыніўся на польскай мове, бо кожнага пісьменніка найперш цікавяць чытачы. Сярод замежнікаў іх не знойдзеш, і ў нас змяншаецца колькасць асоб, якія ахвотна і свабодна чытаюць па-французску.

Таму многія прыдзірлівыя чытачы напэўна сустрэнуць словы ці фразы, якія пахнуць галізмамі. Прашу яго прыслухацца да парады сапраўднага "музыканта" польскай мовы, пана Часлава Янкоўскага, які ў некалькіх артыкулах, прысвечаных мне, заўсёды раіў чытачам ці слухачам звяртаць увагу не на тое, як гаворыць ці піша пан Мілеўскі, а на тое, што ён кажа ці піша.

Другое пытанне: якога тыпу гэты дзённік? Згодна з нямецкай тэрміналогіяй: "суб'ектыўны" ці "аб'ектыўны"? Я, безумоўна, аддаю перавагу другому, а не першаму тыпу. На розных мовах я чытаў шмат успамінаў і практычна ўсе яны цікавілі мяне больш, чым раманы, бо самая яркая чалавечая фантазія пра падзеі ці характары не дасягае рэчаіснасці. Які Вальтэр Скот, Гофман, Эжэн Сью, Крашэўскі маглі б прыдумаць ... Распуціна? Нават самыя таленавітыя і вядомыя пісьменнікі, як Ж. Ж. Русо ў сваёй "Споведзі" [...] пагружаюцца ў нястомнае назіранне за ўласным пупком і знаёмяць чытача са сваімі сардэчнымі рэфлексамі або драбнюткімі дэталямі хатняга жыцця, што ў мяне часам выклікае агіду. Нас людзей, асоб на двух нагах і нібы разумных стварэнняў, на свеце не менш за паўтара мільярды. Кожны з нас у свой час марыў пра манну нябесную, быў закаханы, меў сяброў, кожны ў жыцці меў ад іх разнастайныя сюрпрызы, падманы, прыгоды і г. д. Доўга расказваць пра ўсё гэта чытачам, як гэта робіць Мараўскі[1] пра свае стасункі з чыноўнікамі кансісторыі ці віленскімі месцічамі, або як нядаўна зрабіў знакаміты заходні арыстакрат пра свае шлюбныя спрэчкі, мае такі ж сэнс, як і ваша кухонная кніга.

Аднак гэтаму не будзе супярэчыць тое, што я спачатку больш падрабязна разгледжу паходжанне самога аўтара ўспамінаў. Два погляды падштурхоўваюць мяне зрабіць так.

Па-першае, гэта дазволіць мне звярнуць увагу чытача на малавядомую гістарычную з'яву, памяць аб якой, як я зразумеў тут у Познані, хутка згасае нават у той частцы краіны, дзе яна мела месца, а менавіта размова пойдзе пра каласальнае пераразмеркаванне зямельнай

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[1] Верагодна маецца на ўвазе: *Morawski S. Kilka lat mlodosci mojej w Wilnie, Warszawa 1924. - Л. Л.*

pawet.net




уласнасці, сацыяльных, грамадскіх чыннікаў і эканамічных фактараў, якія адбыліся, галоўным чынам у Літве і Беларусі, у часе паміж пачаткам агоніі Рэчы Паспалітай, г. зн. ад Станіслава Аўгуста і па самы страшны жыццёвы крызіс, якім стаў 1863 год.

Па-другое, я маю цвёрды намер пісаць праўду, калі буду апісваць гісторыю, людзей і падзеі, падабаецца гэта камусьці ці не. Аднак загадзя ведаю, што цалкам гэты намер я не выканаю. Чаму? Таму што ў меркаваннях чалавека няма абсалютнай праўды. Гэта зразумела нават, калі не прымаць тэорыі адной філасофскай школы, якая адмаўляе існаванне любой рэальнасці, бо яна нібыта ёсць толькі ўяўленне, створанае нашымі пачуццямі. Гэта бачна з пастаянных, штодзённых разыходжаннях у аднолькава шчырых, добрасумленных і перакананых паказаннях сведкаў падчас судоў. Гэта дастаткова даказвае, што заявы і перакананні залежаць перш за ўсё ад схільнасці і пункту гледжання чалавека. Тут самы галоўны і непераможны ўплыў аказваюць паходжанне, спадчынныя традыцыі і звычкі, а таксама дзіцячыя ўражанні і выхаванне кожнага чалавека. Для хранікёра, які шчыра думае, што ён толькі фатаграфуе жыццё, усё гэта з'яўляецца тым, чым для сапраўднага фатографа будзе вышыня, святло ці бок, на якія ён паставіў сваю камеру. Таму, кожная фатаграфія выглядае па-рознаму.

Няхай чытач, гледзячы на апісанне падзей праз свае акуляры, якімі стала для яго жыццё, ведае, з якога паверха (з першага ці з верхняга) і праз якія акуляры глядзеў на іх мемуарыст. Маючы жаданне наблізіцца да ісціны, ён можа вылічыць нешта прапарцыйна-сярэдняе.

Што ж да раздзелаў гэтай працы, дык іх мне падказала сама хада майго жыцця. У першай яе частцы, самай працяглай, бо яна дасягае 50-гадовага ўзросту, я быў толькі простым мінаком, які сачыў за гістарычнымі падзеямі і не ўдзельнічаў у іх асабіста. Мае ўспаміны пра гэты перыяд (1848-1898) могуць мець вартасць толькі як альбом малюнкаў і партрэтаў, як, напрыклад, цікавыя і пазнавальныя дзённікі канца XVIII ст. Другі перыяд пачаўся ў 1898 годзе падчас кароткай паўзы, калі імператар Мікалай II выпаўз з-пад спадніцы сваёй маці, але яшчэ не трапіў пад спадніцу жонкі і калі нейкія промні святла і паветра ўвайшлі ў падзямелле, у якім 30 гадоў задыхалася наша грамадства. Гэта быў час, калі мне было наканавана разгортваць грамадска-палітычную дзейнасць. Апошні перыяд 1914-1921 гадоў пачаўся, калі пад уплывам майго бацькі, пагаршэння здароўя і некаторага расчаравання я збіраўся паставіць крыж на сваёй дзейнасці і, кіруючыся парадай Мантэня, вырашыў апрануцца ў халат старасці. Але грамадская жылка яшчэ падштурхнула мяне далучыцца да шматлікага тады рою мух, якія пхалі польскі рыдван. Хаця я мала што рабіў, але бачыў многае спачатку з аднаго, а потым з другога боку [...] і не аднойчы пераканаўся, што многія суайчыннікі, якія не пакідалі сваёй радзімы ад пачатку і да канца драмы, і сёння вельмі слаба ўсведамляюць, асабліва, пачынаючы з сярэдзіны 1915 г., тое, што рабілася па-за межамі нямецкага жалезнага кальца. Паколькі гэты гістарычны перыяд, несумненна, будзе прадметам шматлікіх даследаванняў, як дагэтуль перыяд Вялікай французскай рэвалюцыі, мая праца можа служыць дадатковай крыніцай інфармацыі. [...] Такім чынам, пасля анансаванага вышэй кароткага гістарычнага пралогу мы будзем мець успаміны пра:

1) прыватнае жыццё 1848-1898 гг.;
2) грамадска-палітычнае жыццё 1898-1914 гг.;
3) катаклізм 1914-1921 гг.
[...]

Познань, май 1926 г.

# Кніга першая

# Прыватнае жыццё

## *Раздзел I*

## *Старажытная гісторыя, паходжанне аўтара*

Нарадзіўся я 6 жніўня (26 ліпеня) 1848 г. у Друскеніках, курортным мястэчку каля Гародні, ад бацькі Аскара Корвін-Мілеўскага гербу Слепаўрон і маці Веранікі Ланеўскай-Воўк герба Дзве трубы[2].

Мінулае абодвух маіх ліній, бацькоўскай і матчынай, цесна звязана са згаданым вышэй эканамічным і сацыяльным пераваротам (пераразмеркаваннем), які адбываўся сярод шляхты ў Літве і Беларусі (а таксама на Падоллі і ў Украіне) паміж сярэдзінай XVIII і сярэдзінай XIX ст. У сярэдзіне XVIII ст. гэты вялікі край, роўны па плошчы ўсёй сучаснай Польшчы, у сярэдзіне XIX ст. належаў (разам з плошчамі, занятымі прыгоннымі сялянамі) у прапорцыі большай чым 2/3, шляхце - польскай або спаланізаванай. Тады, як у часы першага падзелу шляхта мела менш за 1/3. Ільвінай доляй гэтай зямлі раней валодала некалькі вялікапанскіх сем'яў - Радзівілы, Пацы, Сапегі, Хадкевічі, Пацеі, з якіх адзін Караль Радзівіл Пане Каханку меў каля 12 мільёнаў гектараў. Потым ішлі шматлікія і вялікія каралеўскія і дзяржаўныя маёнткі - староствы, польскай артылерыі і г. д., і, нарэшце, у канцы - маёмасць касцёлаў і кляштароў.

Усё гэта памянялася ў XIX стагоддзі. З вялізнай фартуны (маёмасці - *Л. Л.*) Караля Радзівіла Пане Каханку, у руках унучкі яго брата княгіні Вітгенштэйн, дачкі князя Дамініка, каля 1840 г. заставаўся толькі мільён сто тысяч

[2] У трэцім томе цікава і ярка напісанай кнігі Чэслава Янкоўскага "Ашмянскі павет", чытач зможа знайсці вялікі матэрыял, прысвечаную маёй маёмасці, сям'і і сваякам, натуральна, не без недакладнасцяў, асабліва ў датах.



**Гіпаліт Корвін-Мілеўскі**

гектараў. Гэта фартуна пацярпела ўжо падчас першага падзелу 1772 года праз канфіскацыі маёнткаў у Магілёўскай і Віцебскай землях, зменшылася яна дзякуючы так званым *эксдывізіям*[3], якія праводзіліся згодна са Статутам ВКЛ і вялі да ліквідацыі буйной нерухомай маёмасці. Апошні Сапега з літоўскай лініі, эмігрант 1831 г. князь Яўстах, бацька знакамітай пані Марыі Браніцкай з Белай Царквы і дзед міністра замежных спраў у 1921 г., як і апошні з Пацаў, пацярпеў ад канфіскацыі сваіх вялікіх маёнткаў (хоць паменшаных ужо ў XVIII ст.) у Гарадзенскай зямлі. Род Пацеяў згас перад апошнім падзелам, род Хадкевічаў яшчэ добра трымаўся на Валыні да Сусветнай вайны, але іх вялізныя маёнткі на Віленшчыне ў XIX стагоддзі пайшлі пад эксдывізію. Шматлікія езуіцкія маёнткі пасля роспуску ордэна ў 1773 г. былі раздадзены Рэччу Паспалітай "заслужаным у краіне людзям" на правах поўнага дзедзіцтва з вельмі памяркоўнай штогадовай аплатай, грошы гэтыя ішлі на асвету. Шматлікія староствы і каралеўшчыны пры кожным падзеле Рэчы Паспалітай сваім фаварытам раздавала царыца Кацярына II, і ўсе яны, за выключэннем аднаго Платона Зубава, хутка распрадавалі сваю маёмасць мясцовым панам.

Такім чынам менш, чым за стагоддзе, больш за дзесяць мільёнаў гектараў зямлі змянілі гаспадароў і амаль што выключна на карысць аднаго з трох тагачасных слаёў шляхты, а менавіта сярэдняга слоя. Гэта мела вялікае значэнне не толькі ў эканамічным і сацыяльным, але і ў культурным і нацыянальным планах. Паўсталі шматлікія двары, населеныя сем'ямі, якія маглі даць сваім дзецям добрую адукацыю, гэтыя двары сталі цэнтрам польскасці, але пры гэтым падтрымлівалі беларускую ці летувіскую мовы. Таму пасля знікненнем дзяржаўнасці, за сто гадоў агоніі (1762-1862), нацыянальная справа прасунулася наперад больш, чым за ўсе папярэднія амаль што чатыры стагоддзі - ад Уладзіслава Ягайлы да Станіслава Аўгуста.

Тры слаі шляхты, пра якія я толькі што згадаў, за выключэннем цяпер ужо вымерлых магнатаў, складаліся з:

1) Верхняга слоя. Гэта не вельмі шматлікія сем'і (100, максімум 200), якія часам былі звязаны сямейнымі сувязямі з адным з магнацкіх родаў, раней займалі нейкія сенатарскія пасады і зваліся "кармазынамі" [4]. Яны мелі значныя але не празмерныя сродкі і ўтрымлівалі толькі абмежаваную шляхетную кліентуру. Пры тым, што, напрыклад, Караль Радзівіл трымаў сапраўднае войска, якое ў асноўным складалася са шляхты.

Вось гэты слой, пішу па-памяці і таму падаю далёка не поўны спіс родаў, ідучы пры гэтым, з усходу на захад:

- у Магілёўскай зямлі, роды Цеханавецкіх, Солтанаў, Галынскіх, Свяцкіх;
- у Віцебскай і на Інфлянтах, роды Борхаў, Шадурскіх, Бяніслаўскіх, Лапацінскіх, Ліпскіх (галіна вялікапольскага роду), галіна роду Плятэраў і роду Грабніцкіх, на самым усходзе (да першага падзелу) Ланеўскіх-Ваўкоў;
- на Меншчыне, роды Несялоўскіх, Рэйтанаў, Вайніловічаў, Ваньковічаў, Абуховічаў, Войнаў, Прушынскіх, Прозараў, Цюндзявіцкіх, Лагойскіх Тышкевічаў, Незабытоўскіх;
- на Віленшыне, роды Тызенгаўзаў, Жабаў, Юдыцкіх (усе тры згаслі), Мірскіх, Сулістроўскіх, Яленскіх, Прускіх (згаслі), Хамінскіх, Друцкіх-Любецкіх, Гячэвічаў;
- на Гарадзеншчыне, роды Скірмунтаў, Старжэнскіх, Нямцэвічаў, Сегяняў, Улодкаў, Пуслоўскіх і інш.;

на Ковеншчыне - роды Гурскіх (з іх выйшлі сем жмудскіх цівуноў), Карпаў, Чапскіх (адзін з іх, паморскі, ажаніўся са зводнай сястрой "пана Каханку"), Агінскіх, Пузынаў, Белазораў, Касакоўскіх, Ваўжэцкіх, Гружэўскіх, Плятэраў, Забелаў, Белазораў, Завішаў і інш., і інш.

Гэтаму слою "паноў", згаданая грунтоўная эканамічная эвалюцыя, прынесла мала карысці. Яны і так мелі для сваіх патрэб ажно зашмат зямлі, але, каб скарыстацца магчымасцямі, не мелі капіталу і характарызаваліся адсутнасцю ініцыятывы і прадпрымальнасці - недахопам, тыповым для ўсіх сацыяльных класаў, якія даўно прывыклі да свайго росквіту. З гэтага патрыцыяту, наколькі я ведаю,

[3] У ВКЛ існаваў закон, па якім, у выпадку неплацежаздольнасці даўжніка, яго маёмасць не прадавалася з аўкцыёну, але дзялілася на часткі адпаведна ліку крэдытораў. - *Л. Л.*

[4] Кармазынавы колер - ярка-чырвоны колер, кармазын - каштоўная чырвовая тканіна, адсюль: кармазын - заможны шляхціц. Так называлася прывілеяванае саслоўе шляхты - за кармазынавы (чырвоны з ухілам у малінавы альбо цёмна-вішнёвы) колер адзення. Цікава адзначыць, што, калі шляхецтва якой-небудзь асобы выклікала сумнеў, гаварылі - "няпэўны кармазын". - *Л. Л.*

выйгралі толькі легендарны палкоўнік (войска Радзівілаў) Міхал Тышкевіч, Ігнацы Плятэр у Літве, сенатар Галынскі ў Беларусі, Ксаверый Пуслоўскі, Умястоўскі[5] і, нарэшце, мой прадзед Ланеўскі-Воўк - яны скарысталіся ад гэтай багатай "маёнткавай манны" і дасягнулі па-сапраўднаму вялікага багацця.

2) Яшчэ менш магла скарыстацца з сітуацыі трэцяя катэгорыя шляхты, так званая шарачковая, засцянковая ці загродавая шляхта - яшчэ вельмі шматлікая на пачатку XIX стагоддзя. Дзякуючы патрабаванням расійскай геральдыкі яна паступова занепадала, пакуль амаль не злілася з сялянскім класам. Гэтыя небаракі "не мелі з чаго пачаць".

3) З гэтай сітуацыі амаль выключна скарысталася толькі сярэдняя шляхта, якая валодала ад некалькіх дзясяткаў і да якіх ста - паўтараста сялянскіх сем'яў (г. зн. дымоў). Мільёны магнацкіх гектараў перайшлі ў рукі гэтай шляхты без усялякіх грашовых выдаткаў - як да крэдытораў і арандатараў. А крыху большыя маёнткі старостваў, маёнткі кляштароў і г. д., з-за недахопу капіталаў і адсутнасці канкурэнцыі, былі выкуплены імі за бясцэнак, бо прапанова значна перавышала попыт. Лад жыцця тагачаснай шляхты да сялянскай рэформы і паўстання 1863 г. і яе менталітэт у любым выпадку выключалі прыцягненне капіталу, дарэчы капітал можна было захоўваць ці толькі ў выглядзе тэрміновай пазыкі іншаму абшарніку, які меў патрэбу ў грошах і таму не выклікаў вялікага даверу, ці ў дукатах і срэбры, якія ляжалі ў мяшках і акутых скрынях.

У той час усё яшчэ пераважаў распаўсюджаны стыль часоў Сасаў (саксонскіх каралёў)[6] - есці, піць і расслабляцца. Сярэднестатыстычны землеўладальнік сярэдняга калібру не жыў лепш, чым дазваляў яму маёнтак, але жыў лепш чым дазваляў яму яго даход, бо амаль не бачыў яго. Розум чалавека мае межы, але глупства бязмежнае. Знеахвочаныя нядобрасумленным "эканомам" ці "цівуном" сяляне прыносілі малы прыбытак, і яго значную частку "з'ядала" абшарніцкая гасцiннасць. Да таго ж, падчас кантрактаў на "Юр'я" ці на "Юзафа" трэба было купіць запас тканін для пані і паненак, сухафруктаў і арэхаў для кладоўкі і хатняга венгерскага віна ў піўніцу - каб зрабіць гэта, трэба было ісці да Іцкі, а потым прасіць адтэрміноўку даўгоў у іншага шляхціца-скапідома. І ў выніку, яго вялікасць аддае Богу душу і пакідае сям'ю ў бядзе, але ён будзе акружаны павагай і шкадаваннем братоў-шляхты: "Шляхетны чалавек, сапраўдны шляхціц, што тут скажаш!"

Побач з ім, у значна меншай колькасці, меліся абшарнікі з памяркоўным ва ўсіх адносінах характарам. У цвярозым стане яны не сядзелі тыднямі і месяцамі ў суседзяў і сваякоў і таму маглі даглядаць сваю гаспадарку. Яны мелі дастатковы даход каб жыць камфортна, адпраўляць сыноў у школы, забяспечваць дачок дастатковым пасагам, яны маглі эканоміць грошы і карысталіся магчымасцю купіць больш вялікі маёнтак. Паміралі без даўгоў, але пакідалі толькі некалькі сотняў дукатаў на сваё прыгожае пахаванне. У пахавальнай прамове над імі, казалі: "Чалавек прыстойны, але лічыў грошы". А гэта ўжо было не вельмі добра.

І зусім рэдкім быў тып гаспадара (якіх у Францыі 9/10 сярод сярэдніх землеўладальнікаў), тып, які метадычна наглядаў за сваім маёнткам, планаваў свае выдаткі ў адпаведнасці са сваімі рэальнымі даходамі і штогод адкладваў частку гэтага даходу на "чорную гадзіну". У скарбец такога шляхціца дукаты лезлі, як мухі ў смятану.

Па-праўдзе, ураджаі з гектара былі мізэрныя, але засяваліся вялізныя плошчы, што прыносіла прыбытак. Калі я ў 1877 годзе атрымаў Лаздуны, дык знайшоў гаспадарчыя запісы 1856-1861 гадоў. Той самы маёнтак, у якім праз 50 гадоў пры высокаінтэнсіўнай гаспадарцы, выдаткі складалі 80% ад агульнага даходу, раней прыносіў толькі 4%. Расходы былі - сціплыя заробкі эканомаў, крыху жалеза і алею для млына. Натуральна, што ледзь не палову чыстага даходу яшчэ ў 1862 годзе прыносіла дармовая праца прыгонных.

Шляхціц гэтай 3-й катэгорыі, які не паіў сваіх братоў-шляхту і заўсёды меў вольныя грошы, па літаратурнаму называўся "скнарай", а па-суседску - "свіннёй".

З тагачасных першакласных гаспадароў вялікую фартуну (маёмасць) меў толькі палкоўнік Тышкевіч. Іншыя ж, калі і не займаліся бязладным п'янствам са шляхтай, дык толькі таму, што ім была агіднай пошласць і гучная пампезнасць п'янак. Ксаверый Пуслоўскі рос у багацці і элегантнасці, першы ардынат[7] Ян Тышкевіч, філантроп англійскага кшталту, шчодра адбудаваў свае Біржы іператварыў там свае 1200 сялянскіх хат у англійскія фермы. Мой дзед Воўк трымаў 60 цугавых коней, уласны аркестр і дрэсіраваных мядзведзяў са Смаргонскай акадэміі, пазычаў дзесяткі тысяч рублёў пад мізэрны працэнт або раздаваў суседзям, якія яму лісліві і г. д. Але ўсяроўна, жаданне валодаць капіталам было "свінствам": "Не па-рыцарску гэта, мой пане".

1863 год і яго горкія наступствы неадкладна змянілі гэты менталітэт. Ужо каля 1880 года добрае гаспадаранне і захаванне акцый ці заставўных лістоў Віленскага банка лічылася грамадзянскай цнотай. А паколькі "свіння", якая набыла маёнтак, не мела канкурэнтаў, то праз 5 гадоў нованабытая маёмасць акуплялася і куплялася новая і г. д.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[5] Меў мянушку "Стараста Вывяндлінскі".

[6] Часы Сасаў - часы, калі на польскім троне знаходзіліся кароль Аўгуст II Моцны і яго сын Аўгуст III. - *Л. Л.*

[7] Ардынат - уладальнік ардынацыі. Ардынацыя (ад лац. ordinatio - кірую, прызнаю, загадваю), непадзельная і неадчужальная ўласнасць пэўнага магнацкага роду, таксама прававыя нормы, што рэгулявалі спадчыннасць на гэтую ўласнасць. Тое самае, што і маярат. - *Л. Л.*





*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг у наступным нумары.)*

Такім чынам на месцы вялізных магнацкіх абшараў і каралеўскіх дзяржаўных ці касцельных уладанняў, утварыўся новы патрыцыят, які геральдычна быў ранейшым, за выключэннем некалькіх сапраўдных выскачак, часткова яўрэяў, часткова сялян. Вельмі хутка, асабліва дзякуючы шлюбам і аднолькаваму ладу жыцця, гэты слой зблізіўся з ранейшым, хоць пільнае вока дазволіла заўважыць у першых у параўнанні з другімі маленькія "мушкі ў носе", аднак пад канец XIX стагоддзя гэтую дэмаркацыйную лінію ўжо нялёгка было заўважыць. Яна бясследна знікне, калі абодва слаі пачнуць чысціць свае боты.

У такім асяроддзі як па бацькоўскай, гэтак і па матчынай лініі я нарадзіўся і вырас[8].

Мяне мала цікавіць генеалогія, і я не буду, як нейкі інфляндзец[9], весці генеалогію ад Адама, а задаволюся аповедамі бацькоў і хатнімі дзённікамі.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя ў Слуцкім павеце жыў пан Дамінік Корвін-Мілеўскі гербу Сляпаўрон. [...] Меў ён нядрэнны маёнтак і быў жанаты з Войнянкай[10] якая паходзіла са знатнай на Наваградчыне сям'і. Але ён дазволіў заблытаць сябе нейкаму аферысту, за якога паручыўся, пасля чаго памёр ад згрызотаў, удава не дала сабе рады, і маёнтак занапаў. Тады яна пасялілася ў Слуцку, і там маім дзедам Гіпалітам, які быў яшчэ падлеткам, апекаваўся вельмі заможны сваяк Юдыцкі (гэты род згас). Ён даў дзеду добрае выхаванне і пасля апошняга падзелу накіраваў на дзяржаўную службу, якая тады грунтавалася на выбары шляхты. Пасля буры 1812 г., як Ашмянскі суддзя, Гіпаліт набыў пад Смаргонямі па-езуіцкі маёнтак Цыцін з васьмідзесяці хат, глеба тут была вельмі добрай для пшаніцы. Маёнтак ушчэнт спалілі і зруйнавалі французы і казакі, і Гіпаліт набыў яго ў растэрміноўку з невялікай першай выплатай. Дзед заняўся аднаўленнем маёнтка, што заняло некалькі гадоў і разам са сваёй жонкай з Шваньскіх (малодшая сястра другой пані Воўкавай), заняўся памнажэннем шляхты - яны мелі сямёра дзяцей, з якіх застаўся сын і тры дачкі. Рана аўдавеўшы, дзед даў добрую адукацыю ў Віленскай гімназіі і пансіянаце француза пана Генры свайму выключна таленавітаму сыну. Дачок аддаў за роўных яму абшарнікаў і памёр, як я памятаю, у 1856 годзе. Яго паважалі і любілі, хоць ён і "лічыў грошы". Дзед, уласна кажучы, як усе шчаслівыя людзі, не меў сваёй гісторыі.

Я меў вельмі рознабаковага, амаль што легендарнага дзеда (фактычна прадзеда) па матчынай лініі - пана Самуэля Ланеўскага-Воўка.

Нарадзіўся ён у 1768 г., быў нашчадкам вельмі заможнага кальвінісцкага роду на Віцебшчыне. Яго дзед, пан Міхал, займаў пасаду перадапошняга вялікага літоўскага пісара[11]. Яго бацька быў удаўцом, другі раз жанатым з Гружэўскай (са жмудскіх кальвіністаў). Калі адбыўся першы падзел 1772 г. і Кацярына II загадала ўсім значным землеўладальнікам прысягнуць ёй пісьмова або адмовіцца ад сваіх уладанняў, ганарлівы пан пайшоў па прыкладу Караля Радзівіла "Пане Каханку", які такім жа чынам пазбавіўся некалькіх мільёнаў дзесяцін зямлі. Ад першага шлюбу ён меў двух 20-гадовых сыноў[12], якім перадаў свае беларускія маёнткі, а сам з новай сям'ёй пераехаў у Наваградскі павет, дзе меў староства і незадоўга да другога падзелу, набыў яшчэ маёнтак Сеняр-

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[8] З 4-х маёнткаў, якія я з братам успадкаваў, а ні адзін не быў шляхецкай маёмасцю. Цыцін, маёнтак дзеда Мілеўскага, быў па-езуіцкім, Лугамовічы, сядзіба прадзеда Воўка - староствам, Лаздуны - радзівілаўшчынай, Геранёны - уласнасцю літоўскай артылерыі.

[9] Бог сказаў Адаму: "Beni sois" ("Дабраславёны ты", *фр.*), і па меркаванні гэтай асобы адсюль паходзіць прозвішча Бяніслаўскі.

[10] Апошняга, Войну, старога халасцяка, кузына майго бацькі, я сустрэў у Вільні пасля паўстання 1863 года. Ёсць паданне, што яго прапрадзед пры Сабескім пад Венай загадаў небяспечна атакаваць, і, калі загінула шмат людзей, сказаў: "Не вайна нараджае, а пані Войніна".

[11] Паважаны Ч. Янкоўскі памылкова называе яго вялікім лоўчым. Пасля катаклізму 1914-1920 гг. у мяне цудам захаваліся тры яго срэбраныя паўміскі з ініцыяламі: M.W.P.W.W.X.L. (Міхал Воўк пісар вялікі ВКЛ).

[12] Іх нашчадкі ад праваслаўных маці ўзялі прозвішча Ваўкоў. Два дэрпцкія сябры з такім прозвішчам і сын старэйшага з іх, які незадоўга да вайны быў сакратаром пасольства ў Парыжы, лічыліся маімі кузынамі.

жыцы. Хутка, перад другім падзелам памёр, пакінуўшы пасля сябе старэйшую дачку, баранесу Остэн-Сакен і 16-гадовага сына Самуэля. Яго яшчэ маладая ўдава праз 10 месяцаў выйшла замуж за ... гувернёра свайго сына. Пакрыўджаны гэтым мезальянсам, фанабэрысты паніч падаў на інтрыгана скаргу ў суд, абвінаваціўшы яго ў атручванні бацькі, але пазбавіўся падтрымкі апекуноў і збег з дому.

Неўзабаве пасля гэтага яго сваяк, пан маршалак Шукевіч - вялікая рыба ў Лідскім павеце, знаходзячыся ў Кёнігсбергу, зайшоў у цырк і пазнаў свайго маладога сваяка на арэне вярхом на кані - ён весела размахваў бізуном. Шукевіч зацягнуў яго ў сваю кватэру, добра "намыліў" яму галаву, апрануў, як трэба, і залічыў падхарунжым у войска Фрыдрыха Вялікага, які яшчэ знаходзіўся на піку славы. Калі Чатырохгадовы Сойм загадаў усім афіцэрам замежнай службы вярнуцца і далучыцца да нацыянальнай арміі, пан Самуэль так і зрабіў. Прыехаўшы ў госці да свайго дабрадзея Шукевіча, ён закахаўся ў яго выключна прыгожую (і дурную) дачку, маю прабабулю - раз-два - ажаніўся і толькі тады задумаўся, дзе знайсці сваё гняздо? У суседнім Ашмянскім павеце прадаваўся маёнтак Якуні - частка былога Трабскага староства, больш за 4 тысячы дзесяцін. З дапамогай цесця купіў яго, пасадзіў туды жонку і бадзяўся паміж Якунямі і Вільняй, дзе раіўся з гетманам Касакоўскім[13]. Калі падчас паўстання Касцюшкі паўстала і насельніцтва Вільні, пан Самуэль быў у начной варце гетмана на рагу вуліцы Дамініканскай і Шварцавага завулка, каля дома, які пазней стаў домам Даўкшы. Ён даведаўся, што прыехала жонка і, каб убачыць сваю юную прыгажуню, памяняўся чаргой. Тым часам прыйшлі паўстанцы і патрабавалі аддаць ім гетмана-здрадніка. Афіцэр, які не захацеў іх прапусціць, быў забіты на месцы[14].

Войска распусцілі, прадзед вярнуўся ў вёску і напладзіў тут дзяцей і куль грошай. Пасля апошняга падзелу, Кацярына II аддала сенатару Мардвінаву Дудскае староства, большую частку якога складала маёмасць Лугамовічы. Мардвінаў хутка прадаў маёмасць заможнаму абшарніку Гарадзенскай зямлі Корсаку (уладальніку маёнтка Жукаўшчына), сын якога пазней ажаніўся з унучкай пана Самуэля, маёй роднай цёткай. Ён хутка зразумеў, што не дасць сабе рады з аддаленым лясным маёнткам, і прадаў яго з добрым прыбыткам, хоць і вельмі танна, пану Ваўку. Воўк адразу пачаў высякаць амаль безвартасцевыя на той час лясы і заснаваў на іх месцы новыя фальваркі і вёскі, пабудаваў у Лугамовічах прасторны драўляны "палац" і ў 1802 г. аўдавеў пры нараджэнні трэцяй дачкі. Праз некалькі гадоў ажаніўся другі раз з суседняй паннай Ганнай Шваньскай, старэйшай сястрой маёй бабкі Мілеўскай. Яна засталася бяздзетнай[15].

У 1810 г. Самуэль ужо назапасіў дастаткова грошай, каб пасля эксдывізіі купіць былы радзівілаўскі маёнтак Лаздуны. У наступным годзе ён аддаў у расейскую армію свайго адзінага 17-гадовага сына Ігнацыя. У той час, асабліва дзякуючы куратару Віленскага ўніверсітэта і навуковай акругі Адаму Чартарыйскаму, Аляксандр I карыстаўся вялікай папулярнасцю ў Літве. У 1812 г., калі сын ваяваў супраць Напалеона пад Барадзіно, бацька, які застаўся ў Лугамовічах, дзякуючы сваёй знанай энергіі, тым жа Напалеонам быў прызначаны прэфектам павета і кіраваў тылам войска. У яго сядзібу прыйшлі трое вюртэмбержцаў-валацуг і пачалі шумець на кухні, дзед загадаў іх звязаць і адвесці ў бліжэйшую вайсковую каманду, пасля чаго ляпнуў за сабою дзвярыма. Тады адзін з марадзёраў паспеў стрэліць, на шчасце - праз дзверы. Але куля глыбока засела ў правую лапатку дзеда і паралізавала яму правае плячо. Праз некалькі гадоў, пад уласнай вагой, куля выйшла, і дзеду вярнулася свабода руху. На той момант ён ужо амаль што тры гады адседзеў на выбранай пасадзе старшынём павятовага суда і да канца жыцця застаўся "панам старшынём".

У канцы 1818 года Самуэль паслаў у Люнявіль, што ў Латарынгіі, чатырохконны воз з разумным фурманам і, вядома ж, разам з ім паслаў яшчэ і разумнага яўрэя. Ягоны сын Ігнацы служыў там у акупацыйным рускім войску і потым да канца жыцця атручваў сябе французскай літаратурай. Адразу пасля вяртання, ён ажаніўся з

[13] Шыман Марцін Касакоўскі (1741 -1794), палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, польны гетман літоўскі (1792-1793), апошні вялікі гетман літоўскі (1793-1794), удзельнік Барскай і Таргавіцкай канфедэрацый. У 1790 г. у чыне генерал-маёра паступіў у расійскае войска і ўдзельнічаў у баявых дзеяннях супраць Турцыі на Балканах. У 1792 г. расійскі корпус пад яго камандаваннем пачаў наступ на тэрыторыю Рэчы Паспалітай з боку Полацка. Ва ўзятай расійскімі войскамі ў студзені 1792 г. Вільні абвясціў сябе польным гетманам літоўскім. У 1793 г. стаў вялікім гетманам літоўскім. Падчас паўстання, 24 красавіка 1794 г. быў арыштаваны і 25 красавіка павешаны на Ратушнай плошчы ў Вільні. - *Л. Л.*

[14] Легенда цвердзіць, што, ужо каля шыбеніцы, гетман пазнаў аднаго са сваіх сыноў, які праходзіў міма, і паклікаў на дапамогу - той павярнуў галаву і праехаў, а бацька закрычаў: "Каб ты ашалеў". Неўзабаве пасля гэтага маладушны сын быў укушаны сабакам і памёр ад шаленства.

[15] Яе бацька, разам са сваім пратэктарам Пацам конна ездзілі на элекцыю Станіслава Аўгуста, а яго маці, якая паходзіла з Прусіі, была сваячка і выхаванка Пацаў. Яны абодва памерлі ва ўзросце 90 гадоў каля 1835 г. Пані Шваньская любіла расказваць, як перад кожнай "Асамблеяй" прыдворнаму цырульніку Пацаў быў патрэбны цэлы дзень, каб зрабіць фрызуру Яснавяльможнай Пані. У фрызуры меліся розныя аздобы, напрыклад мініяцюрныя караблі з ветразямі. Прычэсваў ён яшчэ дзве панны Пацоўны і потым, каб не знішчыць гэты мастацкі твор, усе трое спалі, седзячы на крэслах з жалезным прутам у руках, які быў патрэбны для палявання на вошай, бо вошы прагнулі свежай рысавай пудры.





паннай Ляскавічоўнай з Лідскага павета і пасяліўся ў фальварку свайго бацькі Цяцерніках, дзе ён даволі хутка аўдавеў, сам памёр у 1836 г., пакінуўшы трох дачок, якіх перавялі ў Лугамовічы пад крыло бабкі-мачахі, у якой таксама меліся адна ці дзве пляменніцы, сіроты з Мілеўскіх. Самуэль вельмі цешыўся з гэтага, бо здраджваў сваёй бяздетнай жонцы і таму быў рады, што яе акружае шматлікая дзятва.

Самуэль працягваў зарабляць грошы і, нягледзячы на сваё жыццё на шырокую нагу, набліжаўся да годнасці "свінні". Страціўшы надзею пакінуць сваё прозвішча нашчадкам, ён выдаў замуж сваю малодшую дачку за заможнага жыхара Навагрудскага павета, пана Адольфа Ваўка - хоць іншага герба і прыдомка (Карачэўскі) і вырашыў зрабіць спадчыннікам усіх сваіх маёнткаў іх адзінага сына Уладзіслава ў надзеі, што ён зможа перарабіць Карачэўскага ў Ланеўскага, што было няцяжка ў той час. Тры ўнучкі ягонага сына выходзілі замуж за не самых лепшых партнёраў - старэйшая Казіміра ў 1840 г., другая Вераніка (мая маці) у 1845 г. Яны атрымалі ў пасаг па 25 000 руб гатоўкай і адракліся ад спадчынных правоў[16].

Майму дзеду было ўжо за восемдзесят, калі ён ледзь не вырас з "свінні" ў "бегемота". Адзін з сыноў Платона Зубава, які жыў у Маскве, уступіў у мезальянс, яго сям'я пачала круціць носам, ён стаў капрызіць і паслаў "хадатая" ў Вільню, каб хутка прадаць свае два (Кацярынінскія) вялізныя ключы Юрбаг і Таўрогі, два вялікія гандлёвыя мястэчкі на Нёмане з некалькімі дзясяткамі фальваркаў на лепшай жмудскай зямлі. Галоўныя таўстабрухі былі ўжо насычаныя, застаўся толькі адзін "пан старшыня". Яго ўгаварыла любімая дачка (яна другі раз была замужам за Мілашэўскім), якая ўжо бачыла свайго адзінага сына Уладка "шахін шахам" сярод літоўскай моладзі.

Самуэль купіў усё за паўмільёна рублёў, з якіх 400000 даў гатоўкай. Дакументы былі ўжо аформлены, грошы выплачаны, калі пра ўсё стала вядома яго суседу з-за Нёмана, самаму сардэчнаму сябру і "кіту" такога ж калібру на Уселюбскім экс-старостве (600 хат), мікалаеўскаму генерал-аншэфу, графу О'Рурку. Затаіўшы дыханне, граф махнуў у Вільню да генерал-губернатара Міркавіча і сказаў яму, што пераход у польскія рукі двух памежных мястэчкаў за трыццаць кіламетраў ад мяжы ўяўляе вялікую небяспеку для расійскай дзяржавы і, калі сам Міркавіч не звернецца да імператара Мікалая каб спыніць куплю-прадажу, дык ён, О'Рурк, паклапоціцца аб гэтым сам. Міркавіч пачаў хваляваცца за сваю пасаду і неўзабаве Мікалай скасаваў здзелку, прыняў усю маёмасць у скарб і загадаў вярнуць заплачаныя сумы Ваўку з выдаткамі і працэнтамі (у наш час, ці не глупства гэта?), Юрбарг і Таўрогі зрабіў дзяржаўнымі і аддаў маёнткі свайму фаварыту князю Васільчыкаву, унук якога (мой калега па Дзярждуме) валодаў імі яшчэ ў 1914 годзе.

Пан Самуэль неўзабаве знайшоў магчымасць "адплаціць дабром", толькі ўжо іншаму суперніку. Памёр Ксаверый Пуслоўскі, пакінуўшы чатырох сыноў, трох у краі, а чацвёртага ў эміграцыі. Яму ўдалося пазбегнуць канфіскацыі (гэта дазваляла расійскае заканадаўства для набытых маёнткаў), і ён падзяліў сваю велізарную маёмасць паміж трыма сынамі, вусна загадаўшы ім не забываць свайго брата-эмігранта, што яны добрасумленна і выканалі. У меркаваную спадчыну эмігранта, якую трэба было хутка прадаць, уваходзілі былыя маёнткі літоўскай артылерыі, якія былі падараваныя Безбародку і прададзеныя ім Пуслоўскім, а менавіта Ліпнішкі, якія набыў пан Аляксандр Вольскі з Навагрудскага і Геранёны, былая рэзідэнцыя Гаштольда[17], першага мужа Барбары Радзівілаўны. Гэту маёмасць жадаў купіць пан Казімір Умястоўскі, брат і спадчыннік "старасты Вывяндлінскага", пра якога Мараўскі шмат піша ў сваіх успамінах. Пуслоўскія жадалі акрамя крэдытных грошай банка (у той час дзяржаўны банк ужо выдаваў доўгатэрміновыя пазыкі па 70 рублёў за 1 сялянскую душу) 50 000 рублёў даплаты. Як толькі пан Самуэль даведаўся пра гэта, адразу паслаў па майго бацьку: "Ляці ў Вільню і купляй Геранёны". "Для дзядзькі?" "Не, я занадта стары - купі для сябе і Вэрці". "У мяне няма грошай". "Дык я дам, каб толькі Умястоўскі не панюхаў Геранёнаў ".

Бацька пералічыў мяшкі з грашыма, за ноч прыехаў у Вільню і разам з маёй маці купіў Геранёны. Я тады ўжо нарадзіўся. Адразу заклалі геранёнскі палац, вельмі шчасліва выбраны маім бацькам насупраць руін замка Гаштольдаў.

Неўзабаве ўсе дынастычныя праекты пана Самуэля зруйнаваліся. Уладак Воўк служыў у гусарах, якія стаялі ў Навагрудку. На нейкім афіцэрскім сходзе ён ударыў калегу, пасля чаго хутка адбылася дуэль на пісталетах, і стрэл абражанага забіў Уладка.

Натуральна, прадзеду трэба было змяніць тастамант, бо інакш па расійскіх законах амаль увесь яго фундуш атрымалі б тры ўнучкі - дочкі сына. Старэйшая ўнучка, пані Дмахоўская, атрымала Якуні з вялікай даплатай, малодшая, пані Корсакава - Лаздуны з малой даплатай, мая маці - Лугамовічы з выплатай на карысць абедзвюх сясцёр і з побытам тут бабулі, пані Мілашэўскай. Сянержыцы ў Навагрудкім павеце і капітал (прыкладна 400 тыс. руб.) дастаўся ўнучкам па двух старэйшых дочках - паням Чыжовай і Жабінай. Іншая маёмасць адышла як падзяка розным слугам, суседзям, на дабрачынныя мэты і г. д. Памёр дзед у 1851 г. ва ўзросце 84 гады.

[16] Але гэтыя грошы нешта значылі, калі ўлічваць тагачасную каштоўнасць грошай і звычай шкадаваць пасаг дочкам для дабра дынастыі. Чатыры панны Нясялоўскія, кармазынкі (пазней Хортынгава, Кашыцава і Рэйтанава), якія каля 1850 г. кружылі галавы віленскай моладзі, мелі па 100 000 злотых (15 000 руб). Калі на маёй памяці пачалі казаць "не шэсць злотых і дваццаць грошаў", а 1 рубель, панны страшэнна патаннелі на шлюбнай біржы.

[17] Першы раз Гёранёны згадваюцца ў 1386 годзе як "Гаштольдэндорф". - *Л. Л.*





Гэтаму адважнаму помніку сянкевічаўскіх часоў, Адам Міцкевіч у сваім "Пане Тадэвушу" прысвяціў восем радкоў, у якіх для ўсіх чытачоў гэтага твора зрабіў сапраўдную пачвару з нябожчыка пана Самуэля[18]. [...]

Бацька Міцкевіча не меў сялян і таму не разумеў, што Воўк, які валодаў не менш як 4000 сялян рознага полу і ўзросту, вольна ці міжвольна павінен быў кіраваць імі. Яны былі не толькі яго працоўным інвентаром, якім ён, як добры гаспадар, павінен быў добра карыстацца і клапаціцца пра яго так, як сумленны конюх корміць і чысціць сваіх коней, але і паганяе іх пугай. Яму была даверана значная частка дзяржаўнай улады над сялянамі. У адносінах да іх на ўсёй сваёй тэрыторыі Воўк адказваў за падаткі, быў паліцыяй, цывільным і крымінальным судом і, нарэшце, павінен быў па ўласным выбары забяспечваць рэкрутаў для войска.

Усё гэта патрабавала выкарыстоўваць сваю ўладу, а ўлада ў той час рэалізоўвалася толькі ў форме ... лупцоўкі. Секлі ўсе і паўсюдна. Секлі па ўсёй дзяржаве. Бацькі ад нараджэння секлі сваіх дзяцей. Яны загадвалі ім прачытаць гімн да розгі і пацалаваць яе пасля пакарання. Секлі ў школах, і сам вялікі Адам, дома ці ў школе, дзесяткі ці сотні разоў атрымліваў у скуру. Секлі ў паліцыі, у судзе, у войску і г. д. І пан Самуэль Воўк таксама сек шмат і пашляхецкі. Але сек ён не толькі дзеля сваёй карысці, але і на карысць селяніна, як бесстаронна прызнае Чэслаў Янкоўскі.

Селянін нядбайна заараў або схаваў у сваім кажуху жменю зерня: 10 бізуноў без дадатку, напіўся і страціў мяшок збожжа, які вёз на продаж - 20 бізуноў без дадатку. Той жа селянін заснуў на "начлезе" і дазволіў скрасці ўласнага каня: 25 бізуноў з падараваннем дармавога каня ад маёнтка. Люлькай выпадкова спаліў сваю сядзібу: 100 бізуноў і новыя будынкі, і г. д. Для майго бацькі і асабліва для мяне з гэтага вырасла сапраўдная эканамічная катастрофа, калі былыя падданыя ў Лаздунах і Лугамовічах былі нашмат лепш забяспечаны зямлёй у параўнанні з суседнімі гмінамі і так старанна гаспадарылі, што мне ўвесь час даводзілася змагацца з нястачай рабочых рук - улетку для ўборкі ўраджаю прасіць і потым карміць да 100 жаўнераў ці адпраўляць дзесяткі фурманак, каб прывезці людзей з суседніх гмін і г. д. Не буду паўтараць лацінскае "qui bene amat, bene castigat" (лац., "хто моцна любіць, той карае" - *Л. Л.*), бо Воўк, напэўна, не любіў сялян, але і ў сябе, і ў таго ж селяніна, любіў парадак і працу.

Чэслаў Янкоўскі, цытуючы вершы Міцкевіча пра дзеда, цытуе таксама яшчэ адну паэму, якую ён знайшоў у пустых пакоях у Лугамовічах. Напэўна, яна і цяпер вісіць яшчэ недзе ў Лаздунах, калі яе не пашкодзілі "пераможныя шаблі" 9-й польскай дывізіі падчас гадавога побыту. Гэта аздоблены малюнкамі вінаграду і персікаў, цудоўна, каліграфічна напісаны акраверш старога сябра дзеда Самуэля - пана Адама Рымашэўскага, дзедзіча маёнтка Бабінск, мужа пані Евы з Гарабурдаў[19], дзедзічкі Ятатловічаў, што мяжуюць з Лаздунамі. У паэме гэтага другога Адама, Міцкевічавы "злыдзень" прадстаўляецца ягнём божым, беззаганным голубам, супернікам калі не арханёла Гаўрыіла, дык прынамсі, св. Францішка Асізскага ці Вінцэнта дэ Поля[20].

Каму ж тут верыць? Я гатовы вырашыць гэтую супярэчнасць шляхам кампрамісу і прызнаць, што пан Самуэль Воўк быў чалавекам свайго часу і асяроддзя, выкарыстоўваў дадзеную яму ўладу сродкамі, адпаведнымі свайму часу і свайму асяроддзю і, як і лепшыя са смяротных, меў недахопы, адпаведныя яго вартасцям: дзейсны, гаспадарлівы, энергічны і ў той жа час патрабавальны, суровы і запальчывы. Такая ўзаемасувязь пераваг і недахопаў з'ўляецца законам прыроды, якому цалкам падпарадкоўваўся сам Адам Міцкевіч. [...]

Што да маіх бацькоў, дык я ўжо казаў, што мой бацька, пан Аскар, скончыў пансіён пана Генры і віленскую гімназію з залатым медалём. Маючы шасцярых дзяцей і добры, але не вялікі маёнтак, дзед Гіпаліт адправіў яго ў пошуках кар'еры ў Пецярбург. Няведанне мовы (у Вільні па-ранейшаму навучанне вялося на польскай мове) і адсутнасць дзейснай пратэкцыі адбілі яму ахвоту да кар'еры, і праз паўгода бацька вярнуўся ў Вільню. Сябар бацькі, пан Сідаровіч, першы адвакат у нашым краі, узяў яго ў памочнікі. Умелы, дасціпны, з добрым веданнем французскай мовы, якая ў той час панавала ў "бамондзе", бацька меў поспех у грамадстве, каралевамі якога тады была "камтэса" (графіня) Лапацінская і княжна Вітгенштэйн[21] (у дзявоцтве Баратынская). Абедзве жылі

[18] *Bili sie na zajezdzie ryskim z Moskalami,*
*Ktorych przywiodl jeneral ruski Wojnilowicz*
*I lotr, przyjaciel jego, pan Wolk z Lugomowicz;*
*Pamiatacie, jak Wolka wzielismy w niewole,*
*Jak chcielismy go wieszac na belce w stodole,*
*Iz byl tyran dla chlopstwa, a sluga Moskali;*
*Ale sie chlopi glupi nad nim zlitowali!*

У перакладзе Браніслава Тарашкевіча:
*…. змагаліся там з маскалямі,*
*каторых расейскі прывёў генарал Вайніловіч*
*і, злодзей, прыяцель ягоны пан Воўк з Лугамовіч.*
*Ці помніце, як мы забралі Ваўка да няволі*
*і як ужо вешаць хацелі на бэльцы ў стадолі,*
*што быў ён слугой маскалём, мужыкам жа тыранам;*
*сяляне ж, дурныя, ўзялі й злітаваліс над панам!* - *Л.Л.*

[19] Пані Ева была прапраўнучкай Гарабурды па прамой лініі, пасла Стэфана Баторыя пры цары Івана IV, якому Аляксей Талстой даручыў вельмі прыгожую ролю ў сваёй знакамітай драме "Смерць Івана Жахлівага".

[20] Вінцэнт дэ Поль (1581-1660) - французскі каталіцкі святар, пакутнік. - *Л. Л.*

[21] Праз 70 гадоў у Лазане, дзе жыла ўжо 100-гадовая княжна, яна распавядала мне пра майго бацьку як пра найлепшага свайго танцора. Калі-нікалі яна ўжо пачынала трызніць, і тады ў маёй асобе бачыла майго бацьку.





пад Вільняй, першая ў Кайранах, другая ў славутых з часоў павешанага кс.-біскупа Масальскага Верках, дзе часта ладзіліся балі і аматарскія тэатры. Адначасова мой бацька "цешыў музы" - напісаў лібрэта да адной з опер свайго добрага знаёмага кампазітара Манюшкі[22].

Амаль адначасова са скасаваннем уніі, Мікалай I па настойлівай просьбе маршалкаў Кіеўскай і Падольскай губерняў, "найміласцівейша" скасаваў Літоўскі статут (акрамя Чарнігаўскай і Палтаўскай губерняў) і замяніў яго 10-м томам Зводу законаў з заменай вуснай і адкрытай працэдуры на пісьмовую і таемную. Кар'ера бацькі адразу зруйнавалася. Засталася толькі традыцыйная шляхецкая маці-зямля. Дзядзька бацькі і мой прадзед па маці, які ўжо адчуваў цяжар ўзросту, да таго часу выкупіў з арэнды Лаздуны і прапанаваў бацьку ў арэнду суседнія Якуні, дзе ён і асеў вясной 1844 года. У наступным 1845 годзе ён ажаніўся з Веранікай - малодшай унучкай свайго дзедзіча і дзядзькі, і яны пачалі кожны год нараджаць дзяцей.

У 1849 годзе амбіцыйны віленскі жандар "высмактаў з пальца" вялізную палітычную "змову", у якую ўцягнуў усе навуковыя кадры, якія засталіся пасля Віленскага ўніверсітэта і Медыцынскай акадэміі, а таксама тых, хто выклікаў падазрэнне сваёй адукацыяй, г. зн. меў схільнасць да рэзанёрства[23].

Мой бацька трапіў у турму і прасядзеў там амаль што два месяцы. Тым часам з Пецярбурга быў прысланы шляхетны генерал-маёр Назімаў[24] (будучы віленскі генерал-губернатар), які раскрыў махінацыю і без допыту вызваліў усіх вязняў, у тым ліку і майго бацьку. У гэтай турме ў яго пачаліся пакуты, якія пазней, з-за праблем пасля смерці прадзеда Ваўка (калі па просьбе свайго швагра Корсака бацька ў крэдыт адкупіў у яго маёнтак Лаздуны), развіліся да такой ступені, што ён перанёс некалькі моцных кровазліццяў з горла.

Перапалоханая маці склікала ўвесь віленскі арэапаг эскулапаў, якія аднадушна вырашылі, што гэта не можа быць ні чым іншым, як толькі сухотамі ў апошняй ступені, і параілі маці хутчэй адвезці мужа ў Ніцу - няхай небарака хоць памрэ пад прыгожым небам. Бацькі спыніліся ў Берліне, дзе знакаміты ў той час прафесар Шонлайн дасканала агледзеўшы хворага, сказаў яму, што хацеў бы лёгкія бацькі захаваць у спірце бо такіх магутных і здаровых ён яшчэ не сустракаў. Але з-за шматгадовых пакутаў печань так моцна набракла, што ціснула на лёгкія, якія ўяўляюць з сябе губку - адсюль і кровазліццё. Ён загадаў нам хутчэй ехаць альбо ў Карлавы Вары да крыніцы з лекавай вадой, альбо ў Вішы да Гранд-Грыль. Мае бацькі выбралі апошняе, бо жадалі пазнаёміцца з Францыяй і адбылося гэта неўзабаве пасля перавароту Напалеона III, 2 снежня 1851 года. Правёўшы некаторы час у Парыжы, восенню 1852 г. яны пасяліліся ўжо ў дабудаваны новы "палац" у Геранёнах, адкуль і пачынаюцца мае дзіцячыя ўспаміны.

Іх вяртанне прывяло да таго, што эскулапы на працягу некалькіх гадоў адпраўлялі ўсіх хворых у Вішы як да крыніцы цудаў (Лурд яшчэ не быў вядомы), адкуль некаторыя вярталіся нібыта здаровымі.

З гэтага нарысу майго паходжання, як па адной, так і па другой лініі, чытач можа здагадацца, што я не мог глядзець на гісторыю і людзей ні праз акуляры "рэфарматара чалавецтва", якога распірае жоўць і зайздрасць, ні праз акуляры адмарожанага "зубра", перакананага (а з такім перакананнем вырасла амаль што ўсё маё пакаленне), што яму дастаткова добрых манер і элегантнай знешнасці, а адукацыя патрэбна толькі беднякам ці ідыётам. Мне ад прыроды наканавана было стаць "цэнтрыстам" і быць асуджаным на, як сёння кажуць, буржуазныя погляды.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[22] Цудоўная пісьменніка і даследчыца гісторыі роднага краю з Іўя Алена Смалянічэнка, пісала:
*"Нядаўна я прачытала кнігу Францішка Багушэвіча "Творы" (Мінск: мастацкая літаратура, 1991). Адзін з раздзелаў кнігі змяшчае перапіску Францішка Багушэвіча з Янам Карловічам (1836-1903) […]. Ян Карловіч прапанаваў Францішку Багушэвічу стварыць слоўнік беларускай мовы. З пісьма Яну Карловічу (1891, Вільня): "Ці праўда, што граф на Геранёнах ахвяраваў на слоўнік 10 тысяч? Калі гэта праўда, дык ужо сапраўды няма нічога на свеце немагчымага" (Граф на Геранёнах - так Ф. Багушэвіч называе ўладальніка геранёнскага маёнтка Аскара Корвін-Мілеўскага). У іншых пісьмах да Яна Карловіча гаворка ідзе пра рукапісы графа як аўтара шэрагу лібрэта да опер Станіслава Манюшкі […] : "Ідэал, або Новыя каштоўнасці", "Карманьёл, або Французы любяць жартаваць", "Новы Дон Кіхот, або Сто шаленстваў", "Латарэя" (1843). Пісаў ён і кнігі. У літаратурнай дзейнасці Вераніка Воўк-Ланеўская дапамагала мужу. Лібрэта да опер С. Манюшкі напісаны ў стылі "Парыжскай музы". Яго асоба і творчасць былі папулярнымі сярод віленскага асяроддзя, а супрацоўніцтва з С. Манюшкам было добраахвотнае і бескарыснае. У 1858 годзе ў Парыжы была выдадзена брашура А. Корвін-Мілеўскага "Каментары да сялянскага пытання на Літве", дзе была прадстаўлена ўмерана кансерватыўная праграма, яго палітычныя погляды". - Л. Л.*

[23] Гэтую змрочную гісторыю больш падрабязна апісаў у канцы мінулага стагоддзя другі жандар (верагодна, звольнены са службы) у кніжцы "Блакітны мундзір" (маецца на ўвазе наступная кніга: Ломачевский А. И. Из воспоминаний жандарма 30 и 40 годов [в 2 ч.]. СПб.: тип. В. Грацианского, 1880. Ч. 1: Виленская драма с прологом; Ч. 2: Голубой мундир. - *Л. Л.*)

[24] Назімаў Уладзімір Іванавіч (1802-1874), былы апякун Маскоўскай навучальнай акругі (1849-1855). У 1855-1863 гг. - віленскі генерал-губернатар. - *Л. Л.*

*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.)*

### *Раздзел II*

### *Дзіцячыя  гады*

Звычайна дзіцячая памяць праходзіць праз дзве розныя фазы: вадкую фазу, калі ўражанні ствараюцца і губляюцца амаль імгнення, і фазу зацвярдзення, калі гэтыя ўражанні ўжо ўгравіраваныя ў памяць, нібы на медную пласціну і застаюцца там назаўсёды. Гэтак для мяне раптоўна сталася ў сакавіку 1855 года.

Яшчэ і сёння бачу, як мы, чацвёра дзяцей, гуляем у прасторным пакоі бацькоўскай хаты ў Геранёнах пад наглядам маладой і сур'ёзнай маці. За вокнамі праязджае фурман, і праз некалькі хвілін мой бацька, тады гадоў трыццаці, жвавы і стройны чалавек, улятае ў пакой, скача, як маладое жарабя, размахвае разгорнутай газетай і крычаць: "Вэрцю, Вэрцю, Мікалая д'яблы забралі!" Такая адбылася ў нас "паніхіда" па Яго Імператарскай Вялікасці Мікалаю I Паўлавічу, усерасійскім самадзержцы і польскім каралі. Дзеці атачаюць бацькоў і просяць тлумачэння, а потым у маю выключна польскую і каталіцкую галаву ўваходзіць думка, што акрамя нас, суседзяў, сям'і і службы (хто тады думаў пра "беларускую нацыянальную меншасць") ёсць нядобрыя людзі, якія называюцца рускімі з нейкім паскудным Мікалаем на чале, які нас прыгнятае.

Падзея была настолькі важнай, што некалькі дзён служыла галоўнай тэмай размовы маіх бацькоў за сталом. Вырашылі, што на зіму мы пераедзем у Вільню, тады ўжо свайго роду сталіцу, і таму бацька туды хутка паехаў здымаць прыдатную кватэру.

Увосень мы пераехалі ў Вільню ў дом княгіні Пузыні, а неўзабаве і да нейкага яўрэя. Гэта быў год шляхецкіх выбараў, якія адбываліся кожныя тры гады. На іх выбіраліся губернскія і павятовыя маршалкі, члены суда і школьныя куратары. Гэткую пасаду займаў мой бацька. Па звычаі, багацейшыя памешчыкі частавалі шматлікую шляхту на выключна мужчынскіх вечарах. Звычайна гэта адбывалася ў адным з трох галоўных віленскіх "гатэляў", а дакладней, як тады казалі, заезджых дамах, бо туды прыязджалі з усімі сваімі рэчамі, пасцелямі, самаварамі і г. д.

Я не ведаю, чаму, магчыма, з жадання паказаць, якім прыгожым і хуткаспелым хлопчыкам я тады быў, мой бацька паслаў аднаго са сваіх маладых сяброў па мяне і правёў мяне па некалькіх салонах, дзе праходзіў збор. Гэты першы кантакт з суграмадзянамі зрабіў на мяне вельмі непрыемнае ўражанне, магчыма, таму, што я быў дзіцём з занадта вытанчаным выхаваннем - вярнуўшыся да маці, я расплакаўся. Шум, выпіўка, бутэлькі шампанскага на ўсіх сталах, лужыны віна на падлогах, гучныя падвышаныя галасы, смех, нібы ржанне коней, размашыстыя рухі - усё гэта толькі гарнітурамі адрознівалася ад шуму сялян каля карчмы ў Геранёнах, міма якой мы праходзілі пасля вячэрні ў святочныя дні. Гэта былі апошнія парэшткі старых шляхецкіх звычаяў, сведкам якіх я быў. Бо, калі праз некалькі гадоў я падлеткам вярнуўся на радзіму,  каласальны псіхічнае і маральнае ўзрушэнне, выкліканае вызваленнем сялян і адменай паншчыны, ужо адбілася на ўсім укладзе і жыцці нашай літоўскай шляхты.

Ужо некалькі месяцаў у нас новы генерал-губернатар - усемагутны сатрап, генерал-ад'ютант Назімаў. Ён быў чалавекам выключна ўзнёслых і высакародных пачуццяў, якія хоць і ў гамеапатычнай прапорцыі ў параўнанні з дзікунствам або маральнай гніллю, можна было бачыць у расійскім грамадстве ажно да рэвалюцыі 1917 года. Гэтым прызначэннем замест суровага (хоць і шляхетнага) генерала Бібікава, мы абавязаны прыроднай помслівасці Аляксандра II, якую ён атрымаў у спадчыну ад бацькі і дзеда і пакінуў у спадчыну сыну і ўнуку. Справа ў тым, што калі ў 1849 годзе ў Вільню быў прызначаны фаварыт Мікалая I Бібікаў (брат кіеўскага генерал-губернатара, ён пакінуў па сабе дрэнную памяць), Аляксандр II, які меў ужо ў 32 гады, спадчыннік трона і старшыня Дзяржаўнага савета, пажадаў, каб Бібікаў узяў з сабой у Вільню добрасумленнага гвардзейца, таварыша Аляксандравых гулянак, які з-за розных свавольстваў вымушаны быў пакінуць полк. Але добрасумленны жаўнер Бібікаў адмовіўся, бо лічыў, што едзе ў выключна чужую ў нацыянальным сэнсе краіну (у чым тады не сумняваўся ніводны рускі) і горад, дзе сярод тысяч мясцовых чыноўнікаў будзе толькі які тузін расейцаў - таму ён абавязаны,

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien  (1855-1925). Poznan, 1930.*

каб гэтая жменька выключна добра прадстаўляла расейскае грамадства, а вядомая асоба - сябар вялікага князя, можа ўсіх скампраметаваць.

Нецярплівы вялікі князь сказаў: "Ваша правасхадзіцельства, напэўна, забывае, што вас просіць спадчыннік пасаду?" На што горды генерал адказаў: "Я спадзяюся, што не перажыву свайго манарха, які маладзейшы за мяне, але пакуль я служу, я буду служыць пануючаму імператару, а не таму, хто магчыма потым будзе замест яго ". Аляксандр ІІ не дараваў гэтага, і першыя два акты, якія ён падпісаў як імператар былі: адзін - пра нейкія змены мундзіраў гвардыі, за што атрымаў мянушку "Аляксандр - кравец", другі - пра адстаўку Бібікава.

Як я раскажу пазней, гэтая змена не была добрай для нас, але яна была вельмі карыснай для маіх бацькоў. Справа ў тым, што пасля апошніх няшчасных родаў (дзіця пражыло некалькі гадзін) стан здароўя маці пастаянна пагаршаўся, і скончылася гэта поўнай стратай голасу[25]. Бацька ажно з Магілёўскай губерні хутка прывёз далёкую сваячку па кальвінах, панну Камілу Мацкевіч, 20-гадовую вельмі прыгожую і абаяльную жанчыну, якая павінна была стаць кампаньёнкай маці. На працягу 7 гадоў, пакуль да маёй маці не вярнуўся голас, яна была для яе неацэнным таварышам, а для нас стала старэйшай сястрой. Я і сёння не магу ўспамінаць яе без смутку.

Бацька вырашыў вывезці маці за мяжу "да тых, хто ведае", як мне пазней сказаў адзін з нашых лекараў, але трэба было атрымаць пашпарт, а гэта было вельмі складана. Крымская вайна ўжо скончылася, але Парыжскі кангрэс яшчэ засядаў. За кожны замежны пашпарт трэба было не толькі заплаціць тысячу рублёў срэбрам, але і атрымаць адмысловы дазвол ад самога імператара. Годны Назімаў, які яшчэ з часоў "канспірацыі" 1849 года меў асаблівую пашану да майго бацькі, дазволіў нам гэтыя пашпарты. Бацькі выехалі ў лютым з маім старэйшым братам Ігнацыем, да якога мая маці ад яго нараджэння была надзвычай прывязаная, а маю сястру Мэры, мяне і майго малодшага брата Аскара адправілі ў Геранёны з паннай Келер у якасці настаўніцы, у апошні момант Камілка Мацкевічаўна паехала з намі як віцэ-маці.

Каля Вялікадня мой малодшы брат Аскар захварэў і маланкава памёр. Нашу пабожную і экзальтаваную маці вельмі глыбока закранула гэтая страта, яна лічыла, што мацярынскі абавязак не дазваляў ёй разлучацца са сваімі маленькімі дзецьмі. Але яна сама пакутавала ад цяжкай і працяглай хваробы і не магла вярнуцца да нас. Таму папрасіла бацьку прывесці нас да яе. Панну Келер звольнілі, і нас суправаджала панна Каміла. З начоўкамі, на сваіх конях, мы паехалі ў Вільню і Коўню, потым дабраліся да Вержбалава, дзе нас чакаў бацька. У Сталупянах пераначавалі і на другі дзень дабраліся да Круляўца. Тут толькі пачыналася сталая чыгуначнае сувязь з астатнім сусветам. Здаецца, на адным цягніку мы дабраліся да Бад-Эмса, таго самага, у якім праз 58 гадоў мяне заспела сусветная вайна і дзе мая маці тады праходзіла лячэнне, рэкамендаванае берлінскім др. Шонлайнам. Але тут яна не адчула ні найменшага паляпшэння, і таму мы паехалі ў Парыж, дзе мой бацька, па парадзе доктара Галянзоўскага, які на той час карыстаўся выключным уплывам сярод польскіх эмігрантаў, вырашыў даверыць маю маці апецы сусветнавядомага доктара Трусо. Гэты доктар сцвярджаў, як аказалася слушна, што ніякай спецыфічнай хваробы органаў дыхання няма і страта голасу з'яўляецца выключна вынікам малакроўя і нервовай слабасці і таму, як толькі агульны стан палепшыцца, голас вернецца. Аказалася, геніяльны француз меў рацыю, але лекавацца трэба было яшчэ шмат часу. Спачатку мы паехалі на ўзбярэжжа, у вядомы пазней на ўвесь свет Трувіль, на той час яшчэ невялікі горад. Увосень вярнуліся ў Парыж, і бацька, пасяліўшы нас у даволі прасторнай кватэры на Елісейскіх палях (за якую, цалкам мэбляваную, плаціў вялізную суму ў 350 франкаў у месяц) і, як таго ўжо патрабаваў наш узрост, знайшоў нам настаўніка містэра Рычэра, а для маёй сястры - настаўніцу абсалютна класічнага тыпу, панну Чарын. Пасля чаго сам вярнуўся дахаты, дзе яму трэба было наглядаць за 20 фальваркамі, раскіданымі ў трох частках павета, а таксама вырашыць праблему са спадчынай пасля смерці свайго бацькі і цёткі Воўкавай, яны абодва памерлі ў 1856 годзе. Да таго ж, нарэшце, паўставала вялікае пытанне сялянскай рэформы. Тыя 1856 і 1857 гады, на працягу якіх штодзень развівалася мая дзіцячая галава, да сённяшняга дня пакінулі ўва мне яркія і самыя прыемныя ўспаміны. Усё вакол мяне было нечаканым. Пад мудрым кіраўніцтвам вялікага Трусо да маці вярнуўся не толькі голас, але і моц. Панна Каміла аказалася анёлам дабрыні, клопату і добрага гумару, а пан Рычэр як па характары, так і па выкладанні быў узорным настаўнікам. Ён і панна Чарын хутка прывілі мне прынцыпы грунтоўнасці і пачуцця абавязку, выгадавалі ў мяне амбіцыі ўсё рабіць добра, г. зн. прынцыпы, якія тады былі агульнай рысай французскага адукаванага класа.

Маці мела ў Парыжы сваяка, пана Уладзіслава Лясковіча, стрыечнага брата яе маці, с. п. Воўкавай. Эмігрант з 1830 г., яшчэ ў росквіце сіл, бо далучыўся да паўстання яшчэ студэнтам першага курса Віленскага ўніверсітэта, адукаваны і вельмі набожны, ён меў характар падобны да рымляніна-хрысціяніна. Карыстаўся бязмежнай павагай сярод тагачаснай эміграцыі. Самотны з 26 гадоў, ён палюбіў нашу сям'ю як сваю родную і хутка, дзякуючы панне Каміле, якая ўсім падабалася, стварыў вакол маёй не вельмі рухлівай з-за хваробы і нямой маці, цэлае кола

[25] Алена Смалянічэнка, пісала, што людзі лічылі "… што *"страшная пані Вераніка" (памерла ў 1891 годзе) магла ад злосці не размаўляць цэлы год. Яе муж Аскар не карыстаўся спачуваннем сярод мясцовага насельніцтва, "вызначаўся тым, што дазваляў сваёй жонцы сябе загрызці". Нягледзячы на частыя спрэчкі ў сям'і, яна паспяхова займалася гаспадарчымі справамі". - Л. Л.*

блізкіх і цёплых сяброў. Увогуле, у мяне засталіся самыя лепшыя ўспаміны пра гэтых ветэранаў лістападаўскага паўстання (паўстання 1831 г. - *Л. Л.*), пра якіх пасля вайны 1870 г. і Парыжскай камуны, мой патрон і сябар, пан Леан Клямент, [...] сказаў наступныя словы: "Il ne sont pas forts, oh que non, mais quelles braves gens!" [26] (“Яны не героі, не, але якія яны добрыя людзі!”, фр. - *Л. Л.*).

Акрамя Лясковіча нашымі частымі гасцямі былі пан маёр Буката (блізкі сусед дзеда Мілеўскага па ягоным Цыціне) і паны Грынявецкія - ён, былы афіцэр літоўскага корпуса, ужо не вельмі малады, але заўсёды вясёлы і дасціпны, дзякуючы пратэкцыі Ксаверыя Браніцкага меў добрую працу бухгалтарам і касірам пры двары князя Напалеона, стрыечнага брата Напалеона III, дзякуючы чаму яго сям'я займала ўтульныя апартаменты ў палацы Пале-Раяль. У 1831 г. Грынявецкая засталася з першым сынам у сваім фальварачку на Гарадзеншчыне, а потым, з жаночай упартасцю, неяк дабралася да мужа ў Францыю, дзе ціха, сціпла і мужна правяла з ім у галечы 20 гадоў і нарадзіла яму тут яшчэ сына і дачку. За 25 гадоў за мяжой, нібы закансервавалася духам. Літоўская шляхцянка, яна ледзьве магла ламана размаўляць па-французску з неапісальным акцэнтам, але была пры гэтым бясконца добрай. Грынявецкія мелі трох дзяцей: Людвік, пазнейшы муж малодшай дачкі Адама Міцкевіча (Хелены), пачынаў інжынерам-чыгуначнікам, другі сын Вітольд тады вучыўся ў цэнтральнай школе на архітэктурным аддзяленні, малодшая дачка Хелена, гадоў 18-ці, непрыгожая, але чароўная, адразу як родную сястру палюбіла нашу панну Камілу і называла нашу маці, як і мы - "мамуняй". Яна вельмі часта начавала з Камілкай у нас. Сябравалі мы і з сям'ёй гісторыка Караля Сянкевіча, у якой было трое дарослых сыноў. На ўсіх "нядзелях" маёй маці прысутнічалі дзве яшчэ незамужнія дачкі Адама Міцкевіча, якія нядаўна засталіся без бацькі сіротамі, у асноўным імі апекавалася спадарыня Ляона Фаўхер з дома Валоўскіх (сястра вядомага эканаміста), удава міністра асветы Другой рэспублікі. Часта наведваў нашу маці, якую вельмі ўпадабаў, стары генерал Дэмбінскі - герой 1831 г., а потым і Венгерскага паўстання 1848 г.

Усе нашы знаёмыя належалі да лагера князя Адама Чартарыйскага, які захаваў свае галіцыйскія маёнткі і трымаў як бы сапраўдны каралеўскі двор у сваім гістарычным палацы - гатэлі Ламбер на востраве Сен-Луі, вельмі ўдала набытым на самым пачатку эміграцыі. Французскі ўрад абыходзіўся з ім як з кіраўніком правячай партыі. Асобаў з нашага краю, якія яшчэ толькі павінны былі ў апошняе дзесяцігоддзе Другой імперыі ўвайсці ў моц, у той час у Парыжы амаль што не было.

На пачатку лета маці з усім сваім гняздом пасялілася ў Д'епе, бо галоўным элементамі яе лячэння было марское купанне і як можна больш працяглае знаходжанне ля мора. Ужо тады нашы бацькі вырашылі выхоўваць нас у Францыі і па парадзе доктара Галянзоўскага[27] пасля вакацый памясцілі нас у першакласным пансіёне пана Кузіна на вуліцы дзю Рашэ, на мяжы паміж уласна горадам і прадмесцем "Бацінёл", дзе была вельмі вялікая польская школа (250 вучняў)[28].

Перад ад'ездам у Д'еп бацькі заўважылі, што мы ўжо амаль што цалкам сталі французамі. Каб не дапусціць гэтага, бацька даў нам на ўсё лета рэпетытара пана Касакоўскага, узятага з польскай школы ў Бацінёле, які меў абавязак размаўляць з намі толькі па-польску.

[...]

**[У раздзеле III аўтар піша пра сваю вучобу ў школах Парыжа.]**

## *РАЗДЗЕЛ IV*

## *Перад паўстаннем Канікулы 1860, 1861, 1862 гг.*

У 1860 г., калі ўжо чакалася, але не абвяшчалася вызваленне ад прыгону і надзяленне сялян маёмасцю, але ўсё яшчэ дзейнічалі сярэднявечныя адносіны, здароўе маёй маці палепшылася да такой ступені, што яна магла шаптаць і таму ўсё больш жадала вярнуцца ў край. Бацька з усім абозам, з Камілкай, якая стала амаль што французанкай і Хеленкай Грынявецкай, якая хацела пазнаёміцца з Бацькаўшчынай, павёз нас на вакацыі на радзіму. Гэтым разам мы даехалі цягніком аж да Вержбалава, на мяжы паміж Прусіяй і Расійскай дзяржавай.

Некалькі дзён перад ад'ездам на вёску мы правялі ў Вільні. Паколькі, дзякуючы маёй заўчаснай адукацыі і маленькаму росту, я выглядаў надзвычай разумным хлоп-

[26] Я б не сказаў гэтага пра эміграцыю 1863 г. Рух 1831 г. быў выключна нацыянальны і падштурхнуў у эміграцыю тагачасную польскую грамадскасць. Я не чуў, каб які-небудзь тагачасны эмігрант прымаў удзел у французскіх хваляваннях 1832 г. У руху 1863 г. ахвярамі сталі патрыёты, якія напоўнілі Сібір, а сапраўднымі кіраўнікамі сталі рэвалюцыянеры, якія далі Парыжскай камуне 1871 г. больш за 200 добраахвотнікаў.

[27] Доктар Галензоўскі быў сапраўднай эміграцыйнай знакамітасцю. Ён пакінуў краіну адразу пасля заканчэння медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта. На пачатку задумаў адправіцца ў Мексіку дзе ў той час меўся велізарны недахоп лекараў, пры вялікім багаццю жыхароў (дзякуючы толькі што адкрытым срэбным капальням). У хуткім часе ён зарабіў вельмі значныя грошы і вярнуўшыся ў Парыж у росквіце сіл, цалкам прысвяціў сябе эміграцыі, галоўным чынам польскай школе, у якой жыў. Мой бацька моцна сябраваў з гэтым высакародным чалавекам, які ўскосна паўплываў на маё выхаванне.

[28] Школа Бацінёл (Szkola Batignolles) - польскі ліцэй, паўстаў у 1842 г. у раёне Парыжа Бацінёл. - *Л. Л.*

чыкам, а мой бацька любіў паказаць сваю французскую мову, ён паўсюдна браў мяне з сабой. Старая Вільня, акрамя выключна яўрэйскіх, агідна брудных і смярдзючых раёнаў, фактычна абмяжоўвалася трыма галоўнымі артэрыямі: вуліцай Вялікай і Замкавай, яе працягам паміж Вострабрамскай і Катэдрай, а таксама вуліцамі Святаянскай, Дамініканскай, Троцкай, Нямецкай і Віленскай. Праз кожныя некалькі крокаў мы мусілі спыняцца, каб павітацца з бацькавымі сябрамі і сказаць ім некалькі слоў. З гонарам магу сказаць, што ў Вільні ў той час і да канца 1862 г. я ніколі не чуў ніводнага слова на аніводнай мове, акрамя польскай (ці яўрэйскай). Простыя людзі вясковага паходжання, г. зн. беларусы ці летувісы, не карысталіся ў горадзе сваім дыялектам, чыноўнікі, нібыта рускія, усе былі палякамі, а суды абіраліся толькі шляхтай. Сярод вышэйшых службовых асоб меліся толькі генерал-губернатар Назімаў, цывільны губернатар Пахвіснёў і прэзідэнт падатковай палаты дэ Раберці. Усе трое - паважаныя і любімыя (а нават і ненавісны прыдзіра паліцмайстар Васільнеў) размаўлялі з палякамі толькі па-французску, а некалькі дзесяткаў другарадных чыноўнікаў добра валодалі польскай мовай. Нават Аляксандр ІІ, наведваючы так званыя "забраныя правінцыі", калі пераязджаў Дзвіну ці Днепр, карыстаўся толькі французскай мовай. Значна пазней князь Уладзімір Чацвярцінскі, шматгадовы прэзідэнт нашага паляўнічага клуба ў Варшаве, казаў мне, што ў тым жа 1860 годзе ён быў на Падоллі на вельмі вялікім абедзе, дадзеным падольскай шляхтай Аляксандру ІІ у шатры. У канцы абеду ўстаў усхваляваны шляхціц і грымотным голасам закрычаў: "А я яшчэ п'ю за здароўе Найяснейшага Пана!". На гэта імператар, напалову ўстаўшы, падняў келіх і з ветлівай усмешкай, з добрай вымовай, адказаў: "Вялікі дзякуй, шаноўнаму пану". Вядома, што да 1830 г. (Аляксандру ІІ было ўжо 13 гадоў), Мікалай І даваў свайму старэйшаму сыну польскага настаўніка як спадчынніку польскага трона.

З вялікай радасцю мы правялі ўвесь адпачынак у сельскай мясцовасці, асабліва падчас так званых дажынак, арганізаваных для прыгонных сялян, хоць і са спазненнем, але па-чарзе у 4-х бацькоўскіх ключах: Геранёнах, Лугамовічах, Лаздунах і Цыціне. Дажынкі святкаваліся з бясконцай колькасцю вяндліны, каўбас, кмінных сыроў, бочак піва, вёдзер мёду (гарэлкі не было) і танцаў на траве пад гукі прыдворнага дзедаўскага аркестра "артыстаў", якіх бацька размясціў па сваіх 20 фальваркаў як больш-менш карысных эканомаў і збіраў іх толькі на падобныя ўрачыстасці.

Тады нашы сяляне і сялянкі не мелі ні найменшага паняцця пра пінжакі, станікі і капелюшы. Яны насілі, у тым ліку і ў касцёл, свае традыцыйныя народныя строі, такія ж, як і ў часы караля Ягайлы, у мужчын нязграбныя, а ў кабет вельмі маляўнічыя і рознакаляровыя, са шматлікімі радамі рознакаляровых пацерак на грудзях і асабліва з багатымі і казачнымі галаўнымі жаночымі ўборамі. Праз дзесяць гадоў ад гэтага не засталося і следу. Натуральна, што мае тагачасныя псіхалагічныя даследаванні не маглі быць глыбокімі, але я павінен шчыра сказаць, што падчас гэтых трох святкаванняў дажынак у 1860, 1861 і 1862 гадах, я не адчуваў ніякай варожасці вёсак да панскіх маёнткаў. А з празмерна шматлікай дваровай прыслугай адносіны былі цалкам сардэчнымі, нават з адценнем фамільярнасці, якая праз некалькі гадоў саступіла месца цырыманіяльнай, але менш прыязнай ветлівасці.

Ва ўсіх маёнтках, бацька, сам добры вершнік, падрыхтаваў для кожнага з нас адпаведнага верхавога каня і ладзіў паляванне з хартамі. Наведалі мы і пяць цётак з боку бацькі і маці, у кожнай з якіх мелася вялікая колькасць дзяцей. За выключэннем адной, усе яны жылі ў некалькіх дзясятках кіламетраў ад Геранён.

Падарожжа адбывалася наступным чынам.

На шляху мы заўсёды абедалі і мелі хаця б адзін начлег. Таму паперадзе нас на возе ехаў конюх і папярэджваў яўрэяў-карчмароў, каб тыя гналі ўсіх гасцей і пачыналі прыбіраць свой заезны дом. Праз тры гадзіны за ім ехаў сапраўдны караван у наступным складзе: першым - Яснавяльможны пан, адзін у карэце, запрэжанай чатырма коньмі. Другім - так звазваны кочабрык[29] запрэжаны чацвёркай, у ім ехалі панічы з гувернёрам. Падчас пастою бацька па-чарзе клікаў аднаго з сыноў да сябе і вёў з імі размову, а фактычна, маналог, у якім расказваў вельмі цікавыя і павучальныя падрабязнасці са свайго былога жыцця ў краі і чытаў вельмі доўгія і яшчэ больш нудныя маралі пра ўсё тое, што трэба рабіць у жыцці, а чаго трэба пазбягаць, інакш ... "марна згінеш".

За панічамі ехала вялізнае матчына ландо на стаячых і вельмі чуллівых рысорах, якое так гайдалася па нашых пясчаных, камяністых і гразкіх літоўскіх дарогах, што наша бедная сястра амаль што ўвесь час хварэла на марскую хваробу. Гэты Ноеў каўчэг быў запрэжаны 6-цю вялізнымі коньмі - 4 поруч і 2 на лейцах, ён вёз на козлах старшага фурмана, а побач з ім бацькоўскага камердынера. Унутры ландо ехала маці, Камілка Мацкевічоўна ці на змену Хеленка Грынявецкая з нашай сястрой, а на прычэпленым ззаду сядзенні, падобным на крэсла, - пакаёўка.

Заканчвалася шэсце вялізнай, спецыяльна для гэтага пабудаванай фурай, таксама з чатырма коньмі, але ўжо без рысор. На ёй ехалі кухар, дзяўчына і цэлы стос матрацаў, падушак, коўдраў, прасцінаў, медніц, збаноў, самавараў, рондаляў, патэльняў, усякія харчы і закускі - усё гэта было закрыта ад дажджу нявырабленымі скурамі. Караван ехаў з сярэдняй хуткасцю 10 кіламетраў у гадзіну і максімум 70 кіламетраў ад раніцы да вечара, пры гэтым уначы ўсе спалі, а коні пасвіліся колькі хацелі ці, як раіла

[29] Кочабрык - (карэта-брычка) вялікая, крытая, конная павозка на рысорах, падобная на карэту. Звычайна чатырохколавая, чатырохмесная, з плоскім дном, з дзвярыма і надколавымі аркамі. Выкарыстоўваўся дробнай шляхтай у XIX ст. - *Л. Л.*

надвор'е. Акрамя страт часу, пра якія стары чалавек ведае - вынікі спешкі не вартыя выдаткаў на іх, такая вандроўка была нашмат прыемней і камфортней, чым у сучасных "спальных вагонах", "вагонах-рэстаранах" і асабліва на аўтамабілях ці самалётах , якія ствараюць ўражанне, што ты - канверт або бандэроль на пошце.

Усе двары нашых цётак тады лічыліся заможнымі. Аднак у "палацах" было ўсяго дзясятак-другі пакояў, з якіх не менш за 4 былі так званымі параднымі, але за стол гаспадароў часта сядалі ці нават начавалі не менш за 30 чалавек. Усе былі сытыя, але куды яны ўсе месціліся і дзе спалі? Гэта атрымлівалася, бо меліся незлічоныя запасы пасцельнай бялізны, наскубаных за пакаленні падушак, розных, часова пустых гаспадарчых пабудоў, а галоўным чынам з-за дабраславёнай неразборлівасці і сціпласці патрабаванняў. Можа, мы зноў вернемся ў тыя часы, калі прыйдзе Савецкая Расія.

На пачатку кастрычніка ўсе акрамя бацькі, вярнуліся ў Парыж да свайго ранейшага ладу жыцця.

Азіраючыся на 1860 год, я магу сказаць, што хоць, натуральна, старэйшыя за мяне людзі не давяралі мне свае праекты і мары, але тады, як і сёння, вучань 4-га класа быў значна больш разумным, чым лічылі дарослыя, і я шмат што ўбачыў, падслухаў і шмат у чым разабраўся. Акрамя таго я карыстаюся думкамі майго мудрага бацькі, які ў той час не ўпускаў магчымасці, каб пашырыць мой кругагляд.

Маё рэтраспектыўнае ўражанне такое, што ўвосень 1860 года, іскра, якая павінна была запаліць увесь еўрапейскі пажар, г. зн. экспедыцыя Гарыбальдзі на Сіцылію ўжо ўспыхнула, але яе ўплыў на грамадства ў маёй краіне ўсё яшчэ было немагчыма заўважыць . Так, пасля ўступлення на пасад Аляксандра II польска-расійскія адносіны ў значнай ступені змякчыліся і палагаднелі, што ўзмацніла ліберальныя намеры Аляксандра II, у прыватнасці, яго цвёрдую рашучасць правесці сялянскую рэформу, якая сутыкнулася з шалёным супраціўленнем расійскага дваранства і арыстакратыі, а ў нашым грамадстве яго намер нават выклікаў сімпатыю. У 1859 годзе віленская шляхта першай звярнулася да імператара з патрабаваннем адмяніць прыгоннае права, і гэта зблізіла яго з нашай шляхтай. Далей цар прыняў запрашэнне на паляванне, арганізаванае для яго братамі Міхалам і Юзафам Тышкевічамі. Потым адбыўся вялікі баль, дадзены шляхтай у яго гонар у бальнай зале камяніцы, пабудаванай князем Агінскім побач з дваранскім клубам спецыяльна для гэтай мэты. Сардэчнасць прыёму цару так спадабалася, што, калі на пачатку 1861 г. на прускі трон узышоў будучы імператар Вільгельм і адразу ж абвясціў аб сваім візіце маладзейшаму па ўзросце, але старэйшаму на троне пляменніку Аляксандру II, той запрасіў яго ў Вільню, каб паказаць добрыя адносіны, якія склаліся паміж ім і яго падданымі і таму даў зразумець шляхце, што хацеў бы, каб баль паўтарыўся. Гэта запрашэнне на вальс спачатку было ахвотна прынята шляхтай, але калі як прэлюдыя да паўстання пачаліся варшаўскія дэманстрацыі, запрашэнне было самым няўклюдным чынам адклікана, чаго помслівы Раманаў ніколі не забыў і не дараваў.

2 (14) лютага 1861 г. быў апублікаваны маніфест у якім абвяшчалася вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці і абшарніцкай улады над імі. Сялянам прадстаўлялася поўная ўласнасць на іх надзелы з адпаведнай платай спадчынніку грашыма, але пры гэтым фактычнае правядзенне рэформы адкладвалася на два гады, каб даць абшарнікам час для ўвядзення новых працоўных адносін, пабудовы неабходных гмахаў і пераходу ад прымусовай і дармовай працы да свабоднай і платнай.

Усё гэта чакалася шляхтай, але на галовы надзвычай цёмнага вясковага люду, які больш чым на 98% складаўся з непісьменных людзей, калі па загаду ўладаў пра яе чыталі са ўсіх праваслаўных і каталіцкіх амбонаў, справа прыйшла як нешта зусім незразумелае. Ніхто не разумеў неабходнасці двухгадовага тэрміну, наданне права ўласнасці многія сяляне распаўсюджвалі на ўсе землі, якія дагэтуль апрацоўвалі - на свае надзелы і на зямлю панскіх фальваркаў, і можна толькі здзіўляцца, што гэтая нязграбная працэдура не справакавала куды больш шырокія і крывавыя беспарадкі, чым тыя, якія мелі месца.

У нашым краі, зрэшты, нідзе не было хваляванняў у маёнтках, якімі кіравалі самі гаспадары, бо дзякуючы наогул добрым адносінам са сваімі падданымі, яны лёгка з імі паладзілі[30]. Але на мяжы з Лугамовічамі, маёнткам маёй маці (пазней маім), знаходзіўся вялізны маёнтак і зусім невялікае мястэчка Іўе, якое ў акружнасці каля 30 кіламетраў служыла гандлёвым цэнтрам і належала графіне Замойскай з Тызенгаўзаў. З незапамятных часоў тут ніхто не бачыў дзедзіча і маёнткам кіраваў неўдалы пан Ятэйка які, напэўна, пачуўшы пра маніфест, страціў прытомнасць. І на першым жа кірмашы, якія тады абавязкова суправаджаліся моцнай выпіўкай, пачалося хваляванне, яно ўзмацнялася з кожнай гадзінай і перакінулася на суседнія маёнткі. Сабраўся шматтысячны натоўп, які начаваў у фурманках пад адкрытым небам. Натуральна,

[30] Аднак рускі афіцэр М. Мяжэйцкі пісаў, што менавіта з мэтай задушэння сялянскіх хваляванняў у Лідскі павет быў перакінуты Нараўскі пяхотны полк: "Прайшло толькі некалькі месяцаў з дня маніфеста пра вызваленне сялян, і ў абшарнікаў пачаліся з імі непаразуменні, якія ўвесь час патрабавалі ўмяшання вайсковай сілы, ... гэта і было прычынай паспешнага выкліку нашага палка з Курляндыі ў Літву. Падчас знаходжання ў Лідскім павеце полк, як кажуць, быў у разгоне: роты, па адной ці па дзве, знаходзіліся амаль у бесперапынным перасоўванні, робячы пераходы з аднаго паселішча ў другое для ўціхамірвання ... сялянскіх бунтаў, уціхамірванні гэтыя суправаджаліся, як звычайна, розгамі". - Л. Л.

ніхто не ведаў, чаго ён хоча і нават пра што ідзе гаворка, але людзі цягнуліся сюды па сялянскай звычцы без усялякай зброі, нават ручной, кажучы: "Як усе, гэтак і я". Стары Ятэйка адразу страціў галаву і схаваўся ў плябаніі, якая месцілася ў былым, даволі вялікім мураваным кляштары бернардзінцаў. Пробашч быў меншым баязлівцам, вікарый быў баязліўцам толькі на чвэрць і вырашыў папярэдзіць генеральнага ўпаўнаважанага майго бацькі, пана Юзафа Шалевіча ў Лугамовічах. Пан Юзаф, быў тыповым шляхціцам часоў пана Яна Паска[31], меў тады 50 гадоў, вялізны ў даўжыню і ўпоперак, з вялікімі вусамі, гарачы паляўнічы на мядзведзяў. Ён узяў з сабою свайго ляснічага, шчыра адданага яму фурмана-забіяку, сабраў, колькі знайшоў, агнястрэльнай зброі, набоі, добры запас ежы і як мага хутчэй, шалёна падганяючы сваю чацвёрку, паляцеў у Іўе. Шалевіч загіпнатызаваў дурны натоўп, праправўся скрозь яго і замкнуўся ў плябаніі, якую ў імгненне вока ўмацаваў і гэтым надаў адвагі тым, хто ў ёй знаходзіўся - да гэтага часу яны дрыжалі як галярэта. Пяць дзён запар, акружаныя некалькімі тысячамі сялян, сядзелі ў асадзе. Сялян трымалі ў страсе на адлегласці выстралу (тады гэта было 120 крокаў), бо ўвесь час - і ўдзень і ўначы, паказваліся ва ўсіх вокнах.

Тым часам у Вільні даведаліся аб гэтым здарэнні. Генерал-губернатар Назімаў хутка паслаў дзве пяхотныя роты, якія, калі б паспелі, несумненна зрабілі б вялікае кровапраліцце. Але ўсю сітуацыю і саміх збаламучаных сялян выратаваў яго ад'ютант, граф Юзаф Тышкевіч з Ландварава. Ён пачуў, што годнаму генерал-губернатару Назімаву давядзецца перайсці да энергічных мер і ўзяўся навесці парадак сваімі ўласнымі казакамі. Аднак папрасіў для чыста дэманстратыўных мэт аддаць пад яго камандаванне дзве пяхотныя роты. І стрымаў сваё слова.

Юзаф Тышкевіч, якому тады было ўсяго 30 гадоў, быў асобай, якая павінна была жыць у гарачыя часы Сасаў ці нават яшчэ больш ранейшых. Сірата, з дзесяцігадовага ўзросту без бацькі і маці, меў у сваім распараджэнні вялікую маёмасць і набыў яшчэ невялікі маёнтак Ландварава недалёка ад Вільні, дзе дзякуючы памяркоўнасці генерал-губернатараў Бібікава і Назімава, якія хацелі мець пры сабе ад'ютанта з мясцовай арыстакратыі, вёў фантастычны лад жыцця[32]. Ён уласным коштам утрымліваў 18 конных казакоў, для іх і свайго камфорту трымаў яшчэ паўтузіна казачак. Адзіным заняткам казакоў было пакрасавацца перад штодзённымі гасцямі - у асноўным віленскімі прыжывaламі, "джыгітоўкай" і скокамі цераз паштовыя брычкі. Скакалі таксама і некаторыя з казачак. Паход на Іўе стаў лебядзінай песняй Тышкевіча. Ён быў ужо па вушы ў даўгах, яго браты і дзядзькі згаварыліся і знайшлі для яго выключна разумную, нават мудрую і адукаваную панну Зоф'ю Горватаўну, дачку і сястру кіеўскіх губернскіх маршалкаў. На вялікім абедзе, не папярэдзіўшы, яго пасадзілі каля панны і, калі дайшлі да дэсерту, устаў нейкі пралат, прапанаваў "здароўе маладых", і справа была зроблена. Дзякуючы гэтаму ён пражыў яшчэ 30 гадоў найшчаслівейшага сямейнага жыцця бо кіраваўся прынцыпам, які я сам ад яго чуў: "Я дурны, а Зося мудрая, таму хай яна будзе галоўнай і кіруе маёнткам, а я буду рабіць глупствы".

Між тым у Івейскай экспедыцыі Юзаф Тышкевіч дзейнічаў як выдатны стратэг. Маючы пяхоту на рэквізаваных сялянскіх вазах, ён ад світанку да змяркання праляцеў каля ста кіламетраў, спакойна заначаваў у адным з івейскіх фальваркаў і ў 10 гадзін раніцы, як каршак на чале сваіх 18-ці казакаў, якія шаблі трымалі ў похвах, а нагайкі ў паветры, напаў на тлум сялян на вялікім івейскім рынку.

Хто мог, той драпаў па бакавых вуліцах і аддыхаўся толькі ў сваёй хаціне, рэшта адразу ж упала на калені і выдала нібыта сто завадатараў, пасля чаго супакоены натоўп да вечара з цікаўнасцю назіраў за "раздачай узнагарод" - гэта значыць доўгую, па велікапанскі вымеранаю лупцоўку па голым целе. Дасталася і прыгожаму полу, але праз кашулі. Вечарам ўсе пайшлі ці паехалі дахаты, некаторыя, зразумела, ехалі лежачы на жываце. Пяхота засталася на некалькі дзён, каб ушчэнт аб'есці насельніцтва. Пасля чаго ўсё прыгожа супакоілася, і калі б не вельмі цікавы ліст з падрабязнасцямі ад майго бацькі, які ён даслаў да нас у Парыж праз некалькі месяцаў, дык калі я ехаў праз тое ж Іўе ў Лугамовічы, я б не здагадаўся, што тут адбылася гэтая "рэвалюцыя ў рондалі" [33].

*(Працяг у наступным нумары.)*

[31]Гл: Jan Chryzostom Pasek. Pamiatniki. opr. Roman Pollak. Warszawa: Panstwowy Instytut Wydawniczy, 1987.

[32] Юзаф Тышкевіч адным з першых уладкаваў у Ландварава тэнісныя корты. - Л. Л.

[33] Натуральна, я канспектую гэтую гісторыю не de visu, але de auditu (не бачыў, але чуў, фр. - *Л. Л.*), але з лепшых крыніц - з аповедаў пана Юзафа Шалевіча і Тышкевіча, які пазней стаў палкоўнікам, я добра ведаў яго. І, нарэшце, па расказу адной з ахвяр гэтай драмы. Калі праз 15 гадоў я ўзяў Лугамовічы, там служыў конюхам мажны селянін, прозвішча якога я ўжо не памятаю, але якога, паводле нашага звычаю, празвалі Лындай (валацуга, гультай, той хто "б'е лынды" - *Л. Л.*). З-за голасу як у быка і схільнасці да бутэлькі, ён быў прызнаны адным з галоўных завадатараў і атрымаў самую вялікую порцыю - 100 бізуноў. Я паспрабаваў даведацца ў яго пра ход усёй гэтай справы. Мне было нялёгка дасягнуць гэтага, бо, як я пазней пераканаўся па некаторых героях турэцкай вайны 1877 года і японскай вайны 1904 года, паўнапраўныя грамадзяне, выбаршчыкі і нашы заканадаўцы звычайна маюць і захоўваюць уражанні толькі "пакуль скура свярбіць". Я быў здзіўлены, калі ветліва выказаў Лындзе некалькі слоў спачування з нагоды яго "пакутніцтва" і пачуў у адказ: *"І добра атрымаў, паночку, чаго мне было туды лезці"*.





*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Гэты ж 1861 год упісаў у нашу мясцовую гісторыю сапраўды прыгожую старонку, сляды якой, у значнай ступені, бачны і цяпер. Праклёнам тых часоў было ўсеагульнае, па-сапраўднаму д'ябальскае п'янства вясковага люду, якое падтрымлівалася прыкладамі самой шляхты і аблягчалася фенаменальнай таннасцю гарэлкі (добры кілішак 40% - най гарэлкі прадаваўся ў вёсцы за два грошы, гэта значыць за 1 капейку). У дні маіх вакацый 1860 г. у святочныя ці базарныя дні, вечарам нельга было праехаць па дарозе, бо праз кожныя некалькі сотняў крокаў каля ці нават пасярод дарогі, як труп, ляжаў п'яніца.

Але на пачатку 1861 г., напэўна, дзякуючы вялікаму маральнаму ўздыму, які суправаджаў вызваленне сялян, ковенскі біскуп Валанчэўскі, вельмі годны каплан, хоць і крыху дэмагог, выступіў з ідэяй заснаваць сярод народа "брацтва цвярозасці". Паўсюдна, куды дасягаў уплыў каталіцкага кліру, у нядзелю ці на святы пасля стандартнай пропаведзі, ксяндзы заклікалі парафіян прыняць з крыжам і евангеллем асабістую прысягу аб поўнай цвярозасці. Ксяндзы мелі адмысловыя кнігі для запісу чальцоў брацтва. Гэты рух мусіў мець і меў даволі цяжкія наступствы для абшарніцкай шляхты, бо на вёсцы было моцна пашырана вінакурніцтва. Мой бацька сам валодаў пяццю спіртзаводамі і пасля гэтых падзей адразу зачыніў два з іх. Нягледзячы на гэта, абшарнікі таксама актыўна ўдзельнічала ў руху. Вынік перасягнуў усе чаканні. Сяляне, саромеючыся адзін аднаго, аб'ядноўваліся ў брацтвы, п'янства выходзіла з моды і нават праз вялікі час, калі вымерла ўсё тагачаснае пакаленне братоў, мода на п'янства сярод вясковага люду не адрадзілася. Знікла п'янства і сярод шляхты, але гэта было звязана з жорсткімі пакутамі 1863 г. і іх наступствамі. З чыста фіскальных меркаванняў расійскі ўрад спрабаваў перашкодзіць гэтаму кроку. Але было ўжо занадта позна[34]. Праваслаўнае духавенства ў гэтым руху не прымала ніякага ўдзелу, і таму да апошняй сусветнай вайны ў маім краі цвярозасць можна было атаясамліваць з каталіцтвам, а праваслаўе - з п'янствам.

Вакацыі 1861 года мы зноў правялі ў краі, але ў зусім іншай атмасферы. У свядомасці панавала эпапея Гарыбальдзі з аб'яднаннем Італіі якая лёгка запальвала розумы "ад мора да мора". У Расіі панавалі ліберальныя і рэфарматарскія плыні, адбываліся дэманстрацыі ў

---

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[34] Каталіцкім касцёлам у 1850-х гадах быў ініцыяваны рух за цвярозасць, які разглядаўся ўладамі як пагроза напаўненню бюджэту і небяспечная "польская" грамадская ініцыятыва. Аднак ураду прыйшлося пайсці на пэўныя захады, каб зменшыць спажыванне алкаголю, у тым ліку даўшы палёгку піваварам, бо да гэтага часу падаткавая палітыка стымулявала перавагу гарэлкі над усімі іншымі алкагольнымі напоямі. На месцах былі створаны "Камітэты для назірання за правільным продажам алкагольных напояў". У Лідзе такі камітэт пад кіраўніцтвам павятовага маршалка шляхты (прадвадзіцеля дваранства) Рамуальда Казіміравіча Кастравіцкага (кавалер ордэна Св. Уладзіміра 4-й ступені) з'яўляецца ў 1846 г. Акрамя маршалка, камітэт утваралі 3 сябры камітэту і 13 дэпутатаў, папяровымі справамі камітэта займаўся "пісьмавадзіцель" павятовага маршалка шляхты. Сярод "дэпутатаў" камітэта ў 1850 г. з'яўляецца і "Мирон-Бронислав Фридрихович Нарбутт", які пісаў: *"З 1860 года, калі ў цэлым Краі пачаў абуджацца разумовы рух, актыўна клапаціліся пра заснаванне народных школ і лідзяне, а духавенства пашырала таварыства цвярозасці з даволі паспяховым вынікам, так што побыт лідзян значна палепшыўся, і ў 1862 годзе спаткаць п'янага лідзяніна было ўжо рэдкасцю"*. Неабходна заўважыць, што ідэя народнай цвярозасці прыйшла ў наш край з Еўропы, і асаблівы ўздым гэтага руху прыйшоўся на 1858-63 гг., г. зн. перад самым паўстаннем: *"У Царства Польскае цвярозасць прыйшла ў 1857 г. і адтуль у канцы 1858 г. распаўсюдзілася ў сумежных губернях: Ковенскай і Гарадзенскай. ...у снежні 1858 цвярозасць прыйшла і да нас ... і да 1 сакавіка 1859 г. цвярозасць распаўсюдзілася па паветах: Віленскім, ...збольшага па Ашмянскім і Лідскім"*. Да канца 1859 г. 39 408 чалавек на Лідчыне публічна, у храмах, прынялі на сябе абавязак устрымлівацца ад ужывання алкаголю.

У 1859 г. у суседняй Гарадзенскай губерні доля даходаў дзяржаўнага бюджэту ад продажу і вытворчасці алкагольных напояў даходзіла да 55% ад усіх даходаў. У любой іншай краіне гэты паказчык не перавышаў 24 %, Віленская губерня, куды ўваходзіў Лідскі павет, мела прыкладна тую ж статыстыку, што і Гарадзенская. - *Л. Л.*

Варшаве і пасля іх - жалоба, чамаркі і г.д.[35]

Наш прыезд у Вільню супаў з момантам, калі першыя хвалі заразы дэманстрацый пачалі даходзіць і да нас. У пачатку жніўня, незадоўга да заходу сонца, мы ўязджалі ў горад ковенскім трактам на брычках праз Пагулянку. Каля самай брамы мы ўбачылі некалькі сотняў казакоў, праўда, без пік. Нас ніхто не спыняў, але калі мы рыссю спускаліся па стромай дарозе, дык нас дагналі казакі, якія заўзята направа і налева махалі нагайкамі, а злева (пад гару) з боку Пагулянкі, якая тады не была забудавана ажно да вуліцы Завальнай і не мела тратуараў, ішла не вельмі шматлікая, але ўжо часткова разагнаная працэсія, людзі спявалі "Божа, што ж Польшча" і неслі некалькі жалобных харугваў. Мы без праблем дабраліся да дома Мілера на вуліцы Нямецкай, і, як толькі прыехалі, нас наведаў малады архітэктар пан Шалевіч, сын вышэйзгаданага адважнага пана Юзафа, які зрабіў нам гарачую справаздачу аб падзеях.

Аказалася, і я пачуў гэта праз шмат гадоў ад другога ўдзельніка гэтай маніфестацыі пана Антушовіча, тлум на Пагулянцы ўзбудзіла вестка ... што з Коўні па шляху Напалеона ўжо ідзе французская армія, якую ў Вержбалове высадзіў англійскі флот![36] Натуральна, у гэтых маніфестацыях удзельнічалі і нашы абавязковыя "аніматаркі" падобных выбрыкаў, то бок мілыя пані і паненкі. На чале іх у Вільні таго часу стаяла пані Александрына Лубанская з Сулістроўскіх, якая паўсюль лётала, нібы матылёк, паўтараючы: "Il faut chauffer, il faut chauffer" ("Трэба падвышаць напал, трэба падвышаць напал", фр. - *Л. Л.*) і чароўная пані Ізя Тышкевічава з Вакі, якая спецыялізавалася на вытанчаных нахабствах у адносінах да генерал-губернатара Назімава, а таксама сімпатычная і мілая панна Валіцкая, якая на Пагулянцы падчас гэтага паходу на Коўню, добра атрымала нагайкай па плячах ад казака, але праз два гады адпомсціла Маскве тым, што выйшла замуж за праваслаўнага пана Міхала Камара[37].

Аповед маладога Шалевіча пакінуў у маіх бацькоў вельмі дрэннае ўражанне. Бацька ўжо прадбачыў, да чаго прывядзе гэтае вар'яцтва. З ім пагаджалася і маці, яна хоць і была вельмі рэлігійнай і патрыятычна ўзнёслай, але з-за стану здароўя вяла эгацэнтрычны лад жыцця і была схільная заставацца над падзеямі. Калі бацька цвёрда вырашыў, што ні ён, ні хто з яго сям'і не будзе ўдзельнічаць у гэтых дзіцячых і небяспечных маніфестацыях, маці без пратэсту падпарадкавалася ў такой важнай справе рашэнню галавы сям'і і была, бадай, адзінай жанчынай, якая да канца не насіла жалобы[38]. Яна заўсёды надзявала рознакаляровыя ўпрыгожванні на сябе і сваіх траіх дзяцей. Гэта, канешне, не адмяняла болю ад страт, якія, як я пакажу пазней, нам было наканавана пацярпець ад маскоўскага ўраду, у той час, калі многія з дэманстрантаў і падпальшчыкаў неяк шчасліва пахаваліся.

Шмат што адрознівае мяне ад поглядаў і метадаў дзеяння пана Рамана Дмоўскага[39], аднак, усё ж я горача абняў бы яго, бо ў сваёй апошняй кнізе "Як адбудоўвалася Польшча" ён, бадай, першы з нашых палітычных кары-

[35] Пасля расстрэлу ў 1861 г. дэманстрацый у Варшаве, асабліва пасля красавіцкай масакры, вулічныя дэманстрацыі змяніліся зборамі ў касцёлах, дзе спяваліся патрыятычныя гімны і адзначаліся памятныя даты з гісторыі Рэчы Паспалітай. "Маральная рэвалюцыя" набывала форму кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання і ставіла ў тупік прадстаўнікоў імперскай адміністрацыі, якія ніколі не сутыкаліся з такімі формамі палітычнага жыцця. Жанчыны ў памяць аб красавіцкіх ахвярах нязменна насілі жалобную вопратку. Тыя, хто не насіў жалобы, падвяргаліся на вуліцах маральнаму ціску.

У Лідзе, як і паўсюдна, пад уплывам варшаўскіх расстрэлаў мужчыны апранулі канфедэраткі і чорныя чамаркі, а жанчыны жалобу. Гімн "Божа, што ж Польшча" быў перакладзены на беларускую, літоўскаю, яўрэйскую і ўкраінскую мовы і стаў вельмі папулярным. - *Л. Л.*

[36] У 1855 г. памёр цар Мікалай I, Расія атрымала ганебную паразу ў Крымскай вайне. Сітуацыя, у якой у 1855 г. быў каранаваны новы цар Аляксандр II, адназначна дыктавала неабходнасць рэформаў і лібералізацыі рэжыму. Улады на той момант не мелі праграмы пераўтварэнняў, але "польскае пытанне" непазбежна адразу апынулася ў цэнтры іх увагі. Імператар французаў Напалеон III дэклараваў сабе як абаронца правоў нацыянальнасцей. - *Л. Л.*

[37] Першая маніфестацыя ў Вільні адбылася 20 траўня 1861 г. Пасля яе пратэсны рух пракаціўся па ўсёй гістарычнай Літве: арганізоўваліся паніхіды па загінуўшых у Варшаве, хросныя хады, адзін з якіх у Коўні прайшоў па мосце цераз Нёман і сімвалізаваў унію Літвы і Польшчы. У жніўні 1861 г. у Вільні пасля службы ў касцёле і спеваў гімнаў, каля 5 000 чалавек - шляхты, гараджан і сялян - прайшлі па горадзе ў знак "сардэчнага збліжэння", падчас мірнай маніфестацыі на Пагулянцы рускае войска па камандзе Назімава ўжыло зброю, загінула 11 чалавек. - *Л. Л.*

[38] У чэрвені 1863 года генерал-губернатар Мураўёў забараніў жанчынам нашэнне жалобы нават па страчаных мужах, братах і бацьках. - *Л. Л.*

[39] Раман Станіслаў Дмоўскі (1864-1939), польскі палітычны дзеяч, публіцыст. Дмоўскі распрацаваў асновы нацыянальна-дзяржаўнай арганізацыі Другой Рэчы Паспалітай на падставе канцэпцыі інкарпарацыі і выступаў супраць федэратыўнай канцэпцыі Пілсудскага. У 1923 міністр замежных спраў. Пасля прыходу да ўлады Пілсудскага ў 1926 г. стварыў апазіцыйны "Лагер Вялікай Польшчы", які ў 1933 г. быў забаронены. Сярод іншага, Дмоўскі пісаў пра фатальную ролю "польскага пытання" для гісторыі Рускай Імперыі: далучэнне земляў Рэчы Паспалітай да Імперыі зрабіла немагчымым нармальнае палітычнае развіццё гэтай краіны: *"Колькі разоў Расія ўступала на шлях разумных памяркоўных рэформаў і ў часы Аляксандра I, і ў часы Аляксандра II, альбо ў перыяд станаўлення Думы, і кожны*

феяў меў шчырасць і смеласць выказаць думку, што ўсе нашы паўстанні выбухнулі нясвоечасова і нам трэбы казаць не пра заслугі іх правадыроў, а пра цяжкія грахі перад Бацькаўшчынай. Як потым у Вільні казаў Падарэўскі[40], нельга хадзіць з паходняй каля сямейнай страхі, той, хто так робіць, калі ён нават і выпадкова падпаліць хату, той - не герой, а годны кары злачынец.

Многіх удзельнікаў авантуры 1863 года я асабіста ведаў тады і пазней, але гэта былі не змоўшчыкі, не тыя людзі, якія ахвотна лавілі рыбу ў каламутнай вадзе, бо ім не было чаго губляць, а мелі яны надзею стаць "бацькамі краіны", гэта былі людзі, якія "bene nati et ownerati" ("удала нарадзіліся і валодаюць маёмасцю", лац. - *Л. Л.*), яны не маглі не стаць першымі ахвярамі гэтага вар'яцтва 1863 года.

Я не памятаю ніводнага чалавека, які сцвярджаў бы, што тады ў яго была хоць найменшая, самая аддаленая надзея на поспех справы, у якой ён прымаў удзел. Так, усе яны без выключэння ў доказ сваёй прадбачлівасці хваліліся сваімі прадказаннямі, што падзеі скончацца правалам (хоць і не ў такіх маштабах). Гэта выразна прызнае ў сваіх "Успамінах" нават адзін з галоўных арганізатараў усяго руху ў Літве Гейштар - дык чаму і па што яны туды палезлі?

Якіх толькі прамоваў тады можна наслухацца! Як сёння памятаю - палявалі мы ў мамінага дзядзькі ў Кір'янаўцах. Пасля вячэры я сціпла сяджу ў кутку. Па гасцёўні ходзіць чубаты юнак, копія Адама Міцкевіча 1825 года і ў сваёй прамове ўсе скасоўвае. Не будзе дваранства, не будзе ўласнасці, не будзе ўрада, не будзе духавенства і г.д. Бацька яму цярпліва: "А што будзе на месцы ўсяго гэтага?" Хлопец адкідвае чупрыну назад, арлінымі вачыма азірае ўсіх, робіць паўзу і кажа: "Будуць людзі ... і народ!!!..." [41]. Гэта была эпоха "натуральнага розуму, да якога не дакранулася ніводная навука".

З-за гэтага настрою і з-за трывогі аб будучыні, вакацыі 1861 года былі для мяне значна менш раднаснымі, чым у папярэднім годзе.

У кастрычніку мы вярнуліся ў Парыж.

Я пайшоў у 3-ці клас (па французску, а па нашаму - у 6-ты). Мой кругагляд усё больш пашыраўся. Кожны дзень, вяртаючыся з гімназіі, я купляў газету ў разносчыка які чакаў гімназістаў, мае калегі куплялі іншыя газеты і мы абменьваліся імі. Я быў цалкам абазнаны ў сучаснай знешняй і ўнутранай палітыцы.

У 1860 г. Напалеон III, жадаючы заваяваць папулярнасць у народзе, нават не для сябе, а для сваёй дынастыі (такую мару маюць усе парвеню), 21 лістапада 1860 года выдаў знакаміты дэкрэт, які ўнёс даволі моцную плынь свежага паветра ў розныя сферы жыцця [...]. З таго часу і да катастрофы 1870 года, паводле маіх успамінаў і ўражанняў, палітычная сістэма Францыі больш чым дзе-небудзь на кантыненце наблізілася да ідэалу: "свабода і парадак", - заўсёды недасяжны для чалавецтва ідэал.

Дзякуючы катастрофе 1870 г., за якую значна большую долю адказнасці неслі тагачасныя левыя партыі, большую чым сам псеўда-цэзар Напалеон III, які да гэтага часу набыў ва ўсёй Еўропе рэпутацыю горшую, чым рэальна заслугоўваў [...]

Калі я перайшоў у трэці клас банапартскага ліцэя [...] хутка пазнаёміўся з таямніцамі не толькі палітычнага, але і свецкага жыцця тагачаснай сталіцы Сусвету. Нашым каштоўным інфарматарам быў пан Дзмітрый Бенкендорф, унук знакамітага жандара Мікалая I і сын старэйшай з трох дачок грэка Бенардакі, які моцна ўзбагаціўся на акцызнай арэндзе і пасяліўся ў Брусселі, дзе маладая ўдава Бенкендорф выйшла замуж за маркіза д'Аск. Карэспандэнтам Бекендорфа ў Парыжы, г. зн. прадстаўніком нашых бацькоў, да якога мы хадзілі па нядзелях і святах, быў Ле Дюк дэ Басана, ці Марэль, сын знакамітага начальніка палітычнай канцылярыі Напалеона I. Салон герцагіні дэ Басана быў адным з самых папулярных у Парыжы і наш сябар слухаў там разнастайныя свецкія плёткі, якія потым пікантна даносіў да нас. Да таго ж, пансіён пана Кузіна складаўся амаль выключна з сыноў тагачаснай парыжскай арыстакратыі ці плутакратыі, у тым ліку з выбітных сыноў Ізраіля. У нас было два Ротшыльды (адзін сёння яшчэ жывы), адзін Пэрэй, адзін Гінзбург, які падняўся на ваенных пастаўках падчас нядаўняй Крымскай вайны. Акрамя таго, у некалькіх маіх сяброў меліся старэйшыя браты, якія ўжо патрапілі ў высокія колы парыжскага свету, дзякуючы чаму мы ведалі пра любоўныя прыгоды незабыўных жрыцаў Венеры таго часу: амерыканкі Кора Пэрл, чароўнай Гартэнзіі Шнайдэр, стваральніцы "Пры-

---

*раз сыходзіла з гэтага шляху. Галоўнай прычынай было "польскае пытанне", а дакладней небяспека, што палякі выка-рыстаюць палітычныя правы дзеля ўмацавання ўласных пазіцый і падрыву рускай дзяржаўнасці... Трэба было выбіраць паміж эвалюцыйным і рэвалюцыйным шляхамі развіцця. У выніку таго, што "польскае пытанне" фактычна заблакавала першы з іх, Расія была прыгавораная да рэвалюцыі. Магчыма, апошнія падзеі ў Расіі* (маецца на ўвазе рэвалюцыя 1917 г. - *Л. Л.*) *з'ўляюцца расплатай за панаванне над Польшчай" - Л. Л.*

[40] Ігнацы Ян Падарэўскі (1860-1941), польскі піяніст, кампазітар, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, дыпламат. Са студзеня па снежань 1919 г. займаў пасаду прэм'ер-міністра і міністра замежных спраў Польшчы. - *Л. Л.*

[41] Верагодна, гэта быў Лясковіч Войцех Альберт, сын Фелікса, дваранін Лідскага павета. Да паўстання 1863 г. яго бацька валодаў маёнткамі Кір'янаўцы і Пяткаўшчына Лідскага павета. Падчас паўстання агітаваў дваровых людзей удзельнічаць у ім, таму яго маёмасць на падставе распараджэння віленскага губернатара ад 27.06.1863 і пастановы Віленскага грамадзянскага праўлення ад 23.07.1863 падлягала секвестру. Пастановай ваеннага суда прысуджаны да смяротнага пакарання і канфіскацыі маёмасці. Прысуд выкананы (да 01.10.1864). Ягоныя парэшткі разам з парэшткамі іншых паўстанцаў нядаўна былі перазахаваныя ў Вільні. - *Л. Л.*

гожай Алены" і пазней Вялікай герцагіні Геральштэйн, Джульеты ле Бо, неўзабаве, спадарожніцы жыцця графа Міхала Тышкевіча[42], Ганны Дэсліён і інш. - быццам мы спалі пад іхнімі ложкамі. Таксама мы былі знаёмы і з тэатральным жыццём. Мой бацька, сам заўзяты аматар тэатра, прымушаў нашу бедную дзявотку[43] - маці, для адукацыі браць нас на спектаклі. І яна, не дзеля ўласнага задавальнення, бо ў яе наогул не было пачуцця музыкі, а толькі дзеля дзяцей, вадзіла нас у італьянскую оперу.

Акрамя таго, пан Кузін, калі нашых бацькоў не было ў Парыжы, па суботах ці на святах вадзіў нас у "цнатлівыя" тэатры: гэта значыць у "Французскі тэатр" і "Гімназ", дзе панавала незабыўная Ружа Шэры, а таксама ў "Вялікую оперу" або ў "Камічную оперу".

Мой бацька лічыў, што выхаванне хлопчыкаў не павінна грунтавацца толькі на кнігах. Таму, каб кожны з нас меў "па некалькі струн", ён з самага пачатку, каб мы "не загінулі марна", загадаў нам браць дадатковыя ўрокі музыкі і малявання. Мой брат, які быў вельмі таленавіты ў маляванні і жывапісе, да 20 гадоў не мог сыграць нават польку. А я, маючы сапраўдны талент да музыкі, ніколі не мог належна намаляваць нос. І ажно да паступлення ва ўніверсітэт мы мелі пакуты - брат Ігнацы ад фартэпіяна, а я ад малявання.

У той час, і фактычна аж да з'яўлення аўтамабіля (хай яго ліха возьме), у ясныя дні Елісейскія палі і Булонскі лес былі штодзённым месцам збору ўсіх, хто прэтэндаваў на элегантнасць. Хто гэтага не бачыў, той не мае ўяўлення пра сапраўдны парад вытанчаных карэт і коней. Заўсёды было з дзесятак конных экіпажаў а-ля Дамон з двума фарэйтарамі[44]. Таму, як казаў вялікі Талейран, той, хто не ведаў Версаля ў часы Людовіка XVI, той не мае ні найменшага паняцця аб слодычы жыцця, а я б дадаў, што той, хто не бачыў Парыж у апошнія 10 гадоў Другой французскай імперыі, той не мае ўяўлення пра сапраўдную элегантнасць.

У 1862 годзе мы зноў паехалі адпачываць у наш край. Дабраліся ўжо цягніком ажно да Коўні, а праз два месяцы ў адваротны шлях ужо селі ў вагон на сённяшнім вакзале ў Вільні[45]. Што раз усё больш і больш разумны хлопчык, я мог адразу адчуць - тое, што яшчэ год таму было зародкам хваробы, сёння ўжо прыняло форму эпідэміі. Вулічных маніфестацый не было, але паўсюдна ў касцёлах (апрача як у бацькаўскіх Геранёнах, дзе мудры пробашч Баярынскі падтрымаў майго бацьку) службы заканчваліся спевам "Божа, што ж Польшча", а часам нават і "З дымам пажараў" [46]. Чамаркі сталі амаль што абавязковай вопраткай, а з іншага бока расійская талеранцыя ўсе павялічвалася. Нагадаем тут пра высілкі ў Каралеўстве вялікага Аляксандра Веляпольскага[47], які дабіўся таго, каб застаўся толькі адзін расейскі чыноўнік - вялікі князь Канстанцін.

І без таго нязначная колькасць расейцаў ва ўладных установах яшчэ больш зменшылася. Калі ў Гародні вызваліліся пасады губернатара і віцэ-губернатара, на іх месца прызначылі памешчыка са Свянцянскага павета Хамін-

[42] Граф Міхал Тышкевіч (1828, Валожын -1897, Рым) - падарожнік, калекцыянер, археолаг-аматар.

Падарожнічаў па Егіпце і Нубіі (1861-1862, 1867-1868), вёў раскопкі і збіраў калекцыю антыкварыяту, якая цяпер размеркавана па многіх музеях свету (у тым ліку Парыж, Лондан, Капенгаген, Берлін, Бостан, Рым, Нацыянальны Музей у Варшаве). Аўтар Дзённіка падарожжа ў Егіпет і Нубіі (1861-1862), апублікаванага ў Парыжы ў 1863 годзе. Калекцыянер антычнага мастацтва.

2-гі ардынат Біржанскі (1862-1897), пацверджаны ў званні графа ў Расійскай Імперыі 8 траўня 1861 года.

Яго першай жонкай у 1849 годзе ў Бердзічаве стала княгіня Марыя Радзівіл (1830-1902), дачка князя Мікалая Радзівіла (1801-1853) і Вікторыі Эміліі Нарбут (1800-1855). У мужа і жонкі было два сыны і тры дачкі:

- Граф Юзаф Тышкевіч-Лагойскі (1851 - 1905), 1-я жонка з 1888 года Хелена Лаская (1862-1890), 2-я жонка з 1893 года Ізабэла Эмілія Вераніка Лаская (1859-1944), сястра першай жонкі.
- Граф Ян Антоній Тышкевіч-Лагойскі (19 сакавіка 1852 - 9 чэрвеня 1901), 3-ці ардынат Біржанскі (1897-1901), з 1878 года меў жонку графіню Клемянціну Патоцкую (1856-1921).
- Графіня Ядвіга Тышкевіч-Лагойская (1857-1879), з 1868 года муж - Адольф Марыян Бажэнік-Ялавіцкі (1841-1898).
- Графіня Вікторыя Марыя Тышкевіч-Лагойская (1858 - 4 жніўня 1901), з 1878 года муж граф - Аляксандр Галабек-Язёрскі (1852-1895).
- Графіня Ванда Тышкевіч-Лагойская (1863-1929), з 1883 года муж - Казімір Клеафас Раймунд Сулятыцкі (1854-1925).

Другой жонкай Міхала Тышкевіча ў 1873 годзе стала яго даўняя палюбоўніца, француженка Джульета ле Бо (нар. 1840). Другі шлюб быў бяздзетным. - *Л. Л.*

[43] Дзявотка - празмерна набожная жанчына. - *Л. Л.*

[44] Яшчэ за 30 гадоў да з'яўлення аўтамабіля, з уздымам рэспублікі, недзе ў 1871 годзе карэты а-ля Дамон зніклі з Булонскага лесу.

[45] У 1862 г. пачала працаваць чыгунка Пецярбург-Варшава. - *Л. Л.*

[46] Музыка Юзафа Нікаровіча, словы Карнеля Уейскага. - *Л. Л.*

[47] Аляксандр Ігнацы Веляпольскі (1803-1877), польскі дзяржаўны дзеяч. З лістапада 1861 г. памочнік намесніка Каралеўства Польскага вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча, віцэ-старшыня Дзяржаўнага савета Каралеўства Польскага. Ініцыятар шэрагу ліберальных рэформаў, са жніўня 1863 г. у адстаўцы. - *Л. Л.*

скага і нашага суседа Эміля Умястоўскага. Сёння я маю рэтраспектыўнае меркаванне, зважаючы на старыя традыцыі піцерскай бюракратыі рабіць правакацыі, што гэтая паблажлівасць была наўмыснай, як пазней 9 студзеня 1905 г. і ў сакавіку 1917 г., падчас так званых "крывавых лазняў". Нашы шчырыя і аптымістычныя патрыёты самі лезлі, як мухі на мёд. Дадам, што калі ў 1910 г. у Дзяржаўнай думе разглядаўся праект Сталыпіна аб ліквідацыі фінскай аўтаноміі і русіфікацыі ўсёй фінскай дзяржавы, мой калега Ксаверый Арлоўскі пачуў канец размовы двух саноўнікаў: "Дрэнна тое, што гэтыя фінскія шэльмы маюць халодныя галавы, іх, як палякаў, на паўстанне не падпіхнеш".

Бацька ўсяляк стараўся зрабіць наша знаходжанне ў краі больш прыемным, каб нам падабалася тут больш, чым у Францыі. Ён прыдумаў прывезці да нас у Геранёны на ўвесь адпачынак, віленскага берэйтара пана Лукашэвіча з некалькімі яго добра выдрэсіраванымі канямі. Лукашэвіч, якому тады было 45 гадоў, удзельнічаў у венгерскім паўстанні ў 1848 г. пад кіраўніцтвам Дэмбінскага і Бэма, і таму, верагодна, насіў не чамарку, а так званую венгерку. Ён адразу пачаў праяўляць асаблівую прыязнасць да мяне і называў мяне "паручнікам". Акрамя сваіх манежных коней ён узяў з сабой яшчэ і вельмі прыгожага каня. На раніцы мы рэгулярна і метадычна бралі ўрокі на гэтых манежных конях, а пасля абеду, разам з маёй сястрой, якой было тады 15 гадоў і нашай 18-ці гадовай стрыечнай сястрой Ізабэлай Мікашанкай, якая зачаравала ўсю маладую Вільню сваёй прыгажосцю, мы (я і мой брат на нашых уласных конях) ездзілі на доўгія прагулкі. Сам Лукашэвіч, з заўсёды падвешанай на баку шабляй, ездзіў на згаданым вышэй маладым кані. Праз тыдзень, ён прызнаўся мне, 14-ці гадоваму смаркачу, што конь належыць пану Юзафу Снядэцкаму і што ён аб'езджаны для яго, будучага ротмістра, які сфармуе эскадрон, у якім ён, Лукашэвіч, будзе вахмістрам!

У верасні гэтага года адбылося вяселле адной са шматлікіх гадаванак і адначасова, татавай пляменніцы. Паколькі двор яе маці межаваў з Менскім паветам, быў невялікім і аддаленым для гасцей, бацька вырашыў аддаць яе замуж з Геранёнаў. А паколькі, з-за агульнапрынятай нацыянальнай жалобы немагчыма было танчыць, бацька вырашыў замяніць танцы самадзейным тэатрам. Глядзельную залу і сцэну ён уладкаваў у вялізным новым мураваным амбары, які быў пабудаваны ў стылі парыжскага касцёла св. Магдалены. Зала была ўпрыгожана гірляндамі зеляніны і кіламетрамі рознакаляровай тканіны. Трупа складалася з майго дарослага і вельмі прыгожага брата ў ролі першага каханка, мяне, як першага коміка, Лукашэвіча, як рэзанёра, маёй сястры Марыі і стрыечнай сястры Ізабэлы Мікашанкі (першай, у амплуа наіўніцы, а другой, - какеткі) і бухгалтара немца Шварца які самой прыродай быў асуджаны выконваць гратэскную ролю. Мы сыгралі дзве аднаактавыя камедыі. За выключэннем выфранчанага таты, усе мужчыны былі апранутыя ў разнастайныя патрыятычныя строі: чамаркі, венгеркі, касцюшкаўскія сукманы і г. д. Калі мы ўжо сядалі за вясельную вячэру, прыехаў чацвёркай модных тады таўсталобых коней, верагодна адмыслова для гэтага дачакаўшыся адпаведнага моманту ля брамы, няпрошаны і нечаканы, вялізны, пузаты, размашысты, абсалютна як Заглоба, пан Вільгельм Пратасевіч, слынны ў навагрудскім, лідскім і слуцкім паветах дасціпнік, аўтар гумарыстычных эпічных твораў ... і дармаед[48]. На ім быў белы кунтуш з вылётамі, кармазынавы жупан, слуцкі пояс, саф'янавыя боты, канфедэратка з паўлінавым пяром, бракавала яму толькі карабелі, бо не любяць паслядоўнікі Заглобы нечакана сустрэць паліцыю. Вядома, бацька не вельмі ўзрадаваўся такому праслаўленню Рэчы Паспалітай, але гасціннасць абавязвала не паказваць гэтага, і хутка пан Вільгельм сваім шалёным запалам здолеў загладзіць свой выбрык.

У кастрычніку таго ж 1862 года мы зноў вярнуліся ў Парыж, і я пайшоў у перадапошні клас. Бацька павінен быў прыехаць на Каляды. Французская прэса вельмі цікавілася польскім пытаннем. Князя Адама Чартарыскага ўжо год як не было. На пасадзе "караля партыі" яго змяніў другі сын, князь Уладзіслаў, жанаты з княжной Ампарай, марганатычнай дачкой іспанскай каралевы Крысціны і такім чынам, зводнай сястрой пануючай каралевы Ізабэлы. Нягледзячы на тое, што князь Уладзіслаў атрымаў у спадчыну напаўафіцыйнае становішча свайго бацькі ў свеце, ён не атрымаў у спадчыну ні яго выключнага розуму, ні яго асаблівага вопыту, і гатэль "Ламбер" стаў генеральным штабам партыі "белых" экстрэмістаў, якія адкрыта падштурхоўвалі да паўстання. Традыцыйна на Каляды ў гатэлі "Ламбер" адбыўся дабрачынны вечар[49] на карысць беднай эміграцыі, на ім гандлявалі не толькі польскія, але і шматлікія французскія і замежныя велікасвецкія дамы. Вечар 1862 г., куды мяне адвёз мой бацька, быў выключна прыгожым і карысным.

Прысутнічала на ім, тады яшчэ маладая, не вельмі прыгожая, але абаяльная графіня Марыя, жонка Міхала Тышкевіча (у дзявоцтве Радзівіл), чый муж, каласальнага росту, вельмі прыгожы, эфектны вялікі пан і прафесійны няўдачнік, успадкаваў пасля смерці дзядзькі Яна вялізную ардынацыю Біржы і ўжо спяшаўся пасяліцца ў шыкоўных апартаментах на вуліцы Фобур Анарэ. Тут я часта бавіўся з яго сынамі, маімі аднагодкамі. Гэтым вечары ён купіў у жонкі філіжанку гарбаты і заплаціў за яе дзесяць тысяч франкаў. Натуральна, што ўсе дамы, нават і замежніцы, былі ў жалобе і пра ўваскрэсенне незалежнай Польшчы ад мора да мора, гаварылася з такой жа ўпэўненасцю, як у жніўні 1914 года ў Берліне крычалі: "На Парыж".

*(Працяг у наступным нумары.)*

[48] Гл: Пратасэвіч Вільгельм. Суседчык гавейскі (з прадмовай Юрыя Пацюпы) // Ад Лідскіх муроў. 2019. № 9. С. 6-47. - *Л. Л.*

[49] У тэксце "вента" - такую назву мела ложа карбанарыяў. - *Л. Л.*

*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

### *Раздзел V*

### *Паўстанне 1863 г. Мураўёў. Зняволенне бацькі. Вільня. Каўфман*

У другой палове студзеня, калі ў маіх бацькоў былі госці, прыйшла вестка пра паўстанне 1863 года.

Бацька адразу вырашыў неадкладна вярнуцца дадому, бо праз некалькі тыдняў заканчваўся двухгадовы тэрмін адмены прыгоннага права, а даверанай асобы Юзафа Шалевіча, які мог аднаасобна вырашыць крызіс, ужо не было, ён звольніўся яшчэ мінулай вясной, каб падрыхтаваць два свае фальваркі ў Лідскім павеце. Але маці папрасіла бацьку пачакаць і даведацца, перакінецца гэты пажар на наш край ці не. Хутка перакінуўся, і дзякуючы, з аднаго боку, невычэрпнай дабраце шляхетнага генерал-губернатара Назімава, які не толькі не меў рашучасці падпісаць смяротны прысуд, але нават і саслаць у Сібір, а з другога, дзякуючы раздражняльным прамовам у французскім сенаце князя Напалеона і прэзідэнта Банжана, а таксама дыпламатычным нотам Францыі, Англіі і Аўстрыі, вынік якіх не цяжка было прадбачыць як вартае жалю дыпламатычным фіяска, а таксама дзякуючы і двудушнасці Напалеона III. З-за ўсяго гэтага, яшчэ да вясны, па ўсёй Літве людзі пачалі "сыходзіць у лес". Ноты заходніх краін падштурхнулі Аляксандра II і яго міністра знешніх спраў, славутага Гарчакова, неадкладна і энергічна задушыць паўстанне, каб ўратаваць так званыя заходнія губерні. Калі пачалі шукаць асобу на змену Назімаву, кандыдатам мог бы быць толькі адзін з генерал-ад'ютантаў. Аднак ліберальная плынь, якая панавала ў той час у Расіі, аказалася настолькі моцнай, што ўсе генерал-ад'ютанты, пачынаючы з князя Суворава і князя Пашкевіча-Варшаўскага, заявілі імператару, што не бачаць іншага спосабу супакоіць паўстанне як толькі задаволіць патрабаванні, і пан Анджэй Замойскі ў Парыжы ўжо выказаў гэтыя патрабаванні высокаму саноўніку пану Янахаву (ён пазней сам мне гэта распавёў), якога паслалі туды для гэтай мэты. Адбыўся наступны дыялог: "Але, нарэшце, пан граф, што вы хочаце ад нас?" Адказ: "Allez vousen!" (“Ідзіце прэч!”). Засталіся толькі два кандыдаты, на энергію якіх можна было разлічваць: папярэднік Назімава, стары генерал-ад'ютант Бібікаў (прычыну яго няміласці я назваў вышэй) і не менш стары генерал-ад'ютант Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў[50], якога ўжо ў 1831 г., калі ён быў губернатарам у Гародні, празвалі "вешальнікам".

Два гады таму Мураўёў быў гучна зняты з пасады міністра дзяржаўнай маёмасці з-за самых абуральных злоўжыванняў[51], Герцэн у сваім "Колоколе", які выдаваў-

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[50] Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў (1796-1866), генерал ад інфантэрыі, дзяржаўны дзеяч Расійскай імперыі. Нарадзіўся ў Пецярбургу. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. З 1811 г. на вайсковай службе. Удзельнік войнаў з Напалеонам. Актыўна дзейнічаў у дзекабрысцкіх гуртках. Суаўтар статута "Саюза працвітання". У 1820-я гады адыходзіць ад дзекабрыстаў і становіцца на праімперскія пазіцыі. Быў генерал-губернатарам у Віцебску, займаў іншыя высокія службовыя пасады. Дзейсна ўдзельнічаў у задушэнні нацыянальна-вызвольнага паўстання 1830-1831 гг. Шмат зрабіў для "обрусения" беларускіх земляў. Ініцыятар адмены дзеяння ў заходніх губернях імперыі Статута ВКЛ 1588 г. У знак пратэсту супраць правядзення сялянскай рэформы 1861 г. пакінуў дзяржаўную службу. Але ў сувязі з паўстаннем 1863 г. быў накіраваны генерал-губернатарам у Вільню з надзвычайнымі паўнамоцтвамі. За жорсткае задушэнне паўстання атрымаў ад прагрэсіўных сучаснікаў мянушку "Вешальнік", а ад дзяржавы - тытул графа з прыстаўкай Віленскі. У сваіх "Политических записках" даваў рэкамендацыі ўраду і сваім наступнікам па далейшай палітыцы ў заходніх губернях. З 1865 г. у адстаўцы. - *Л. Л.*

[51] Віленскі доктар Юльян Цітыюс успамінаў сваю размову з віленскім генерал-губернатарам Татлебенам: *"І мяне Мураўёў не любіў. У 1860 г. па яго загадзе (быў ён тады міністрам дзяржаўнай маёмасці) адбылося агульнае выгнанне татараў з Крыма з рабункам іх зямель спекулянтамі і нават самой уладай. Цар Аляксандр II паслаў мяне ў Крым разабрацца з гэтым варварскім для XIX ст. гвалтам. У сваім рапарце я абвінаваціў Мураўёва і напісаў усю праўду". - Л. Л.*

ся ў Лондане і які Аляксандр II штодзень чытаў, апублікаваў рэзкі артыкул пра гэтага Мураўёва і закончыў яго словамі: *"Міхаіл Мікалаевіч, вы - дзяржаўны злодзей"*.

Але Аляксандр, верны традыцыям сваёй дынастыі, палічыў за лепшае даверыць неабмежаваныя правы злодзею, чым дараваць свайму высакароднаму, але ўпартаму слузе (Бібікаву - *Л. Л.*).

У Парыжы мы даведаліся, што першым учынкам новага сатрапа пасля прыезду ў Вільню, быў загад прадставіць спіс арыштаваных у той дзень. У самых першых радках былі ксёндз Ішора, пробашч з Лідскага павета[52], які з амбоны прачытаў сваім парафіянам маніфест так званага Нацыянальнага ўрада і стрыечны брат маёй маці Уладзіслаў Лясковіч[53], 17-гадовы студэнт шляхецкага інстытута, нейкі шпіён падслухаў калі ён, стоячы з паненкай на тратуары, сказаў, што "французы ўжо высадзіліся ў Вержбалова!". На палях паперы, насупраць гэтых прозвішчаў, Мураўёў напісаў: "Расстрелять", - і наступнай раніцай іх абодвух без суда і допыту расстралялі на Лукішскім пляцы.

Гэта толькі ўзмацніла просьбы маці. Мы зноў паехалі ў адпачынак да мора, але з-за неабходнай эканоміі не ў Д'еп, а ў больш танны Жэкам. Руфін Пятроўскі зноў суправаджаў нас.

Увосень, калі сутычкі з паўстанцамі ў Літве цалкам закончыліся, бацька не ўтрымаўся і вярнуўся ў край. Мураўёў, якому ён павінен быў прадставіцца, ведаў, што бацька трымаецца ў баку ад усялякіх дэманстрацый і прыняў яго добразычліва, падоўжыў на год нашы пашпарты і па-здрадніцку параіў неадкладна ехаць у свой маёнтак, чаго бацька асцерагаўся і абачлівыя людзі не раілі рабіць яму гэта з-за страху перад рознымі брыдотамі, якія выдумлялі прыстаўленыя да кожнага павета ваенныя начальнікі, якіх надзялілі дыктатарскімі паўнамоцтвамі, як у ваенны час. Але бацька паехаў, агледзеўся, навёў нейкі парадак і вярнуўся ў Вільню, адкуль вярнуўся ў Геранёны толькі на веснавую сяўбу ў красавіку. Праз некалькі тыдняў ён атрымаў ад начальніка павета палкоўніка Каладзеява ветлівы, але цвёрды ліст, у якім той выказваў жаданне сустрэцца і дзеля гэтага выклікаў яго ў Ашмяны. Бацька, якога душыла наша традыцыйная шляхецкая фанабэрыя, адказаў, што ён пасля сваёй доўгай адсутнасці вельмі заняты і будзе рады сустрэць пана палкоўніка ў Геранёнах. Гэтым сябе і загубіў.

Замест палкоўніка Каладзеява прыбыў жандарскі афіцэр з двума салдатамі, не зводзячы вачэй з падазронага, загадаў спакаваць неабходныя рэчы і павёз з сабой у Ашмяны.

Тут я павінен згадаць прыгожы ўчынак ... яўрэя Янкеля. У спальні майго бацькі меўся вогнетрывалы сейф ад Фішэ з Парыжа з усімі хітрымі замкамі, а ў ім тоўсты гаманец з дзяржаўнымі расійскімі акцыямі на суму каля ста тысяч рублёў. Бацька не страціў розум, калі з дапамогай слугі складаў свае рэчы пад наглядам афіцэра, які, бадай, ніколі ў жыцці не бачыў падобнай касы. Тата не глядзеў на яе, але галасна загадаў слузе, каб паклікаў сюды вельмі адданага яму эканома Радзевіча. Пад гучныя каманды і размовы, бацька прашаптаў: "Адразу прывязіце да мяне ў Ашмяны Янкеля Дудскага".

Уначы падалі нашу брычку і коней, афіцэр сеў каля таты, і яны паехалі ў Ашмяны. Бацька, як звычайна, спыніўся ў карчме ў Янкеля Бакшта, у якой у 1812 годзе разам з ротмістрам Вансовічам начаваў сам Напалеон, калі ўцякаў са Смаргоні. Перад уваходам паставілі варту і загадалі не пакідаць карчму, пакуль тата не сустрэнецца з палкоўнікам Каладзеявым. Убачыў яго толькі праз тыдзень.

Янкель Дудскі з'явіўся ўжо на раніцы. На працягу 20 гадоў разам са сваім партнёрам Маркелем ён быў у майго бацькі манапалістам усяго гандлю збожжам, ільном і г.д., і заўсёды паводзіў сябе сумленна. Баючыся, што ў кожную гадзіну маскоўскія чыноўнікі завалодаюць Геранёнамі і асабліва сейфам, бацька хутка загадаў Янкелю: "Вяртайся ў Геранёны, ідзі з гэтым ключом у маю спальню. Наставіўшы шыфр-слова, адкрый сейф. У ім знойдзеш партфель, у якім сто тысяч працэнтных каштоўных папер, неўзабаве гэтыя паперы могуць каштаваць, як увесь мой маёнтак. Завязеш партфель да маршалка Яна Лубанскага ў Вілейскі павет, аддасі яму на захаванне як дэпазіт да далейшага майго ці маёй жонкі распараджэння і прывязеш мне адказ". Янкель апрануўся ў дарогу у самую сціплую вопратку, як жабрак, едучы з вёскі да вёскі на нанятых сялянскіх павозках, патрапіў да пана Лубанскага, перадаў дэпазіт і прывёз адказ майму бацьку. Усё зрабіў вельмі добра.

Але праз дзясятак-другі гадоў ён купіў у мяне вялікую партыю льну і скарыстаўся маёй адсутнасцю. Прымаючы тавар, самым ганебным чынам, прыкладна на 300 рублёў ашукаў майго дурнога эканома. Калі я вярнуўся і заўважыў гэтае свавольства, то спытаўся ў Янкеля: "Як мог чалавек, які ў 1863 г. меў гонар у адносінах з маім бацькам, цяпер учыніць такое жаласнае махлярства ў адносінах да мяне?". Янкель адказаў вельмі спакойна: "Ясны пан няслушна мае да мяне прэтэнзіі. Тады стары пан, хай пан Бог падоўжыць яго гады, звярнуўся да мяне не як да гандляра, а як да чалавека, як да сябра, бо такія ў нас ужо былі з ім адносіны. Каб я злоўжыў яго даверам, я быў бы апошнім з апошніх. А Ясны пан, калі прадаваў мне лён, меў справу не з сябрам, а з купцом, і для мяне

[52] У ліку першых пакаранне смерцю атрымаў ксёндз Станіслаў Ішора, вікары парафіі ў Жалудку. Ксёндз прачытаў у касцёле паўстанчы маніфест і сам здаўся ўладам. Ён быў асуджаны ў Вільні на 5 гадоў катаргі, нягледзячы на амністыю тых, хто сам здасца ўладам. Генерал-губернатар Назімаў змякчыў пакаранне да 5 гадоў высылкі. На няшчасце, 26 траўня ў Вільню прыбыў новы генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў і замяніў прыгавор карай смерці. 3 чэрвеня (22.05) 1863 года ксёндз Ішора быў расстраляны на Лукішках і стаўся першай ахвярай Мураўёва ў Вільні. - *Л.Л.*

[53] Гл. пра яго вышэй. - *Л. Л.*





ён быў толькі прадавец, які займаецца сваёй справай, а купец займаецца сваёй. А што пан узяў сабе дурнога эканома, то гэта яго бяда".... і закрыў мне рот.

Калі палкоўнік нарэшце "ласкава" паклікаў да сябе майго бацьку, сутнасць справы высветлілася. Адразу ж пасля нашага прыезду, Мураўёў, нібыта для палягчэння ваенных дзеянняў і магчымасці прымянення артылерыі, загадаў даволі густа высекчы ва ўсіх лясах лініі-прасекі, сляды якіх відаць і сёння, і вырашыў, што гаспадар для гэтага альбо заплаціць сялянам за іх працу па каштарысу павятовага кіраўніка і прадасць лес, як хоча, або не будзе плаціць нічога за працу, а сяляне бясплатна возьмуць сабе спілаванае дрэва. Яшчэ да вяртання майго бацькі з Парыжа, нашы сяляне з ведама ўладаў вычысцілі ўсё дрэва, але пан Каладзееў захацеў дамагчыся ад майго бацькі грошай, роўных кошту працы, якую ён вылічыў у адзінаццаць тысяч рублёў, вядома, каб бясследна пакласці сабе ў кішэню. Бацька быў занадта ўпэўнены ў сабе, трохі заядлы і грунтуючыся на парадзе самога Мураўёва спакойна ехаць у вёску, адмовіўся даць грошы. Пачалося "дело". Камандзір нейкага партызанскага атрада Віславух прабіраўся праз лясы з Царства Польскага ў бок паўночнай пруска-расійскай мяжы і хацеў на пароме пераправіцца цераз Бярэзіну[54]. Паром знаходзіўся ў лугамоўскім фальварку, які таксама меў назву Бярэзіна. Тут ён затрымаўся на некалькі гадзін і загадаў арандатарцы Рубін даць, колькі можа, хлеба, масла і смятаны.

У дужках дадам, што ні ў чым іншым сістэма "хаджэння з паходняй каля страхі роднай хаты" не праявілася так выразна, як у арганізацыі Варшаўскім рэвалюцыйным камітэтам ўзброенага паўстання ў нашым краі. З ваеннага боку, гэта было нешта жаласна-дзіцячае. Там, дзе пачыналася сутычка, паўстанцы, узброеныя толькі паляўнічай зброяй з боем на адлегласць 120 крокаў, без страт расстрэльваліся бяспечнымі жаўнерамі, стралковая зброя якіх магла цэліць на адлегласць больш за 300 крокаў. Адно вядома: колькасць жаўнераў, забітых на палях ў Літве не раўнялася нават траціне павешаных ці расстраляных мяс-цовых (адначасова, толькі ў адной Ашмяне было павеша-на сямёра, і гэта ў той час, калі па ўсім павеце не было чуваць ніводнага стрэлу)[55].

Але ж было б несправядліва вінаваціць сапраўдных лідараў гэтага руху ў "глупстве".

Не-не, гэта нешта зусім іншае. Нездарма Здановіч, студэнт з Пецярбурга, сын ваеннага доктара, які мала валодаў польскай мовай і якога я сустрэў у генеральскім мундзіры пасля смерці майго сына, быў адным з галоўных арганізатараў паўстання ў Вільні. Калі пасля яго прысуду на смерць, старшыня ваеннага суда спытаў, як ён, такі разумны чалавек (а ён быў такім), мог гэтак памыляцца адносна перспектыў поспеху паўстання, Здановіч спакойна адказаў: "Я бачу, што пан палкоўнік цалкам не разумее маіх мэтаў, я не памыляюся, і мая праца не марная. Лепш, чым мог я сам, яе даробіць мой спадчыннік ... Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў" [56].

А ў нашай справе вельмі прыгожа паказалі сябе яўрэйка і праваслаўны поп. У турме Рубін пасадзілі ў асобную камеру і сказалі, што яна не выйдзе, пакуль не прызнаецца, што мой бацька перад ад'ездам за мяжу (за 6 тыдняў да выбуху студзеньскага паўстання) загадаў ёй шчодра прыняць паўстанцаў. Рубін была цяжарнай. Кожны дзень ёй пагражалі, што калі яна народзіць, дык дзіця ў яе забяруць і хрысцяць у праваслаўнай царкве. Яна нарадзіла дачку Рохлю і, нягледзячы на штодзённыя пагрозы, да самага вызвалення майго бацькі трымалася на сваім - што паўстанцы гвалтам адабралі ў яе хлеб і малочныя прадукты.

Паколькі праваслаўнае мястэчка Мікалаева на Нёмане мяжуе з Лугамовічамі, Каладзееў паслаў урадніка да мікалаеўскага святара Пратасевіча, заклятага п'яніцы, але вельмі годнага чалавека, каб той загадаў мікалаеўскім сялянам пад прысягай засведчыць, што мой бацька пераконваў іх пры з'яўленні паўстанцаў аказваць ім усялякую дапамогу. Пратасевіч паклікаў сялян да афіцэра і сказаў ім жорсткую пропаведзь, у якой нагадаў сялянам пра важнасць прысягі і пагражаў усімі царкоўнымі пакутамі, калі яны будуць сведчыць што-небудзь, акрамя праўды. Тады сяляне ў адзін голас засведчылі, што ніхто з іх не бачыў майго бацьку ужо некалькі гадоў. Пратасевіча арыштавалі на месцы, адвезлі ў Вільню, меліся выслаць у Сібір, але архіепіскап Сямашка (галоўны ў справе скасавання уніі) нейкім чынам выратаваў яго.

Не маючы магчымасці абгрунтаваць жаданы прысуд, Каладзееў у верасні адправіў бацьку ў Вільню, ў перароблены пад турму дамініканскі кляштар, прызначаны для нібыта небяспечных вязняў. Менш важныя сядзелі ў кляштары францысканцаў.

Тым часам мы з братам у жніўні здалі іспыт сталасці (baccalaureat es lettres) і ўжо без гувернёра чакалі ў Д'епе вырашэння свайго лёсу. Каля 1 кастрычніка мая маці атрымала паведамленне з расійскай амбасады, што хоць тэрміны яе і нашых пашпартоў яшчэ не скончыліся, але згодна з спецыяльным распараджэннем Мураўёва, яна з дзецьмі, на працягу васьмі дзён павінна з'явіцца ў Вільні, калі не з'явіцца - будзе лічыцца эмігранткай і яе маёнткі, якія складалі большую частку сямейнай маёмасці, будуць канфіскаваны. Мы вярнуліся ў Вільню роўна праз два гады пасля таго, як яе пакінулі.

У асноўным з-за чыноўнікаў, горад было ўжо не

[54] Гаворка ідзе не пра ўсходнюю, напалеонаўскую Бярэзіну, якая ўпадае ў Днепр, а пра заходнюю, значна карацейшую, але караблеходную, якая ўпадае ў Нёман.

[56] Тут Корвін-Мілеўскі пацвярджае думку свайго палітычнага антаганіста К. Каліноўскага, які казаў: "Дурным варшаўскім мазгаўням нельга давяраць лёс Літвы …". - *Л. Л.*

[56] Ён меў рацыю. Ён і яго прыхільнікі, якія падштурхнулі нашу наіўную шляхту да ўзброенай барацьбы, наогул не думалі пра перамогу. Справа ішла пра тое, каб памерці. Гэта была агульная мэта і Здановіча, і Мураўёва.

пазнаць. За некалькі месяцаў Мураўёў здолеў, за выключэннем бедных "вольнонаёмных" пісараў, якія атрымлівалі па тры рублі ў месяц плюс хабар, замяніць усіх мясцовых чыноўнікаў на подлую сволач, пра якасць якой здагадацца не цяжка і пры гэтым добрую палову з іх складалі "нігілісты". Усе яны прыехалі цэлымі эшалонамі, атрымалі ў канцылярыі спіс вакантных пасад і ў нядзелю раніцай запоўнілі вялізную бальную залу палаца генерал-губернатара. Сатрап сказаў некалькі слоў і са спісам у руках пачаў раздаваць "манну нябесную". Адбываліся камічныя дыялогі. Пра адзін з іх памяталі яшчэ і праз дзесяць гадоў.

Выцягнуўшыся, стаіць герой з фіялетавым носам. Падыходзіць сатрап:

- Ты, што хочаш?
- Месца, Ваша правасхадзіцельства!
- Якога?
- Казначэя ў Вількаміры.
- Ты служыў?
- Я служыў, Ваша правасхадзіцельства!
- У якім напрамку?
- Інжынерам.
- За што прагналі?
- Я упаў, Ваша правасхадзіцельства!
- На роўным месцы?
- На роўным, Ваша правасхадзіцельства!
- Касірам не годны, будзеш суддзёй у Ашмянах.
І ён стаў суддзёй[57].

Мы пасяліліся ў толькі што адчыненым яўрэем Левянсонам "Еўрапейскім" гатэлі, які як быццам, быў арганізаваны ў еўрапейскім стылі, г. зн. меў пасцелі, бялізну, газавае асвятленне. Паўсюдна было поўна расейцаў як ваенных, так і цывільных, на вуліцах патрулі. Пасля заходу сонца нельга выйсці без ліхтара ў руках і пропуска ў кішэні. Арыштаў па найменшым падазрэннях больш не было, экзекуцый таксама, бо ўвесь "матэрыял" ужо быў вычарпаны. Толькі па некалькі разоў на тыдзень збіраліся натоўпы людзей усіх станаў, і іх без суда высылалі ў Сібір. Між імі было шмат жмудскіх сялян, большасць з іх не разумела польскай мовы [...].

Маці адразу пайшла да губернскага маршалка шляхты Аляксандра Дамейкі, вялікага сябра і паклонніка майго бацькі. Ён вельмі цёпла прыняў нас і рупліва заняўся нашымі праблемамі. Увесь першы месяц мы праводзілі вечары ў яго разам з цікавым у сваім родзе чалавекам, панам Рэйнгольдам Тызенгаўзам, найбагацейшым пасля смерці Яна Тышкевіча чалавекам Літвы, вялікім арыгіналам, пра якога я яшчэ згадаю. Дамейка, ужо 60-гадовы, невысокі, пульхны дзядок, у тыя часы шмат у чым не быў на вышыні свайго становішча. Падчас апошніх перад паўстаннем выбараў, шляхта выбрала яго як "шчасце", галоўным чынам, каб не абраць непапулярнага князя Ірэнія Агінскага, не толькі з-за таго, што дзякуючы яго жонцы, апошняй з вялікага роду Каліноўскіх, былой фрэйліны імператрыцы, якую кахаў сам малады Аляксандр II, Агінскі меў у Пецярбургу ўнікальнае становішча, але і таму, што ён быў князем, чалавекам багатым, з вытанчанымі манерамі і даволі шырокай адукацыяй.

Ад самога Дамейкі я даведаўся пра падрабязнасці нападу, учыненага на яго год таму. Неўзабаве пасля прыбыцця ў Вільню, Мураўёў запатрабаваў ад Дамейкі, а таксама ўсіх павятовых маршалкаў і іншых вядомых памешчыкаў, падпісаць зварот аб капітуляцыі як адказ на дыпламатычныя ноты заходніх краін. Нягледзячы на пагрозу з Варшавы, што калі Дамейка падпіша зварот, дык будзе забіты, ён, жадаючы засцерагчы сябе і шляхту ад масавай ссылкі ў Сібір (гэта тычылася не толькі тых нешматлікіх, хто не падпісаў зварот), падпісаў сам і намаўляў да гэтага іншых. Аднак не прыняў паліцэйскую ахову, прапанаваную яму Мураўёвым. Праз некалькі дзён у перадпакой увайшоў малады чалавек, гвалтам уварваўся ў сталовую, дзе сядзеў Дамейка, лёгка ўдарыў яго кінжалам у плячо і цяжка параніў слугу, які спрабаваў яго абяззброіць - нанёс два ўдары нажом, пасля чаго ўцёк.

На першым жа допыце гэты слуга больш-менш апісаў знешнасць забойцы, у тым ліку і тое, што ў яго былі чорныя валасы і блакітныя вочы. Таму штодзень, пераважна на чыгуначным вакзале, лапалі ўсіх, хто больш-менш адпавядаў апісанню (бо сумленны Дамейка адбрэхваўся тым, што ад болю страціў прытомнасць і нічога не памятае). Затрыманых паказвалі слузе, які па загадзе свайго гаспадара нікога не пазнаваў, але тым не менш, кожны дзень аднаго са злапаных вешалі. Сапраўднага злачынца выпадкова схапілі на чыгунцы толькі праз тыдзень. Магчыма, каб спыніць гэтую расправу над нявіннымі, ён прызнаўся ў сваім злачынстве, яго пазнаў слуга, і экзекуцыі пасля гэтага закончыліся.

Галоўнае для нас было - убачыць бацьку. З гэтай мэтай мы паехалі да Аляксандра Львовіча Патапава[58], толькі што прысланага з Пецярбурга ў якасці памочніка

[57] Мой с. п. бацька здолеў падбіць гэту птушку. Праз некалькі гадоў, як зарэгістраваны апякун, дарада і абаронца ўсіх бедных шляхціцаў у павеце, ён звярнуўся ў суд, каб пасля ссылкі спагнаць для ўдавы належную ёй суму, якая захоўвалася ў судзе. Выбег суддзя, ужо стомлены "хваробай" і з пахам гарэлкі за дваццаць крокаў. "Пан суддзя, гэта бедная кабета памірае з голаду". "Вы ўсе, быццам, паміраеце з голаду". Бацька, салодка: "А можа з недапітку?". Каб сказаць якую грубасць, суддзя разявіў сваю вялізную дзюбу, але хлынула кроў і запэцкала бацькаву камізэльку. Увечары суддзя аддаў Богу душу.

[58] Патапаў Аляксандр Львовіч (1818-1886), генерал-ад'ютант, на пачатку 1860-х гг. обер-паліцмайстар Масквы, начальнік штаба корпуса жандараў і кіраўнік III аддзялення. З 1864 г. памочнік віленскага генерал-губернатара, з 1868 г. генерал-губернатар. - *Л. Л.*

генерал-губернатара, напэўна, каб уціхамірыць дзікія схільнасці Мураўёва. Патапаў, генерал світы цара, быў вельмі маленькага росту, але элегантны і тыповы рускі "барин". З прыемнасцю прыняў маці і нас, размаўляў выключна па-французску. Дурыў нам галаву пра "вяршэнства права", але назаўтра даслаў для нам дазвол наведаць вязня ў дамініканаў.

Мы знайшлі, што наш бацька вонкава вельмі змяніўся і моцна пастарэў за год, які мы яго не бачылі. Трымалі яго ў маленькай, але чыстай кляштарнай келлі, якую ён дзяліў са старым эмігрантам 1831 г. князем Мірскім, прысланым ад Парыжскага камітэта, у камітэт ўваходзіла шмат маладых людзей, якія маглі б быць Мірскаму сынамі, але пры гэтым вельмі цанілі сваю ўласную скуру. Вязні на дваіх мелі рускага, так званага дзеншчыка ці ардынарца, які прасіў бацьку, каб ён, калі яго будуць весці на шыбеніцу, аддаў свой прыгожы і залаты гадзіннік з рэпетытарам. Тады дзяншчык закажа па бацьку ўрачыстую "паніхіду". Нягледзячы на тое, што бацька сядзеў за кратамі больш за месяц, яго яшчэ ніхто не выклікаў на допыт, і таму ён не ведаў, што яму інкрымінуюць. Мы зноў пайшлі да Патапава і прасілі хаця б даць магчымасць падазраванаму скласці свае тлумачэнні пра інкрымінаваныя яму злачынствы. Патапаў сам пайшоў у турму, абышоў усе келлі і цярпліва выслухаў бацьку. Потым, па яго просьбе, загадаў выдаць чарніліцу, пяро, шмат паперы і, галоўнае, усё "дело" ў 300 старонак, якое Каладзееў даслаў з Ашмян. Бацька падрабязна адказаў на ўсе абвінавачванні. Праз тыдзень пасля гэтага яго выклікалі ў следчую камісію пад старшынствам палкоўніка Лосева і пасля вельмі кароткага допыту ў той жа дзень адпусцілі. Як высветлілася, на гэтае хуткае рашэнне ў значнай ступені паўплываў наступны выпадак: адначасова з бацькам, хоць ён пра гэта і не ведаў, акрамя сапраўды глыбока скампраметаванага Гейштара з Коўні, А. Аскеркі, Эдварда Чапскага і іншых, неўзабаве высланых ва ўсходнюю Сібір, быў арыштаваны яго добры сябар пан Канстанцін Кашыц[59] , жанаты з прыгажуняй Несялоўскай, заможны землеўладальнік Лідскага і Навагрудскага паветаў, нібыта начальнік нібыта цывільнага кіравання аднаго з гэтых двух паветаў. Пад пагрозай шыбеніцы, ён адразу растаў, як масла на сонцы і прызнаўся не толькі ва ўсім, але і пра ўсіх. Калі дайшла чарга да майго бацькі, Кашыц на пытанне, якія ў яго адносіны з панам Аскерам Корвін-Мілеўскім і што ён ведае пра яго палітычную дзейнасць, зароў, як бабёр: "Калі б я паслухаў гэтага мудрага чалавека, я б не быў тут!". Ён расказаў, што неўзабаве пасля вяртання майго бацькі з-за мяжы, яны абодва ў яго гатэльных апартаментах пачалі дарагую гульню ў прэферанс. Было ўжо каля поўначы, калі нумарны чалавек прынёс Кашыцу запячатаны ліст. Прачытаўшы яго, ён паклаў на стол ужо раздадзеныя карты, паабяцаў вярнуцца і выйшаў. Вярнуўся толькі праз некалькі гадзін: "Пан Канстанты, я занадта добра ведаю цябе і тваё каханне да прыгожай жонкі, каб падумаць, што ты кінуў нашу паважную партыю дзеля нейкай красуні. Ні аб чым цябе не пытаю, але мне ясна, што ты дазволіў уцягнуць сябе ў нейкую інтрыгу палітычнага характару", і выразна растлумачыў, што справа безнадзейная і што Кашыц можа толькі знішчыць сябе, сваю сям'ю і свой край, але не мае магчымасці зрабіць нешта карыснае.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[59] Канстанцін Ян Казімір Яўстах Кашыц (23.3.1819-1881), сын Юзафа і Соф'і Дунін-Раецкай. Меў братоў Юлюша і Караля і быў жанаты з Юліяй Несялоўскай (1830 г. н.). Бацька Кашыца прымаў удзел у кампаніі 1812-1814 гг. на баку Напалеона, быў афіцэрам 17-га ўланскага палка. Пасля заканчэння вайны ён на тры гады выехаў за мяжу для працягу адукацыі, пасля чаго вярнуўся і пасяліўся ў маёнтку Ятра Навагрудскага павета. У 1830 г. Юзаф Кашыц быў абраны навагрудскім маршалкам. Падчас паўстання 1831 г. быў арганізатарам выступлення ў Навагрудскім і Слонімскім паветах, стварыў у сваім маёнтку асобны атрад, які ў ліпені 1831 г. налічваў каля 1 тысячы чалавек. Пасля паразы паўстання 1831 г. Канстанцін Кашыц разам з бацькам апынуўся ў эміграцыі ў Францыі - 26 кастрычніка 1831 г. яны прыбылі ў Парыж. У 1838-1842 гг. Канстанцін Кашыц у Дэрпцкім універсітэце вывучаў дыпламатыку. Кандыдат дыпламатычных навук, быў членам мясцовай арганізацыі "Палонія". У матэрыялах "Палоніі" праходзіць інфармацыя, што Кашыц меў дачыненне да справы Шымана Канарскага, аднак у іншых крыніцах гэты факт пацверджання не знаходзіць.

Канстанцін Кашыц вызначаўся незвычайнымі здольнасцямі, а асабліва рэзкім словам і вострым пяром. У 1850-х гг., калі былі яшчэ дзейныя шляхецкія соймікі, слушнымі жартамі і эпіграмамі моцна дакучаў павятовым і губернскім чынам, праз што нарываўся на прычэпкі з іх боку. Пра аднаго такога саноўніка, які, пішучы ліст да знаёмага, слова "аўторак" ("wtorek") напісаў праз ф - "афторак" ("ftorek"), за што быў празваны "пан Афторак" ("pan Ftorek") - склаў некалькі вершаваных сатыр пад назвамі: "Загадка", "Крыжык", "Дагератып", "Пастка на крэскі (сеймікавыя галасы ці воты)" і г. д.

У паўстанні 1863 г. Кашыц выконваў абавязкі цывільнага кіраўніка па Навагрудскім павеце, аднак выступаў супраць пашырэння паўстання. Пазней ён сцвярджаў, што пагадзіўся на кіраўніцтва з мэтай нейтралізаваць актыўнасць прыхільнікаў узброенага выступлення. 20 красавіка 1863 г. Кашыц адмовіўся ад выканання сваіх абавязкаў і выехаў у Рыгу, затым у Пецярбург і далей у Менск. 17 чэрвеня 1864 г. ён быў арыштаваны і падчас допыту 30 ліпеня 1864 г. даў поўныя і шчырыя паказанні, па выніках якіх былі раскрыты шэраг членаў і дзеянні навагрудскай паўстанцкай арганізацыі. Рашэннем часовага палявога суда ў Вільні Кашыц быў прысуджаны да смяротнага пакарання, аднак гэтае рашэнне перагледзеў М. Мураўёў і па канфірмацыі ад 15 студзеня 1864 г. "за заслугі перад следствам" ён быў пакараны ссылкай у Казанскую губерню з утрыманнем пад пільным паліцэйскім наглядам. - *Л. Л.*





***Гіпаліт Корвін-Мілеўскі***

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Нягледзячы на гэта, апраўданне бацькі было толькі частковым і не датычыла матэрыяльнага боку. Бацька быў інтэрнаваны ў Вільні без права выезду. Адзінаццаць тысяч рублёў за высечку лесу ён павінен быў заплаціць, але ўжо не беднаму палкоўніку Каладзеяву, а ў касу не больш добранадзейнага генерал-губернатара. Секвестр маёмасці, які быў накладзены яшчэ падчас знаходжання бацькі ў Ашмянах, быў зняты, але коштам вялізнай кантрыбуцыі, нібы на адміністрацыйныя выдаткі. Геранёнская рухомасць аказалася некранутай, акрамя піўніцы, у якой не засталося ніводнай поўнай бутэлькі, і адзінаццаці службоўцаў маёнтка, якіх арыштавалі адначасова з бацькам і, нягледзячы на яго апраўданне, выслалі ў Сібір як матэрыял для каланізацыі. Каля 10 гадоў бацька ўтрымліваў іх там за свой кошт, пакуль тым, хто застаўся ў жывых, не дазволілі вярнуцца.

Праз некалькі тыдняў пасля вызвалення, позна ўвечары прыехаў мясцовы паліцыянт з загадам майму бацьку на працягу 24 гадзінаў заплаціць тысячу рублёў штрафу "за самавольную пабудову каталіцкага касцёла з праваслаўнага камення". Гаворка ішла пра вялікую і прыгожую капліцу, якую яшчэ перад паўстаннем мой тата пабудаваў у сваім спадчынным маёнтку ў Цыціне на магіле свайго бацькі, папярэдне прыбраўшы драўляную і гнілую, старую капліцу. Не прайшлі і 24 гадзіны, як бацька ўжо меў усе патрэбныя паперы з неабходнымі на той час дазволамі і што "праваслаўнымі камянямі" быў адзіны нагробак праваслаўнага селяніна, які знаходзіўся на лініі новага падмурку і з-за павагі да нябожчыка, яго ўмуравалі ў сцяну так, каб быў бачны надпіс. Паколькі бацька ўдала выкруціўся з аплаты адміністрацыйных выдаткаў за маёнтак Лугамовічы, які быў выключнай уласнасцю маёй неангажаванай маці, Мураўёў вырашыў: "Мілеўскі занадта разумны, нельга яму дараваць усе штрафы", - і загадаў, каб былі выплачаны ўсе грошы.

Адразу пасля прыезду я, поўны радасцю 16-ці гадовага сэрца, паляцеў да свайго сябра з 1862 г. "вахмістра польскіх войскаў" Лукашэвіча. Знайшоў яго ў той самай венгерцы, але парваныя аксельбанты былі заменены на форменныя гузікі, на галаве - шапка чыноўніка з зоркай і мундзір адміністрацыі дзяржаўных стайняў. Мой вялікі сябар, мой партнёр у хатніх пастаноўках, вітаючыся са мной, называў мяне ўжо не паручнікам, а Гіпалітам Аскаравічам, бо ў сваім манежы даваў урокі верхавой язды пану Азнабішыну, прызначанаму ўрадам маршалкам шляхты. Гэта было маё першае расчараванне ў шчырасці чалавечай душы, але далёка не апошняе.

На наступны дзень пасля выхаду з турмы мой бацька сустрэў ля Вострай брамы другога героя той памятнай сустрэчы ў Геранёнах, пана Вільгельма Пратасевіча. Ён таксама насіў шапку чыноўніка з зоркай, бацька агледзеўся, убачыў, што на вуліцы нікога няма ні справа, ні злева, і тады бязлітасна спытаў: "Пан Вільгельм! А дзе ж той белы кунтуш, той слуцкі пояс, тыя саф'янавыя боты і тая канфедэратка?". Заглоба збялеў, як швейцарскі сыр, і, не развітаўшыся, уцёк.

Першым клопатам вызваленага бацькі было, што рабіць з двума сынамі, якія толькі што скончылі гімназію, ды яшчэ і за мяжой? Майму брату было 19, а мне толькі што споўнілася 17, і на гэтым мая вучоба не магла скончыцца. Калі мяне спыталі, я сказаў бацьку, што (ён і сам так лічыў) трэба думаць пра ўласны кавалак хлеба ў будучыні, а паколькі ўсё паказвала на пачатак чыгуначна-тэхнічнай ліхаманкі ў Расіі, я прасіў яго неадкладна адправіць мяне да пана Кузіна, каб я мог коштам яшчэ аднаго ці максімум двух гадоў здаць на "бакалаўра" па матэматыцы і прыродазнаўстве і паступіць у Цэнтральную школу, тады ў 20 гадоў я адразу стану інжынерам. Бацька пагадзіўся, але не пагадзіўся Мураўёў. Калі генерал Патапаў, які ўзяў майго бацьку пад сваю абарону, папрасіў выдаць мне пашпарт, сатрап цвёрда адказаў: "Не, я не дам пашпарт ні яму, ні яго брату да 20 гадоў, вызначаных законам. Яны дастаткова вывучылі французскую мову, няхай зараз вывучаюць матчыну расейскую мову".

І давялося вучыць. Нам узялі настаўніка пана Радзевіча. Не ведаю, чаму з 14 траўня 1926 г., калі нашчадкі караля Баторыя (далёкія) і канцлера Замойскага так ветліва з'ехалі па загадзе энергічнага "рызыкоўніка" [60], я не магу забыць першага верша, які мне прадыктаваў тады пан

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[60] Маецца на ўвазе так званы травенскі пераварот, здзейснены ў Польшчы Пілсудскім. - *Л. Л.*

Радзевіч. Як і многія, здавалася б, пустыя рэчы, верш не пазбаўлены глыбокай думкі, і я павінен запісаць тут яго ў надзеі, што гэтыя радкі больш не будуць мяне пераследаваць. Вось яны:

"Все мое", - сказало злато;
"Все мое", - сказал булат.
"Все куплю", - сказало злато;
"Все возьму", - сказал булат.

Адначасова бацька ўвёў нас у віленскі "свет". Ён ужо не быў такім, якім быў да 1861 года, калі, з аднаго боку, высокі дабрабыт вышэйзгаданага старога і новага літоўскага патрыцыяту, а з другога боку, цяжкасці зносін з Варшавай і Пецярбургам, а тым больш з замежжам, рабілі з Вільні сапраўдную сталіцу. Мураўёўскі тэрор, эканамічны крызіс, выкліканы вызваленнем сялян, кантрыбуцыі і г. д. ужо моцна даваліся ў знакі. Таму скарацілася колькасць дамоў, дзе яшчэ прытрымліваліся вельмі старога звычаю штовечар прымаць у сябе ўсіх знаёмых без усялякіх запрашэнняў, і таму малады чалавек мог кожны дзень праводзіць прыемныя вечары ў розных месцах, вядома, не без картачнага стала для больш сталых гасцей. Першым домам, куды мяне прывёў бацька, быў дом старога (яму тады павінна было быць не менш за 80 гадоў) князя Канстанты Радзівіла, трэці раз жанатага з Карніцкай. Валодаў ён двума вялікімі маёнткамі - Паланечка ў Наваградскім павеце і Тавяны ў Вількамірскім павеце Ковенскай губерні. Паходзіў з найменш заможнай з пяці радзівілаўскіх галін, якія ў XVI ст. адгалінаваліся ад князя Радзівіла-Сіроткі. Таму ў нашай гісторыі яны адыгралі менш значную ролю, чым іншыя чатыры галіны, і, насамрэч, належалі не да магнатаў ("каралевічаў" [61]), а толькі да кармазынавага патрыцыяту, пра які я пісаў вышэй.

Яго старэйшая дачка (ад другой жонкі Сулістроўскай), жонка князя Эдвіна Друцкага-Любецкага, ужо памерла. Ад трэцяй жонкі меў пяць сыноў і трох дачок, якія тады з-за тэрору туліліся ў бацькі. Старэйшы, князь Мікалай, меў ужо больш за трыццаць гадоў, быў вельмі дасціпны, арыгінальны як па сваёй знешнасці, гэтак і па паводзінах. Ён лічыў, што Радзівіл не можа не быць "арыгіналам", часта капрызнічаў і заўсёды быў агідна п'яным. Значна пазней ажаніўся з заможнай старой паннай Бяніслаўскай з Інфлянтаў і там затрымаўся. Другі сын, князь Мацей, вельмі хуткі, граў ролю старшага ў сям'і. Праз некалькі гадоў ён ажаніўся з багатай графіняй Красінскай, пасяліўся ў Варшаве, і яго больш не бачылі ў Вільні. Тры малодшыя сыны - Караль, Канстанты і Дамінік яшчэ насілі мундзіры гімназій, а дочкі яшчэ хадзілі ў паннах. Гэта быў тыповы дом патрыцыяў.

Дом старога пана Рафала Слізня з жонкай Камілай з Лагойскіх Тышкевічаў (роднай цёткай Ізы Тышкевіч з Вакі). Раней, на асамблеях часоў Аляксандра I прыгожая панна Каміла Тышкевіч рабіла фурор[62]. Яны мелі чатырох дарослых сыноў і дзве дачкі, якія зачароўвалі мужчынскія сэрцы: старэйшая панна Рыта сваёй дасціпнасцю, а малодшая панна Марыэта - прыгажосцю. Першая стала кананічкай[63], другая - пані Дамейкай.

Я казаў ужо пра губернскага маршалка пана Аляксандра Дамейку.

Штотыдзень прымала, на пачатку без танцаў, а праз два гады з танцамі, пані Грабоўская[64], удава вельмі заможнага абшарніка з Лідскага павета. Па паходжанні - зусім сціплая шляхцянка, яна захавала свае парафіяльныя манеры, курыла не цыгарэты, а люльку на доўгай трубцы і таму аддавала перавагу менш элегантнаму таварыству, чым тое, якое збіралася ў дамах, якія я наведваў. Маці адзінага сына Станіслава, спачатку ўпартага земляроба, а потым, праз 40 гадоў, упартага парыжаніна, які, старым халасцяком памёр у Парыжы ў канцы Сусветнай вайны, і чатырох дачок - старэйшая ў 1865 г. выйшла замуж за згаданага вышэй пана Аляксандра Аскерку, а пасля таго, як яго выслалі ў Сібір, суправаджала мужа туды і памерла; тры малодшыя - Касыльда (Канстанцыя - *Л. Л.*), Францішка і Марыя - выйшлі замуж на Сымона Скірмунта, дзядзьку сучаснага пасла ў Лондане, Верашчаку (пляменніка Міцкевічавай Марылі) і Баляслава Важынскага, які таксама быў з Лідскага павета, блізкага сваяка маёй маці[65].

У гэты час у Вільні жыў пан Ян Лубанскі, незадоўга да паўстання - маршалак ашмянскі. Равеснік і з дзяцінства блізкі сябар майго бацькі, жанаты з Сулістроўскай, якая ў той час была яшчэ вельмі прыгожай. Абодва яны былі

[61] "Каралевічы, ці мясцовыя каралі" ("krolewieta kresowi") - у гістарычных публікацыях (асабліва навукова-папулярных) гэта тэрмін для абазначэння магнатаў, якія валодалі вялікімі маёнткамі (латыфундыямі) ва ўсходнім памежжы былой Рэчы Паспалітай, мелі неабмежаваную ўладу і ўласныя войскі, часта праводзілі ўласную знешнюю палітыку, а таксама былі звязаны з пануючымі родамі (Радзівілы, Астрожскія, Вішнявецкія, Канецпольскія, Патоцкія, Мнішкі, Пацы і інш.) - *Л. Л.*

[62] Каміла Слізень з Тышкеічаў (1806-1892), дачка Дамініка Тышкевіча (1754-?1813) і Зоф'і Тышкевіч са Слізняў (?1780-1861), жонка філамата, мастака, вучня прафесара Яна Рустэма, сябра Адама Міцкевіча Рафала Слізня, герба Свят (1803-1881).

[63] Тут, ці членам свецкага жаночага рэлігійнага ордэна, ці членам ордэна дзяўчат, якія могуць выводзіць сваё шляхецтва не менш чым ад трох пакаленняў на мячы і на кудзелі, абавязаны захоўваць цнатлівасць і паслухмянасць, але не даюць клятвы беднасці і могуць выйсці замуж. - *Л. Л.*

[64] Жонка Караля Рафала Грабоўскага (23.01.1778-29.11.1857), уладальніка Вялікага Мажэйкава. - *Л. Л.*

[65] Пра іх гл: Лаўрэш Леанід. Страчаная цывілізацыя: Маёнтак Вялікае Мажэйкава // Новы Замак. 2022. № 11. С. 206-228.

гасціннымі і добразычлівымі гаспадарамі і трымалі свой дом больш у правінцыяльным стылі. З 10 раніцы прымалі сяброў, пераважна мужчынскага полу. Пан ў начной кашулі і кальсонах, пані ў шлафроку. Як толькі хто прыходзіў, адразу ставілі картачны стол і сядалі за прэферанс, спачатку ўтрох, потым учатырох, бо пані Александрына гуляла азартна і не горш за мужа.

Абодва дамы Тышкевічаў, Юзафа з Ландварова і Яна з Вакі стаялі яшчэ зачыненыя, бо абодва браты ціха сядзелі ў Парыжы, не адважваючыся паказвацца Мураўёву. Першы таму, што перад ім уцёк ад ад'ютантства, другі - з-за ўсіх тых свавольстваў, якія ён і асабліва ягоная жонка рабілі перад паўстаннем пры Назімаве. Ужо згаданы мной багач граф Рэйнгольд Тызенгаўз, сядзеў, як мыш пад венікам у прыгожай і прасторнай кватэры на Троцкай вуліцы, адкуль ён толькі вечарамі выходзіў да маршалка Дамейкі. Хаця яму было няпоўных 40 гадоў, але дзякуючы сваёй вядомай усім поўнай абыякавасці да прыгожага полу, ён меў даволі абмежаванае кола сяброў сярод жанчын і мужчын. Рэйнгольд Тызенгаўз быў арыгінальным і цалкам неардынарным чалавекам. Ён адразу ж палюбіў мяне і выкінуў з маёй маладой галавы ўсё, што туды паклалі парыжскія прафесары. Пры гэтым ён быў вельмі мала начытаным чалавекам. Калі хто-небудзь кампетэнтны рэкамендаваў яму нейкую каштоўную кнігу (а ён добра ведаў замежныя мовы), Тызенгаўз адразу купляў яе і сядзеў над кнігай па некалькі гадзін у дзень, чытаючы каля двух старонак у гадзіну. Ён увесь час правяраў ўсе імёны і даты па энцыклапедыях і ўрэшце выціскаў з гэтай кнігі ўдвая больш матэрыялу, чым уклаў туды сам аўтар і пры гэтым, ужо ніколі не забываў зместу. Хваравіты, поўны забабонаў адносна свайго здароўя, ён, натуральна, траціў мала грошай, і з часам яго вялікія даходы склалі значны капітал, каля 1880 г. яго сястра, графіня Пшаздзецкая атрымала больш за тры мільёны рублёў. Нягледзячы на тое, што ён патаемна рабіў шмат добрых спраў, быў залічаны шляхтай ў шэраг "свіней".

Толькі блізкіх знаёмых прымала пані Францішкава Касакоўская, з дому дэ Ласі, цётка О'Брыена дэ Ласі, які пазней быў асуджаны ў Пецярбургу як забойца свайго шваrра Бутурліна[66].

Аднак капельмайстрам усяго тагачаснага віленскага свету была графіня Александрына з Ленскіх, жонка графа Юзафава Лядахоўскага, дачка заможнага абшарніка Менскага павета і сялянкі (яны былі ў законным шлюбе). З-за гэтага яна мела крыху грубаваты выгляд, але была вясёлай, ветлівай, бясконца добрай і паслужлівай, была здаровай, як свежая рыба, і яе любілі ўсе яе незлічоныя сябры. Александрына мела шалёную жарсць да гасціннасці. Яе муж граф Юзаф, равеснік майго бацькі, маленькі, элегантны і нясмелы, быў сынам генерала Лядахоўскага і Гурскай са жмудскіх кармазынаў, якая атрымала ў спадчыну ад свайго бяздзетнага брата два вялікія маёнткі, размешчаныя ў цудоўнай зямлі - Пашарвінцы на мяжы віленскага і вількамірскага паветаў і Гінтэлішкі ў глыбокай Жмудзі. Перад паўстаннем яны атрымлівалі, прыкладна, 50 тысяч рублёў срэбрам даходу. Нягледзячы на тое, што Лядахоўскія мелі ўжо вялікія даўгі, пані Александрына прывезла 34 новыя сукенкі з адной кароткай паездкі ў Парыж, і таму пан Юзаф мусіў прадаць яўрэям 1500 бутэлек шампанскага. Лядахоўскія цалкам займалі прасторны трохпавярховы дом на скрыжаванні вуліц Вялікай і Вострабрамскай, аздоблены і абстаўлены ў стылі Другой французскай імперыі, багата, але без найменшага мастацкага густу. Спадарыня Александрына прымала нас кожны дзень і акрамя таго, кожныя два-тры тыдні арганізоўвала спецыяльныя прыёмы з вытанчанай вячэрай на 20-30 чалавек, на якія заўсёды нас запрашала. Толькі тады і ўбачылі мы гаспадара дома, бо хоць і быў ён адукаваным і начытаным чалавекам, але меў адно няшчасце - піў "да падушкі" і ўвечары ўжо спаў. У наступным годзе, з-за пройгрышу ў Гінтэлішскім працэсе, пра які я згадаю пазней, гэты гасцінны дом паступова пачаў скурчвацца, пакуль каля 1890 года зусім не знік, гэта было яшчэ да смерці састарэлых сужэнцаў Лядухоўскіх.

У той час, пра які я зараз пішу, гасцямі гэтага дома былі дзве асобы, якім пасля было наканавана адыграць дамінуючую ролю ў віленскім жыцці: пан камергер Цывінскі і пан граф маршал Адам Плятэр. Пан камергер быў сынам і спадкаемцам біскупа Цывінскага, які больш за 20 гадоў займаў віленскі біскупскі пасад паміж біскупамі Клангевічам (апошнім, перад скасаваннем уніі) і Красінскім, якога саслалі на самым пачатку паўстання (удзелу ў ім не прымаў). Цывінскі меў тытул камергера, бо, як куратар шпіталя св. Якуба, прымаў там у 1860 годзе візіт імператара Аляксандра II і таму атрымаў званне камер-юнкера, якое не вельмі адпавядала яго сталаму ўзросту (у прынцыпе, чын камер-юнкера не роўны, а меншы за чын камергера - *Л. Л.*). Надзьмуты, тупы, без адукацыі і розуму, не быў ён ні шанаваны ні любімы, але вясёлая і вечна прагная кампанія графіні Лядахоўскай даравала яму ўсе гэта, бо ніводная пляткарка не магла спаборнічаць з ім у выдумцы ці ў распаўсюджванні плётак.

Адам граф Плятэр, да якога я яшчэ не раз вярнуся, у той час фактычна пачынаў сваю кар'еру, яму ледзь споўнілася 30 гадоў[67]. Плятэр быў сынам шматгадовага (па

[66] Адно з гучных забойстваў у Расійскай імперыі ў 1910 годзе. Васіль Бутурлін - сын і спадчыннік аднаго з самых багатых людзей таго часу - генерала Дзмітрыя Бутурліна, захварэў 5 траўня. Доктар В. К. Панчанка, да якога ён звярнуўся, зрабіў яму некалькі падскурных упырскаў. Занепакоеная пагаршэннем становішча хвораrа, жонка запрасіла іншага доктара - Я.А. Когана. Па прапанове апошняга быў склікаты кансіліюм, які прызнаў атручванне арганізма. Па падазрэнні ў атручванні быў арыштаваны Патрык О'Брыен дэ Ласі - муж адзінай сястры нябожчыка Бутурліна. Ён хацеў пазбавіцца ад суперніка за спадчыну і наняў доктара Панчанку. Апошні пагадзіўся за 10 тыс. руб. атруціць маладога Бутурліна праз упырскванне ў яго арганізм яду. Дэ-Ласі быў прысуджаны да катаржных прац пажыццёва. Панчанка атрымаў 15 гадоў турмы. - *Л. Л.*

[67] Ён заслужыў трапную мянушку "Граф Dinde" ( фр. Індык), якую насіў да самай смерці.

выбарах) маршалка Віленскага павета, легендарнага "Кракадзіла" [68] і маці з Жабаў, дакладней з Марцінкевічаў. Бо калі стары і багаты дом Жабаў амаль адначасна згас на мужы малодшай дачкі дзедзіча Гальшанаў, майго прадзеда Воўка і яго кузіны, спадчынніцы Гельвянаў у Вількамірскім павеце, гэты апошні аддаў сваю адзіную дачку да нейкага пана Марцінкевіча і дамогся дазволу на далучэнне прозвішча жонкі да ўласнага[69].

Пан Адам граф Плятэр быў абраны павятовым маршалкам у 22 гады, перад паўстаннем яго ўгаварылі заняць гэту пасадую ад імя паўстанчага камітэта. Калі яго вельмі лаяльны бацька "Кракадзіл", прастудзіўся ў касцёле і памёр, пан Адам прыехаў на яго пахаванне, і Мураўёў загадаў прывезці яго да сябе. Аказалася, што ён выдатна ведаў пра яго грэх, па-бацькоўску навучыў і паставіў перад выбарам: ці шыбеніца, ці маршалкоўства Віленскага павета з камер-юнкерскім мундзірам. Першы варыянт не спадабаўся маладому графу, і таму ён вымушаны быў прыняць другі. Гэта першы крок у яго пазнейшай "казачнай кар'еры".

Трошкі на адлегласці ад згаданых асоб, да якіх яны мелі мала павагі з-за браку ў іх інтэлекту, знаходзіліся блізкія сябры Баляслаў Лапацінскі і Яўстах граф Тышкевіч.

Лапацінскі, далёкі сваяк вышэйзгаданай камтэсы (графіні), вельмі прыгожы і элегантны чалавек, які даўно растраціў свой мізэрны фундуш і жыў, як кажуць яўрэі, толькі ветрам. Лічыўся патэнтованым і заслужаным дасціпнікам горада Вільні. Яшчэ і ў 1914 г. знаёмыя паўтаралі некаторыя яго жарты. Быў аўтэнтычным і сапраўдным аўтарам жарту, які кожныя некалькі гадоў я знаходжу ў варшаўскіх гумарыстычных часопісах і, з-за павагі да гісторыі, вымушаны вярнуць жарту яго сапраўднага аўтара. У той час па Вільні вандравала пара прафесійных дармаедаў - абодва дзеці французскіх палонных, якія перажылі 1812 год - пан і пані Дабры. Ужо пры кіраванні Бібікава пані Дабра была тоўстай і старой жанчынай, але ўсё яшчэ танцавала. На балі ў генерал-губернатара Болесь Лапацінскі запрасіў яе на танец. Вышэйшы за яе, ён заўважыў дзве няшчасныя сасіскі, якія боўталіся ў вялікім станіку, пагрузіў сваю пышную бараду паміж сасіскамі і ... пацалаваў. Абураная француканка пабегла скардзіцца мужу. Учыніць скандал у пакоі генерал-губернатара было немагчыма, але калі Лапацінскі ўжо ад'язджаў, у гардэробе яго знайшоў помслівы муж. Пан Дабра аблаяў Лапацінскага па-французску. На што Болюсь велічна адказаў: "Пан Дабра, ты гэта сур'ёзна ці жартуеш?". "Сур'ёзна!". "Гэта вельмі добра, бо я такіх жартаў не люблю".

Пажартаваў ён і з самім Бібікавым. Ведаючы пра стасункі Бібікава са спадчыннікам трона, калі прыйшла вестка аб смерці Мікалая I, Лапацінскі кінуўся ў запоўнены гасцямі салон і закрычаў: "Vous savez, nous allons perdre notre Bibichon!" ("Ведаеце, мы страцім нашага Бізона!", фр. Па гучанні "Bibichon" - нагадавала слова "бізон". - *Л. Л.*). Назаўтра да Болеся, які добрасумленна служыў пры генерал-губернатары, прыехаў паліцэйскі з загадам неадкладна з'явіцца да Яго Высокаправасхадзіцельства - поўны мундзір, шпага, нейкі медалік. Ён увайшоў у прасторны кабінет, дзе ўжо знаходзіўся ўвесь персанал канцылярыі. Седзячы за пісьмовым сталом у самым канцы канцылярыі, генерал-губернатар жэстам загадаў яму стаць перад ім: "Як мяне завуць? Скажыце, калі ласка, як мяне завуць!". "Генерал кавалерыі, генерал-ад'ютант, віленскі генерал-губернатар, член гэтакіх саветаў, кавалер гэтакіх ордэнаў, Н. Н. Бібікаў". Паўза і зноў: "Як мяне завуць?" "Генерал ад кавалерыі, генерал-ад'ютант і г. д. і г. д. і г. д. "Добра, ідзі і памятай, што я не Бізон".

Яўстах граф Тышкевіч меў тады пяцьдзесят з нечым гадоў, а выглядаў на восемдзесят, бо не шанаваў здароўя, не хаваў сівізны. Калісьці ён меў нядрэнны фундуш. Належаў да галіны Тышкевічаў Лагойскіх. Кожны дзень Тышкевіч абходзіў тры галоўныя віленскія цукерні: Бема, Шпора і Кехля, а вярнуўшыся дадому, заглыбляўся ў кнігі. Асабліва дасведчаны ў археалогіі і нумізматыцы, быў па-сапраўднаму цікавым чалавекам[70]. Адразу пасля

[68] Гэтую мянушку, згадвае Мараўскі, пан Стэфан Плятэр атрымаў, бо ў маладосці, пасля цяжкага запалення лёгкіх, быў пасланы на ўсю зіму ў Каір і ўбачыў на беразе ракі Ніл кракадзіла. А паколькі ён быў казачным невукам, якім застаўся да смерці, і не ведаў пра існаванне такіх звяроў, таму ўсё жыццё надакучваў усім апісаннем гэтай пачвары. Памёр у часы Мураўёва. (Насамрэч, Мараўскі піша, што Станіслаў Плятэр расказваў, што ў Егіпце ён конна ездзіў на кракадзілах. - *Л. Л.*)

[69] Пан Жаба, зяць с. п. Самуэля Ваўка рана аўдавеў, меў вялікую сілу і быў гулякам і дэбашырам, ён значна паменшыў вялізны гальшанскі маёнтак, які застаўся ў спадчыну ад яго бабкі Сапяжанкі. Былы рускі афіцэр, арганізаваў у 1830 г. паўстанцкі атрад. Быў арыштаваны яшчэ да таго, як паспеў далучыцца да паўстанцкай арміі, меў пры сабе спіс членаў усяго свайго атрада. Напэўна, яго выдалі, бо два жандары схапілі яго для асабістага дагляду. Як Самсон у храме, ён адкінуў іх і праглынуў кампрамат. Быў асуджаны на катаргу і памёр у Сібіры. У 1860 г. я гасцяваў ў Гальшанах у яго дачкі і маёй цёткі Корсак і зайшоў у капліцу Сапежынскага замка, якая яшчэ добра захавалася. Убачыў тут мармуровую магілу аднаго з Сапегаў, на якой быў намаляваны нябожчык, прычым яго дзве жонкі схіліліся над ім. Тады я пачуў шэпт дзвюх дзяўчат: "А што гэта?", "Ці не бачыш, неразумная, гэта 7 спячых братоў" (маюцца на ўвазе сем Эфескіх хлопчыкаў хрысціянскіх пакутнікаў, якіх жыўцом замуравалі ў пячоры і яны праспалі там некалькі стагоддзяў - *Л. Л.*).

[70] Яўстах Тышкевіч меў арыгінальны, даволі з'едлівы досціп. Неяк ён адказаў важнаму чыноўніку-русіфікатару пры губернатары Каўфмане, які прасіў прабачэння за тое, што наступіў яму на нагу: "Калі ласка, не саромейцеся, я каталіцкага веравызнання".

ўступлення на трон, Аляксандр II у флігелі былога Віленскага ўніверсітэта заснаваў Музей мясцовых старажытнасцяў. У справе музея ўдзельнічала некалькі дзесяткаў заможных абшарнікаў, да ліку якіх належаў і мой бацька. Ужо ў 1863 г. граф сабраў даволі вялікую калекцыю[71].

На пачатку 1865 г. Тышкевіч прыйшоў да бацькі з просьбай прыйсці вечарам у музей на агульны сход членаў таварыства, скліканы па загадзе Мураўёва, пры гэтым загадкава дадаў: "Прывязіце, калі ласка, з сабою і свайго пана Гіпаліта, пераживе ён нас усіх, і добра, калі хтосьці потым зможа ўспомніць тое, што сёння адбудзецца".

У 8 гадзін вечара сабралася нас чалавек трыццаць. Старшынстваваў Тышкевіч, ён прадставіў нам яшчэ вельмі прыгожага генерала світы Аркадзія Сталыпіна, бацьку будучага прэм'ер-міністра, які перад грамадствам сказаў прамову пра будучыню музея. Натуральна, мы слухалі моўчкі. У дакладзе гаворка ішла пра спрадвечна рускі характар і мінулае Паўночна-Заходняга краю і асабліва горада Вільні. У ім былі ўсе лухты і гістарычныя выдумкі пра нібыта расейскае мінулае, створаныя "Московскими Ведомостями" і потым за паўстагоддзя распрацаваныя "Новым Временем". Натуральна, краевугольным каменем усёй гэтай пабудовы быў шлюб князя Альгерда, сына Гедыміна і бацькі Ягайлы, з рускай цвярской княжной. Цэлыя старонкі дакладу Сталыпіна былі запоўнены дурнымі падрабязнасцямі пра тое, чым займаўся тады гэты поп, гэты баярын ці баярыня і яе світа, усё гэта павінна было сведчыць пра спрадвечна рускі характар усяго краю. Памятаю яшчэ адзін перл нахабства: "У той час у Вільні ўжо друкаваліся рускія кнігі", - і гэта за добрую сотню гадоў да вынаходніцтва кнігадрукавання! Выснова: Віленскі музей павінен і надалей служыць толькі для збору гістарычных рэчаў, якія пацвярджаюць гэтую думку і таму пераходзіць у падпарадкаванне генерал-губернатарскай уладзе. Тышкевіч з вялікай годнасцю спытаў, ці хоча хто выступіць і ў адказ пачуў мёртвую цішыню. Пасля гэтага ўсе разышліся.

Усе калекцыі, якія не пацвярджалі тэзіс Сталыпіна, былі вывезены ў Маскву. Не ведаю, ці замянілі іх на спрадвечныя рускія артэфакты і дакументы, бо з таго часу я ні разу не быў у гэтым будынку.

Праз некалькі гадоў пан Яўстах пераехаў у Біржанскую ардынацыю і неўзабаве, адразу пасля франка-нямецкай вайны, мірна памёр.

З членаў гэтага таварыства перад Вялікай вайной, у Вільні ўжо нікога не засталося.

Каля студзеня 1865 г. жорсткія персанальныя рэпрэсіі спыніліся. Тыя, пра каго ўдалося даказаць актыўны ўдзел у паўстанні ці ў паўстанчай арганізацыі, усе былі асуджаныя на смерць (усяго 250 расстрэлаў), на катаргу, на пасяленне ў Сібіры і г. д. Толькі невялікай колькасці з тых, хто ўдзельнічаў у паўстанні, але змог рознымі спосабамі гэта схаваць, заставалася некранутай. А некаторыя з іх хутка нават сталі лідарамі "благанадзейных".

Пачалася другая частка геніяльнай праграмы Мураўёва, а менавіта вынішчэнне мясцовай культуры і яе носьбітаў, асабліва абшарніцкай шляхты. Найбольш эфектыўным пакараннем быў прымусовы продаж маёмасці ў чужыя рукі, гэта хоць і не было яшчэ ў заканадаўстве, але ўжо меўся такі праект і перад ім адчыняліся дзверы. Я яшчэ вярнуся да гэтай тэмы. Другім пакараннем было ганенне на каталіцкую рэлігію праз закрыццё касцёлаў, разгон рэлігійных ордэнаў, у тым ліку і Візітак ў Вільні. Фактычна гэтыя ганенні працягваліся бесперапынна да 1905 г. Найбольш дзейсным сродкам, накіраваным на падзел паміж сялянскім і абшарніцкім саслоўямі, была карэнная змена сэнсу сялянскай рэформы, абвешчанай 2(14) лютага 1861 г., а фактычна ажыццёўленай роўна праз два гады, на самым пачатку паўстання.

Галоўныя, першасныя прынцыпы гэтай рэформы 1861 г., накіраванай на вызваленне сялян ад усякай залежнасці ад сваіх былых гаспадароў і прадстаўленне ім поўнай уласнасці на зямлю, якой яны да гэтага часу карысталіся за гарантаваную дзяржавай плату, ужо былі прыведзены вышэй.

Па сутнасці, калі ў траўні 1863 года Мураўёў, як егіпецкая чума, абрынуўся на краіну, галоўныя пытанні сялянскай рэформы ўжо былі вырашаны. Ужо два гады як дзейнічалі так званыя пасрэднікі, у асноўным прыстойныя людзі (часцей за ўсё шалі іх правасуддзя схіляліся ўлева), была скасавана паншчына, устанаўліваліся межы сялянскіх зямель, паўсюдна добраахвотна ці праз пасрэднікаў, урэгулявана важнае пытанне кампенсацыі. У бацькоўскіх маёнтках сяляне без асаблівых таргоў згаджаліся плаціць амаль 25 тысяч рублёў гадавога ўзносу. Гэта было не надта празмерна, бо склала менш за 40 рублёў з хаты. У той жа час за так званыя "пусташы" ў свабоднай арэндзе, г. з. за зямлю, якая засталася без гаспадароў (у бацькі было каля 30 такіх надзелаў), плацілі ад 40 да 80 рублёў з хаты[72].

Геній свайго роду Мураўёў, знайшоў магутную зброю, каб назаўсёды знішчыць багацце, а значыць і ўплыў, і грамадскае значэнне землеўладальніцкай шляхты. Атрымаўшы заканадаўчую ўладу на тэрыторыі шасці так званых паўночна-заходніх губерняў, ён сваімі інструкцыямі змяніў усю рэформу 1861 года. Яе выканаўчым органам сталі надзеленыя амаль неабмежаванымі правамі так званыя праверачныя камісіі. Усё насамрэч залежала ад настрою, бескарыслівасці ці прагнасці старшыняў гэтых камісій.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[71] Гл: Лаўрэш Леанід. Яўстах Тышкевіч, яго калекцыя і яго музей // Наша слова.pdf № 49 (101), 6 снежня 2023.; № 50 (102), 13 снежня 2023.

[72] Як бачым Корвін-Мілеўскі практычна перадаў зямлю сялянам па кошту арэнды, бо 40 рублёў у год - вельмі вялікія ў той час для селяніна грошы, нагадаю што менавіта з-за паўстання 1863 г. улады пайшлі на значнае паніжэнне выплат за зямлю, якую атрымалі беларускія сяляне. - *Л. Л.*




*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Праверачныя камісіі, якія толькі распачалі сваю работу на пачатку 1865 г., у першую чаргу знізілі (па загадзе Мураўёва) кампенсацыйныя зборы не менш, чым на 75 ці 80%, дзякуючы праву надання некаторым сялянскім землям статусу зямлі, якая не выкарыстоўваецца і не абкладаецца за ніякай аплатай. Акрамя таго, камісія вызначала ці проста ўстанаўлівала сервітуты[73] для выпасаў, якія да катастрофы 1914 г. служылі невычэрпнай крыніцай злоўжыванняў і сварак паміж абшарнікамі і сялянамі. Для бацькоў штогадовыя выплаты былі зменшаны з 25 000 да 5 200 рублёў, і калі ў Цыціне і Геранёнах нейкі паважаны пан Папоў аказаўся памяркоўным, то ў Лугамовічах і Лаздунах, дзякуючы славутаму пану Ціхеяву, ніводзін гектар лесу не быў вызвалены ад сервітуту.

Да злоўжыванняў, якія заклікаюць Бога аб помсце, можна аднесці і прымяненне "інструкцыі" Мураўёва да маёнтка Гінтэлішкі вышэйназванага Юзафа графа Лядахоўскага. Пасля абвяшчэння канстытуцыі 3 мая, ягоны, ахоплены патрыятызмам дзед, пан Гурскі (такіх прыкладаў было некалькі ў Жмудзі), не толькі вызваліў і надаў зямлю ўсім сваім сялянам, але, каб трымаць сядзібу, за сабой захаваў толькі невялікую плошчу. Ён аддаў сялянам усю маёмасць ва ўласнасць, гэтая маёмасць падлягала толькі так званаму вечнаму чыншу. Нягледзячы на тое, што гэты чынш прыносіў Лядахоўскаму 36 000 рублёў срэбрам у год, якія заўсёды выплачваліся наперад, ён быў вельмі ўмераным. Таму сяляне, захопленыя яго джэнтльменствам, калі пан граф кожны год, прыкладна на 6 тыдняў, прыязджаў у маёнтак, па дамоўленасці паміж сабой, стваралі гаспадарчы камітэт, прывозілі з Вільні майстра-кухара з памочнікамі, прыслугай, цэлым абозам харчоў і найлепшых вінаў, і ўвесь час побыту дзедзіча з сям'ёй і гасцямі ўтрымлівалі іх за свой кошт. Камісія Мураўёва прыдумала пасля сямідзесяці з лішнім гадоў волі, вярнуць сялян маёнткі Гінтэлішкі ў былыя часы і ў той жа вечар прымяніць да іх маніфест 1861 г., гэта значыць вызваліць іх ад прыгону і пакінуць ім усю зямлю якой раней надзяліў іх Гурскі, раней устаноўлены вечны чынш перарабіць у кампенсацыю, якая нібыта з іх ласкі, вызначалася ў 14 000 замест ранейшых 36 000 руб. Лядахоўскі спрабаваў падаць у суд, але прайграў ва ўсіх інстанцыях, а паколькі яго гасціннасць давяла яго да доўгу ў 300 000 рублёў, грошай ад сялян не хапіла нават, каб пакрыць даўгі[74].

Такі стан рэчаў абумовіў неабходнасць для бацькі прысутнічаць ў маёнтку, тым больш, што, хаця секвестр і быў зняты, але не было ніякай маёнткавай адміністрацыі, акрамя нейкага чыноўніка-ўрвіса, якога Мураўёў выдаліў з Ашмянаў і якому бацька перад турмой падпісаў даверанасць. Але Мураўёў усяроўна не выпускаў тату з горада, і каб сяляне адчулі, што дзедзічы яшчэ існуюць, бацька на пачатку вясны адправіў у Геранёны маю маці.

Тым часам у Пецярбургу з-за нейкіх незразумелых прыдворных плётак, у аснове якіх, мауляў, ляжала невылечная прагнасць "дзяржаўнага злодзея", ці таму, што Аляксандр II цярпеў гэтага ката толькі да таго часу, пакуль лічыў яго патрэбным, без папярэдняга паведамлення, Мураўёў быў нечакана адпраўлены ў адстаўку[75]. Пасаду заняў генерал Патапаў. Мой бацька, скарыстаўся гэтым

---

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[73] Сервітуты - права сялян на карыстанне маёнткавымі лугамі, пашамі і лясамі. Гэта права з'яўлялася прычынай шматлікіх спрэчак паміж вёскай і маёнткам. Існавалі розныя віды сервітутаў: лясныя, пашава-лугавыя і рыбалоўныя. Часам сервітуты ўключалі ў сябе права збіраць камяні, чарот, перавоз, секчы галлё, пераганяць жывёлу, карыстацца сядзібнымі сажалкамі, дарогамі, берагамі і інш. - *Л. Л.*

[74] Як бачым, і ў дадзеным выпадку, пасля паўстання, урад у 2,5 разы паменшыў сялянскія выплаты за зямлю, пры тым, што вечны чынш сяляне павінны былі плаціць "да сканчэння веку", а кампенсацыйныя выплаты - толькі вызначаны тэрмін.

Згодна з законам, селянін павінен быў неадкладна заплаціць памешчыку 20% выкупной сумы, а астатнія 80% уносіла дзяржава. Сяляне павінны былі пагашаць яе на працягу 49 гадоў штогадовымі роўнымі выкупнымі плацяжамі, за гэты тэрмін, сяляне павінны былі выплаціць 294% выкупной пазыкі. У сучасных тэрмінах, выкупная пазыка была крэдытам на тэрмін 49 гадоў пад 5,6% гадавых. - *Л. Л.*

[75] Герцан пісаў у "Колоколе": *"Партрэт Мураўёва. "Illustrated Times" ад 2 студзеня змясціў партрэт Мураўёва- вешальніка. Перад гэтым партрэтам мы спыніліся ў маўклівым здзіўленні... гэта мяжа, гэта мяжа.*





каб дамагчыся адмены свайго інтэрніравання і прыехаў у Геранёны з намерам неўзабаве вярнуцца, каб прыняць некаторыя канчатковыя рашэнні пра далейшую адукацыя майго брата і мяне. Калі ён вярнуўся ў Вільню, аказалася, што адразу пасля ад'езду "вешателя" (які забраў з сабою 14 вазоў крадзенай маёмасці), усё наша грамадства і невялікая частка нібыта "ліберальнага" расійскага, а часткова і сам Патапаў, неасцярожна пачалі выказваць сваё задавальненне, і таму банда Мураўёва, на чале са знакамітым рэдактарам "Московских Ведомостей" Катковым, узняла лямант пра ўваскрэслую "польскую інтрыгу" [76]. Паколькі, у адпаведнасці з існаваўшай у той час "кітайшчынай", прызначэнне простага генерал-маёра світы Патапава на такую выключна важную пасаду, з'яўлялася чымсьці зусім незвычайным, то яго павысілі да генерал-лейтэнанта і атамана Данскога казацтва, а ў Вільню прызначылі генерала ад інфантэрыі Каўфмана[77] з інструкцыяй нічога не змяняць у сістэме Мураўёва.

Аднак нельга адмовіць гэтаму зверу Мураўёву ў адной "исконно русской" цноце, якая даўно згасла ў іншых еўрапейскіх і ў тым ліку і ў нашым грамадстве, а менавіта ва ўдзячнасці. У той час быў яшчэ жывы ксёндз Ліпінскі, суперінтэндант (нібыта біскуп) кальвінскага духавенства ў Літве, даўні сябар яго аднаверца, майго дзеда Самуэля Воўка. Летам 1863 г. сакрэтна данеслі, што яго малагадовы сын быў цяжка паранены ў атрадзе Колышкі[78] (які неўзабаве быў павешаны), застаўся на полі бою і патрапіў у палон. Яго везлі ў Вільню, каб павесіць ці расстраляць. Ліпінскі прыляцеў да Мураўёва і ва ўсім прызнаўся. Той у роспачы: "Але ж, ойча, не дай Бог, ён трапіць у рукі ўладаў, тады і я яго не выратую!". Паклікаў ад'ютанта: "Ротмістр, садзіся адразу на каня, узвод казакоў з сабой, расцягніцеся па вількамірскай дарозе і шукайце параненага маладога чалавека, якога арыштавалі і вязуць у возе. Табе скажуць, што гэта палонны паўстанец, але я ведаю, што ён быў паранены на паляванні. І каб ніхто не смеў казаць нічога іншага! Разумееш? Проста адвязі яго ў кватэру пана суперіндэнданта на вуліцы Завальнай і маўчы! Разумееш? Ступай!". Праз паўгадзіны ў Ліпінскага ўжо сядзеў старшы вайсковы хірург, прывезлі параненага, вынялі кулю, кожныя некалькі дзён афіцэр цікавіўся яго здароўем, а калі малады Ліпінскі ачуняў, Мураўёў выдаў яму звычайны пашпарт і паслаў у нейкую ціхую, цэнтральную губерню з рэкамендацыйным лістом да губернатара, каб той уладкаваў яго ў "цёплы куток".

Аказалася, што ў 1861 годзе суперіндэндант Ліпінскі знаходзіўся па справах у Пецярбургу і на вуліцы патрапіў пад адзін з тамтэйшых паўночных, лютых і бясконцых ліўняў. Ліпінскі схаваўся пад брамай, у яго забалелі старыя ногі, і калі ён прачытаў на дошцы "Генерал М. М. Мураўёў", дык успомніў, што ведаў гэтага Мураўёва яшчэ ў Гародні ў 1831 годзе, і зайшоў да генерала адпачыць. Яго прынялі як арханёла Гаўрыіла, і толькі потым Ліпінскі зразумеў, чаму. Было гэта неўзабаве пасля шумнага выгнання Мураўёва з Міністэрства дзяржаўнай маёмасці - пасля гэтага беднаму "дзяржаўнаму злодзею",

*Такой мастацкай адпаведнасці паміж зверам і яго знешнасцю мы не бачылі ні ў статуях Банароці, ні ў бронзах Бенвенута Чэліні, ні ў клетках заалагічнага саду... Трэба аддаць прыродзе справядлівасць, яна найвялікшы мастак!*

*Гэты партрэт павінен застацца для нашчадкаў, ён належыць гісторыі.*

*Кат, як кляймо, аздобіць сваімі рысамі бессаромную частку рускага грамадства, тую, якая радуецца пакараннем смерцю як перамогам і абрала гэтага вылюдка сваім вялікім мужам. Усе брыльянты імператарскай кароны і ўвесь алей памазання не выратуюць вянчаны лоб чалавека, які адшукаў дзесьці закінутага людаеда, каб яго паслаць на "супакаенне" няшчаснага края.*

*Партрэт гэты няхай захаваецца для таго, каб дзеці навучыліся пагарджаць тымі бацькамі, якія ў п'яным рабалепстве тэлеграфавалі сваю любоў і спачуванне гэтаму напітаму вадой бясшыйнаму бульдогу, гэтай жабе з адвіслымі шчокамі, з напаўзаплыўшымі вачамі, гэтаму калмыку з выразам перанасычаным пажаднай злосцю, якая дасягнула нейкай расліннай нячуласці...".* - цыт па: Колокол. 15 студзеня 1864 г.

[76] Віленскі доктар Юльян Цітыюс пісаў, што на чале інтрыгі супраць Патапава стаяў куратар Віленскай навучальнай акругі Бацюшкаў: *"Калі інтрыга не ўдалася і Бацюшкаў страціў пасаду у Вільні, ён быў пераведзены ў Маскву і там расказаў сваім сябрам Каткову і Аксакаву, што Патапаў дзейнічае як здраднік і таму псуе і нішчыць векапомную працу Мураўёва. Пасля гэтага пасыпаліся грамавыя артыкулы ў "Маскоўскіх Ведамасцях" пра тое, што Патапаў - паланафіл, а яго кіраўніцтва назвалася "Патапаўшчына"*. У Пецярбургу непрыяцелем Патапава быў пісьменнік і малады прафесар Духоўнай акадэміі, фанатык Каяловіч, які сам быў родам з Літвы". - *Л. Л.*

[77] Каўфман Канстанцін Пятровіч (1818-1882), генерал-маёр світы, з 1861 г. дырэктар канцылярыі Ваеннага міністэрства, у 1865-1867 генерал-губернатар Паўночна-Заходняга краю і камандуючы войскамі Віленскай вайсковай акругі. - *Л. Л.*

[78] Баляслаў Вікенцевіч Колышка (7.VIII.1837-9.VI.1863) нарадзіўся ў фальварку Карманішкі (паводле Чэслава Малеўскага - у ваколіцы Гудаў) Лідскага павета. З 1860 г. вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, адзін з кіраўнікоў рэвалюцыйнага студэнцтва, прапагандаваў ідэі рэвалюцыйнага саюзу народаў у барацьбе з самадзяржаўем, у 1861 г. вёў агітацыю ў Лідзе, потым удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, сутыкненнях студэнтаў з паліцыяй. Ратуючыся ад пакарання, выехаў за мяжу, наведваў ваенную школу эмігрантаў у Італіі. У сакавіку 1863 г. сфармаваў паўстанцкі аддзел у Ковенскім павеце, меў некалькі паспяховых сутычак з царскімі войскамі. Пасля разгрому паўстанцаў узяты ў палон і павешаны ў Вільні на плошчы Лукішкі. - *Л. Л.*




як зачумленаму, ніхто ў сталіцы не падаваў руку і нават не пазнаваў[79].

Некалькі разоў у жыцці я атрымліваў каштоўныя паслугі ад рускіх у невялікіх чынах, якім раней зрабіў нешта добрае. Я нават ужо забыўся пра іх, а яны не забыліся, што некалі атрымалі банальную гжэчнасць ад "знатного барина". "Рускі чалавек - тып імпульсіўнай істоты, ад якой, вы можаце чакаць усяго, чаго заўгодна, акрамя таго, што неабходна", - сказаў мне некалі мудры граф Пален (міністр).

Не было і мовы пра замежны пашпарт для мяне, а Патапаў, які і далей цікавіўся нашай сям'ёй, не радзіў пасылаць нас у навучальныя ўстановы Пецярбурга ці Масквы, бо сярод моладзі там ужо пачалася рэвалюцыйная агітацыя, так добра апісаныя Тургеневым у "Бацьках і дзецях". Добразычлівы генерал баяўся, каб мы, атручаныя да самых костак заходняй "гніллю", не патрапілі ў непажаданую гісторыю, і параіў бацьку адправіць нас у Дэрпт, тады яшчэ зусім нямецкі, дзе мы знойдзем больш спрыяльную для нас атмасферу і менш небяспечнае асяроддзе. Бацька так і вырашыў. Але паколькі нам трэба было здаць экзамен за расейскую сярэднюю школу, а да новага ўніверсітэцкага года заставалася менш за тры месяцы, нам трэба было ўмацаваць свае веды як у нямецкай, гэтак і рускай мовах, і мы не паехалі ў вёску, а з нашым уласным слугой засталіся ў двух асобных пакоях у доме нейкага немца-швейцарца Келера, які трымаў пансіён з пяццю гімназістамі. Мы дзялілі з імі зусім нядрэнную сталовую, мелі штодзённыя ўрокі нямецкай мовы ад пана Келера і рускай мовы з рэпетытарам гэтых гімназістаў, а ў астатні час, у тым ліку і ўвечары, былі цалкам вольныя.

Тым часам Каўфман ужо цалкам асвоіўся, і стала зразумела, што не зменіцца другая частка сістэмы Мураўёва - выкараненне мясцовай культуры. Больш не было ні арыштаў, ні ваенных судоў, але працягвалася адміністратыўная высылка ва ўнутраныя раёны. Сваімі вачамі я чытаў тэкст рэзалюцыі аб ссылцы аднаго з нашых суседзяў, памятаю даслоўна: *"З-за адсутнасці якіх-небудзь доказаў удзелу ў паўстанцкім руху прызнаць апраўданым праз суд, аднак, паколькі ён усё ж падазраецца ў сімпатыях да гэтага руху, у адміністрацыйным парадку выслаць ў Тамбоўскую губерню"*. І такая ссылка мела відавочныя наступствы для маёнтка.

Пры гэтым Каўфман, менавіта таму, што быў лютаранінам, яшчэ больш узмацніў рэлігійны пераслед. Ваенным начальнікам Віленскага павета ён прызначыў нейкага палкоўніка князя Хаванскага, які абяцаў яму ў імгненне вока, праз адпаведныя сродкі, перавесці сялян-католікаў у праваслаўе. Яму гэта не ўдалося, але не па віне вышэйшага каталіцкага духавенства. Тугэйшыя тры канонікі: адміністратар дыяцэзіі пасля выгнання біскупа Красінскага - Жылінскі, а таксама Нямекша і Тупальскі (пазней забіты сваім слугой) і славуты менскі Сенчыкоўскі, вызначаліся бязмежнай руплівасцю ў выкананні ... дзяржаўнай палітыкі[80].

Трымаліся толькі сяляне.

Бывалі і камічныя моманты. Хаванскі з казакамі і паліцэйскім "асэсарам" прыляцеў у гміну і парафію Салечнікі. На яго няшчасце, ад паліцыі з ім быў Сабалеўскі, пазнейшы мой павятовы "іспраўнік". Хаванскі загадаў склікаць у гміну ўсіх старастаў вёсак, узяў на дапамогу суседняга папа і пачаў правяраць на старастах сваё красамоўства. Гэта працягвалася некалькі гадзін, але сяляне настойліва адказвалі: "Няхай будзе, як было за бацькамі"[81]. Тады нецярплівы князь загадаў Сабалеўскаму замкнуць усіх у "халодную" (гмінную вязніцу), ажно пакуль яны не пагодзяцца падпісаць выніковы рапарт, а папу загадаў асабіста: "А ты, ойча духоўны, іх пераканай". Пасля чаго сеў на брычку і ўцёк. Вязніца мела некалькі квадратных метраў, сялян было больш за дваццаць чалавек, а тэрмометр у цяні паказваў 30 градусаў цяпла. Калі Хаванскі з'ехаў, Сабалеўскі, уціснуў сялян у вязніцу, як селядцоў у бочку і запрасіў да іх папа. Поп пратэставаў, бо князь загадаў сялян "навяртаць і пераконваць іх вочы ў вочы, а не праз сцяну!", і таму "я выканаю толькі той загад, які атрымаў!". Тады Сабалеўскі ўціснуў у вязніцу і папа. Праз дзесяць хвілін поп пачаў задыхацца і прасіць прабачэння: "Напішаце рапарт аб поўным правале маіх намаганняў". Рапарт напісалі і падпісалі на плячах аднаго з сялян, у рапарце сярод іншага было і пра тое, што ерэтыкі *"ўстойлівыя ў сваіх памылках"*. Пасля гэтага Сабалеўскі адпусціў папа і сялян. Наколькі мне вядома, тыя ж салечніцкія сяляне яшчэ раз не так даўно *"ўпарціліся ў сваёй памылцы"*, калі Яго Эксцэленцыя біскуп Матулевіч, якога Рэч Паспалітая цярпела шэсць гадоў, хацеў пад сваёй пратэкцыяй перавесці іх у летувісы[82].

[79] Астальф дэ Кюстын пісаў: *"У Расіі варта міністру страціць пасаду, як яго сябры адразу глухнуць і слепнуць. Патрапіць у няласку - значыць жыўцом сябе пахаваць. .... Вось чаму руская не ўпэўненыя сёння ў існаванні міністра, які кіраваў імі ўчора"*. Цыт. па: Кюстин А. де. Россия в 1839 году. Т. 1. Москва, 1996. С. 157.

[80] Падрабязней пра тыя падзеі і гэтых асоб, гл: Успаміны Юльяна Цітыюса з дадаткамі Уладзіслава Талочкі // Наша слова.pdf № 12, 23 сакавіка 2022.; № 13, 23 сакавіка 2022.; № 14, 6 красавіка 2022.; № 15, 13 красавіка 2022.; № 16, 20 красавіка 2022. - **Л. Л.**

[81] Словы старастаў Салечніцкай гміны пададзены па-беларуску, што зразумела, бо гэта іх родная мова. - *Л. Л.*

[82] Маецца на ўвазе, што дабраславёны біскуп Юрый Баляслаў Матулевіч-Матулайціс (1871-1927) спрыяў як беларусам, гэтак і летувісам ў справе касцёла. За сваю дзейнасць архібіскуп неаднаразова падвяргаўся нападкам і ў 1925 годзе быў вызвалены ад пасады віленскага архібіскупа. 28 чэрвеня 1987 года рымскі папа Ян Павел II беатыфікаваў Юрыя Матулевіча. Адносіны Корвін-Мілеўскага да святога біскупа Матулевіча, яскрава характарызуюць аўтара гэтых успамінаў як католіка. - *Л. Л.*





У першыя дні жніўня бацька даставіў нас у Дэрпт - напачатку цягніком да Пскова, потым на караблі па рацэ Вялікай і па рацэ Эмбах, да самага Дэрпта. Ён думаў, што калі адразу выпусціць нас на волю, дык мы "марна загінем" і пасяліў нас у пана Яна Мантэйфеля (барона Зыге фон Мантэйфеля). Барон быў жанаты з Бяніслаўскай, бацька якой, стары пан Урбан, з трыма малодшымі дочкамі таксама жыў у Дэрпце падчас сялянскіх хваляванняў на пачатку паўстання.

**[У далейшых раздзелах VI і VII Іпаліт Корвін-Мілеўскі расказвае пра вучобу ў Дэрпце, сваю хваробу, далейшую вучобу ў Парыжы і пра судовую практыку.]**

## *Раздзел VIII*

## *Вайна 1870-1871 гг. Камуна*

Ішла палова тэрміну майго лячэння ў Пірэнеях, калі 14 ліпеня 1870 г. з ласкі Бісмарка ў Еўропе выбухнула тая ж самая бомба, якая потым узарвалася яшчэ раз у 1914 г. [...]

У той час мой бацька знаходзіўся ў Літве, а брат Ігнацы - у Мюнхене, дзе ён вучыўся ў школе жывапісу. Перад канцом месяца я атрымаў ад бацькі ясны, цвёрды і, як заўсёды ў гэтага мудрага чалавека, які ў той час меў ужо 53 гады, разумны ліст. Добры памятаю "Найвышэйшы загад" з гэтага ліста - бацька загадваў абодвум сынам неадкладна вярнуцца ў Геранёны і, зыходзячы з таго, што юрыст павінен быць практычным, а мастак легкадумным, я быў прызначаны главой гэтай "экспедыцыі" і скарбнікам, адказным за значную суму грошай гатоўкай, узятую у Ротшыльда. Таму 1-га ці 2-га жніўня я вярнуўся ў Парыж, куды праз Швейцарыю ўжо прыехаў мой брат.

О, вялікі, найсвяцейшы, беспамылковы, усяведны, узняты на крылах Духу, народ! Вечна ты будзеш кідацца ад крайнасці да другой. Насельніцтва Парыжа, якое толькі трыма тыднямі раней бязлітасна асуджала ўсе формы мілітарызму, мундзіры, нацыянальны сцяг і спачувала адраджэнню "братэрскай" нямецкай нацыі, сёння як статак вярблюдаў крычала: "На Берлін!". [...] Калі а 12-й гадзіне ночы мы пайшлі "даганяцца" ў самую папулярную "Кавярню Амерыкан" на Бульвары, яна была поўная людзей, якія хадзілі па нагах адзін у другога, браталіся, іх усіх цалавалі какоткі, і ўсе крычалі: "Праз месяц у Берліне!". А атрымалі Сядан, Мец, капітуляцыю Парыжа і камуну. [...]

Вечарам 6 жніўня, калі ўжо на вуліцах раздавалі дэпешы аб паразе пры Вёрце, мы выехалі з Парыжа ў Брусель, далей праз Антверпен, Ратэрдам, Хаге, Амстэрдам, Гарлем (усюды старанна наведваючы карцінныя галерэі), даехалі да Берліна і каля 31 жніўня былі ў Вільні. Не без здзіўлення, пасля "На Берлін!" у Парыжы, я заўважыў у немцаў той самы настрой стрыманасці і энергіі, якім у 1915-1918 гадах захапляўся ў французаў[83].

3-га ці 4-га верасня, пасля кароткага адпачынку ў Вільні, мы на конях выправіліся ў Геранёны. Тут са мной здарыўся цуд "яўрэйскай пошты", які я не магу растлумачыць. Раскажу, як гэта было. Калі мы выехалі з Вільні, дык з Пецярбургскіх дэпеш ведалі, што немцы не знайшлі ў Шалоне на Марне войскі маршала Мак-Магона і кінуліся за імі на паўночны ўсход. І вось за 10 вёрст ад Геранёнаў мы сустракаем Маркеля Івейскага (паплечніка вышэйзгаданага Янкеля Дудскага) з грузам збожжа, які паведамляе нам пра капітуляцыю Мак-Магона ў Сядане 2 верасня! У той час паміж Вільняй і Іўем не было аніводнай тэлеграфнай станцыі!

Гэты ваенны 1870-71 год быў для мяне вельмі цяжкім як фізічна, гэтак і маральна. [...] Я быў занепакоены паразамі маёй любімай Францыі. У мяне яшчэ не было дастатковага палітычнага вопыту, каб прадбачыць усе наступствы гэтай катастрофы, але я дастаткова ведаў гісторыю, каб разумець, што гаворка не можа ісці пра імгненнае зацьменне выпраменьвання, якім Францыя ззяла ўсяму свету ў 1860-1870 гадах і чыю сілу і бляск сёння не могуць ведаць тыя, хто не быў сведкам гэтага. Асабліва ўразіў пераварот 4 верасня 1870 года, калі вораг ішоў на Парыж фарсаваным маршам і без бою, без стрэлаў, без страт, пад націскам тлуму ў некалькіх тысяч асоб, якімі кіравалі некалькі сотняў "герояў кавярань", рухнула ўся сістэма французскай дзяржаўнай і вайсковай адміністрацыі. Пасля гэтага я не сумняваўся, што катастрофа была непазбежнай і яна будзе мець доўгатэрміновыя наступствы, аднак было балюча бачыць тую непрыхаваную радасць, з якой амаль што ўся тагачасная Еўропа глядзела на нямецкі трыумф, бо мне было зразумела - адна гегемонія зменіцца на іншую. У Вільні не толькі рускія, але і шмат хто-ніхто з мясцовых выказвалі сваё задавальненне тым, што Францыя з гэтага моманту будзе выконваць ролю ... яшчэ адной Партугаліі (я чуў гэта параўнанне дзесяткі разоў). Улічваючы маё тагачаснае стаўленне, чуць гэта было вельмі балюча.

Згаданая вышэй Марыя Тышкевіч (жонка Міхала Тышкевіча) да пачатку вайны з сынамі пераехала на ўсё лета ў маёнтак Гарадок, які за 3 вярсты ад Менска. Яшчэ да разводу муж перадаў ёй гэты маёнтак. На кані ад Геранёнаў да Гарадка каля 150 вёрст. Даведаўшыся пра

[83] Праз некалькі гадоў, у Флярэнцыі, састарэлы прынц д'Дына, дзед па маці Ксаверыя Арлоўскага, які ў 1870 г. аднаго сына меў у французскім войску, а другога ў прускай гвардыі, расказаў мне, што ў канцы ліпеня 1870 г., вяртаючыся ў Парыж, ён меў аўдыенцыю ў Вільгельма І. Той яму сказаў: *"Я пачынаю цяжкую вайну з моцным ворагам. Але я выйграю, бо маю над маім братам Напалеонам вялікую перавагу. Калі ваенная фартуна будзе яму спрыяць і ён загоніць мяне ў Кёнігсберг, дык там для майго народа і Еўропы я застануся каралём Прусіі. Але пасля першай жа рашучай паразы мой брат Напалеон стане толькі панам Банапартам"*.

вяртанне мяне і брата, яна з чалавекам даслала майму бацьку ліст (у той час гэта было яшчэ самым надзейным спосабам), каб мы з братам наведалі іх і падзялілі смутак яе сыноў, якія, як і мы, былі вялікімі франкаманамі. Прабылі мы там тры тыдні, і менавіта ў той час завязалася маё братэрскае сяброўства са старэйшым з двух братоў Юзафам. Нягледзячы на вялікую розніцу ў характарах, а можа, нават менавіта з-за яе, бо ён быў чалавекам сэрца, а я - розуму, сяброўства наша доўжылася ажно да яго смерці перад рэвалюцыяй 1905 г. Мы сустракаліся і ў Вільні, дзе пані Марыя праводзіла зіму, і ў Геранёнах, куды ён прывёз да мяне свайго школьнага калегу з Вярсаля пана Дзюпрэ, які ўсю аблогу Парыжа служыў афіцэрам у мабільнай гвардыі і адразу пасля капітуляцыі прыехаў у Літву, каб адпачыць і падхарчавацца, бо доўгі час еў пацукоў або, зрэдку, жывёл з заапарку. Сяброўства вельмі дапамагло мне вытрываць цяжкі боль за паразу Францыі.

Але гэта не дапамагло ад болю ў грудзях, які ўзмацніўся да такой ступені, што мой бацька спалохаўся і на пачатку 1871 года вырашыў адвезці мяне "да тых, хто умее". Покуль мы дабраліся да Варшавы, Парыж ускіпеў і мы палічылі за лепшае звярнуцца па параду да вядомага ў той час прафесара Шкоды ў Вене. Покуль дамаўляліся пра аўдыенцыю, выбухнула парыжская камуна (18 сакавіка). Лячэнне ў Шкоды (парамі шкіпінару) зрабіла столькі шкоды майму агульнаму стану, колькі карысці прынесла вестка пра падзенне камуны (20 траўня), пасля чаго я вырашыў ехаць у Парыж сваёй звычайнай дарогай праз Берлін, Кёльн і паўднёвую Бельгію.

Між тым у Расіі, і асабліва ў Пецярбургу, усю зіму лютавала халера, потым два гады яна яшчэ блукала па Еўропе, спарадычна і раптоўна завітвала і ў Літву. Геранёнская гміна засталася некранутай, як і гміна Лугамовічы, але ў суседніх бакштанскай і івейскай гмінах дзве вёскі Куправічы і Старчыняты былі спустошаны хваробай да такой ступені, што сюды давялося перасяляць сялян з іншых вёсак. Калі я прыязджаў у Вільню па замежны пашпарт, тут хавалі да сотні чалавек у дзень. Неўзабаве пасля майго ад'езду ахвярай сваіх цнотаў стала жанчына з анёльскай душой, жонка генерал-губернатара Патапава, якая цэлымі днямі сядзела ў лазарэтах. Паміж нябожчыцай і пані Марыяй Тышкевіч завязалася сардэчнае сяброўства, і менавіта пані Тышкевіч заплюшчыла ёй вочы. Першапачаткова засмучаны, бездапаможны і стары муж, перанёс сваю прыхільнасць на сяброўку нябожчыцы. З гэтага выйграла наша абшарніцкае грамадства. Добрая і паслужлівая пані Марыя карысталася сваім сяброўствам, каб умацаваць Патапава і атрымаць ад яго розныя асабістыя даброты, між іншым, права на куплю зямлі насуперак указу ад 10 снежня 1865 года. Першым такое права атрымаў яе швагер Юзаф Тышкевіч, потым віленскі маршалак - губернскі Аляксандр Дамейка (які не хацеў гэтым карыстацца) і Адам граф Плятэр, браты Багдан і Міхал князі Агінскія, Фелікс граф Плятэр на свой маёнтак, якому пагражала канфіскацыя, і некаторыя іншыя. Хоць самі яны мелі карысць з гэтага, але за маёнткі плацілі значна больш, чым голыя, як бізун, чыноўнікі, і кошт зямлі значна паднsocialяўся.

Я прыехаў у Парыж у сярэдзіне чэрвеня. Пакуль я не дабраўся да ваколіц сталіцы, не заўважаў слядоў сістэматычнага, звярынага знішчэння "бошамі", якое яшчэ і праз 2 гады пасля вайны выклікала абурэнне бесстаронніх гледачоў. Пасля гэтага было яшчэ 45 гадоў "паступовага" развіцця нямецкай культуры і тэхнікі.

У саміх варотах сталіцы, у прадмесці Сэн-Дэні, вакзал быў заняты востраверхімі прускімі каскамі. На галоўным вакзале (паўночным) і ў самім горадзе амаль што немагчыма было наняць дрожкі. У сталіцы кідаліся ў вочы не сляды блакады, а сляды знішчэння, якія пакінула камуна. Прыгажэйшая ратуша XVI ст. (потым адноўленая ў першапачатковым выглядзе), міністэрства фінансаў (на яго месцы стаіць гатэль "Кантыненталь"), каралеўскі палац Цюільры, з якога 4 верасня 1870 года ўцякла імператрыца Яўгенія (зараз зроўнены з зямлёй) ляжалі ў руінах, а палац Дзяржаўнага савета і Вышэйшай кантрольнай палаты, у якім я так часта бываў (сёння Арленскі вакзал), яшчэ дыміліся. Уражвалі поўныя нянавісці і прагі помсты позіркі, гэтыя позіркі беспамылкова бачыў любы ўважлівы даследчык у амаль што кожнага сустрэтага ім пралетарыя.

Бо на такія бязлітасныя рэпрэсіі, якія яны перажылі, не мог пайсці ніводзін маральна адказны перад гісторыяй і народам манарх, нават і Мікалай І. На мой погляд гэта адзіная перавага рэспублікі перад манархіяй - у такім катаклізме збавеннем можа стаць менавіта персанальная адказнасць. Брыгадны генерал, маркграф Галіфэ, чыя дывізія знішчыла тысячы паўстанцаў (у асноўным ужо раззброеных), не быў вінаваты: ён выконваў загады галоўнакамандуючага. Галоўнакамандуючы не быў вінаваты, ён выконваў загад урада. Урад не быў вінаваты, бо выконваў волю Нацыянальнага сходу. А тут кожны паасобку, мог казаць: "Гэта не я, гэта мае калегі", і ўсе разам яны маглі схавацца за грамадскай думкай.

І гэта было праўдай. Бо абурэнне ўсёй правінцыі супраць Парыжа дасягнула апошніх межаў лютасці, а ў самім Парыжы - абурэнне буржуазіі супраць камунараў, якімі тут лічылі ўсіх рабочых. У гэтым паўстанні, якое адбылося пад вокам пераможцаў-прусакоў, уся французская нацыя бачыла ганебную здраду радзіме. Калі я прыехаў, ужо не было экзекуцый на вуліцах, але яшчэ не закончыўся адлоў схаваўшыхся камунараў і адпраўка іх у лагер Саторы пад Вярсалем. Калі назаўтра пасля прыезду я наведаў майго былога патрона, пана Леана Клямента - ужо члена Нацыянальнага сходу, ён узяў мяне з сабой у Вярсаль. Па дарозе ў Парыж я ўбачыў тлумы цікаўных, якія збіраліся тут кожны дзень і чакалі камунараў, якіх гналі пешшу. Ад гэтых тлумаў веяла лютасцю, асаблівая нянавісць зыходзіла ад жанчын - яны кідаліся на нявольнікаў, каб парасонам выкалаць ім вочы.

*(Працяг у наступным нумары.)*



№ 39 (143) 25 ВЕРАСНЯ 2024 г.
наша СЛОВА.pdf

### *Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Покуль у 1875 г. пан Клямент не стаў сенатарам, ён часта браў мяне з сабой у Вярсаль і заўсёды неяк праводзіў у Нацыянальны сход, які засядаў у вялікай тэатральнай зале былога (да 1789 г.) каралеўскага палаца. Я нанюхаўся ў той час гэтых пахаў парламенцкай кухні і наслухаўся выступаў розных палітычных фокуснікаў, якіх потым імкнуўся пераймаць. Менавіта тады ў мяне з'явілася невылечная агіда да парламенцкай сістэмы (не блытаць з канстытуцыйнай). Акрамя Нацыянальнага сходу, ён часта вадзіў мяне ў Вярсаль. […]

На жаль, даволі шмат (да 200) нашых эмігрантаў 1863 г. на чале з "генералам" Дамброўскім, далучыліся да камуны. Гэта моцна адбілася на французскай грамадскай думцы аб нашай справе. Дрэннае стаўленне стала настолькі відавочным, што кузын Лясковіч адважыўся выйсці з дому толькі праз некалькі дзён пасля заканчэння баявых дзеянняў. Ён расказваў мне, што афіцэр, які заняў Люксембургскі квартал (гісторыкі пісалі, што вярсальскія ўлады атрымалі да 300 000 персанальных даносаў), адразу пайшоў у польскую кнігарню Уладзіслава Міцкевіча (сын Адама - *Л. Л.*) на Ру дэ Турон. Уладзіслаў у 1863 г., як і яго бацька ў 1831 г., афіцыйна не ўдзельнічаў у паўстанні і не прымаў удзелу ў камуне, але шмат "лётаў і пісаў". Даведаўшыся ад ні ў чым не вінаватага прыказчыка крамы, што Міцкевіча ўжо няма другі дзень, афіцэр спытаў: "А ты - паляк?". "Паляк", - і адразу да сценкі і кулю ў лоб. Потым Міцкевіч, дзякуючы пратэкцыі яшчэ жывых калег свайго бацькі па Сарбоне, неяк апраўдаўся і выбраўся са сваёй схованкі.

З таго часу марка "паляк" відочна стала нявыгаднай, добрай яна засталася можа толькі для некаторых ліберальных махляроў, для якіх Польшча служыла класічным барабанам. Ніводзін разумны француз не верыў у тое, што Провід, у які верыў наш Міцкевіч, стварыў Францыю, каб яна сваёй крывёю і багаццем выратавала Польшчу ад наступстваў уласнай немачы. Але з 1830-га па 1870-ты год французы - народ, які цэніць адвагу, якой і ў нас не бракавала, ставіўся да нашых эмігрантаў літасціва і са шчырым спачуваннем. Камуна паклала гэтаму канец. […]

Для "француза з вуліцы", палякі і іх генерал Дамброўскі (адзіны генерал камуны, які не стаў блазнам, а шукаў і знайшоў гераічную смерць), сталі здраднікамі іх айчыны. Пачалі глядзець на нас, як на небяспечных асоб, якія злоўжываюць гасціннасцю. І ажно да рускай рэвалюцыі ў нас пераважна бачылі зануд, якія перашкаджаюць раману з нібыта магутнай каханкай. А калі ў Брэст-Літоўску каханка аказалася бескарыснай блудніцай, мы зноў атрымалі годнасць мопса, які можа схапіць за лытку немецкага ваўкалака. Сёння яны, пэўна, задаюцца пытаннем, ці мае мопс зубы і ці не палічыць ён за лепшае ў вырашальны момант "пазбегнуць кровапраліцця"? […]

*[У далейшых раздзелах IX, X і XI Гіпаліт Корвін-Мілеўскі расказвае пра сваё жыццё ў Францыі, экзамены на навуковую ступень доктара і іншае.]*

### *Раздзел XII*

### *Сямейны падзел. Фларэнцыя*

Зімой 1875 г. мой старэйшы брат Ігнацы, які з 1870 г. пастаянна жыў у Мюнхене і выбраў сабе кар'еру прафесійнага мастака, хутка астыў да жывапісу і Мюнхена і ў рэшце-рэшт развітаўся і з жывапісам, і з гэтым горадам. Калі вясной 1876 г. мы ўсе разам сабраліся ў Геранёнах, нашы бацькі ўбачылі сваіх сыноў, аднаго 30-ці гадовага, а другога ўжо блізкага да гэтага ўзросту. Абодва - таленавітыя, поўныя жыцця, разнастайна і лепш адукаваныя, чым большасць іх сучаснікаў, але без працы, без прафесіі - як кажуць, звычайныя "сыночкі мамусі". У той момант з майго боку з'явіўся пэўны матрыманальны праект, які хоць і не дайшоў да рэалізацыі, але паставіў пытанне пра "сваё гняздо". Тады нашы бацькі цвёрда вырашылі падзяліць маёмасць паміж сынамі, яны мелі дастатковы капітал для забеспячэння для сябе шырокага дабрабыту і марылі перайсці ў "стан адпачынку".

Для свайго належнага выканання, такі праект патрабаваў адзінства паміж членамі сям'і, але з'явіўся ён у дрэнны для гэтага момант. Брат, які пасля ад'езду з Мюнхена, правёў частку зімы ў Рыме, вырабіў там у папскай канцылярыі годнасць кавалера Мальтыйскага ордэна і адначасова тытул графа, тытул абапіраўся на тое,

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

што ў часы Гаштольда, бацькоўскі маёнтак Геранёны быў папскім графствам. Гэты тытул, таксама, мог належаць і бацькам і, магчыма, мог распаўсюдзіцца на мяне. Наша маці, тып класічнай "дамы", не была ганарыстай і наогул не цікавілася тытулам. Але паколькі яна ніколі не магла ні ў чым адмовіць свайму першынцу і любімцу, прызначыла яму са свайго асабістага капіталу неабходную суму і такім чынам стала на бок новага графа. Мой бацька і я, абодва перакананыя кансерватары, прызнавалі вартасць рэальнай сусветнай іерархіі ў здаровым грамадстве і таму з агідай глядзелі на гэтую італьянскую ружу, прышпіленую да шляхецкага кажуха. Бацька да сваёй смерці, а я да сённяшняга дня, цалкам ігнаравалі гэты выдуманы тытул, быццам яго і не існавала. Дзякуючы такім падзеям, менавіта ў той момант, калі ажыццяўляўся задуманы бацькам праект падзелу маёмасці паміж сынамі, узніклі два лагеры, з аднаго боку - маці і старэйшы сын, з другога - бацька з малодшым.

Тым не менш, пад восень 1876 г. бацька ўжо меў праект падзелу. Паколькі падзел павінен быў уступіць у моц толькі наступнай вясной, я паехаў зімаваць за мяжу, але не ў нейкае звычайнае курортнае месца, а ў Італію, якую не ведаў.

У Парыжы я сустрэўся са сваімі сябрамі, братамі Юзафам і Янам Тышкевічамі і іх маці, пані Марыяй.

У гэтай сям'і адбыліся перамены, якія ў той час вельмі займалі наш віленскі бамонд, у тым ліку і з-за небывалай арыгінальнасці і самога ўчынку і яго выканаўцы. Пра гэта варта расказаць. У 1871 г. легендарны марнатравец, біржанскі ардынат Міхал Тышкевіч, развёўся са сваёй жонкай, і з 1863 года ён ні разу не быў у краі. З-за "ўрагану" 1863-1864 гадоў і "рэформ" Мураўёва ён сутыкнуўся з такімі фінансавымі праблемамі, што вырашыў атрымаць дастатковае пажыццёвае ўтрыманне і адмовіцца ад ардынацыі на карысць свайго старэйшага сына, а ад маёнтка Гарадок пад Менскам - на карысць малодшага сына і да канца жыцця жыць за мяжой. Панства Міхал і Марыя папрасілі майго бацьку выканаць гэты падзел. Паколькі менавіта ў 1871 г. эканамічныя ўмовы пачалі паляпшацца, чаканы даход ардынацыі значна павялічыўся, і Юзаф Тышкевіч стаў адным з самых заможных людзей у Літве. Гэта для яго стала добрай нагодай задаволіць свой "бзік", і ён гэтым скарыстаўся. Юзаф Тышкевіч лічыў, што валоданне агромністай ардынацыяй накладае шэраг абавязкаў, якімі ён, са сваёй бясконца добрай, артыстычнай і лянівай натурай не жадаў мець справу. Больш за тое, яго спецыфічны "бзік" (пра які я потым даведаўся ў с. п. Уладзіслава Замойскага з Курніка), палягаў у тым, што ўвесь час яго мучыла манія самаахвярнасці, пры якой дабро, зробленае іншым, было менш мэтай, а больш падставай каб накласці на сябе яшчэ новую і большую валасяніцу. А паколькі яго малодшы брат Ян, прыгожы ў маладосці як Апалон, свецкі і славалюбівы чалавек, марнаваўся ў кавалергардскім палку ў Пецярбургу, Юзаф Тышкевіч вырашыў на надзвычай сціплых умовах перадаць свой маярат брату. Але тое што зрабіў яго бацька, пан Міхал для свайго законнага спадкаемцы, было немагчымым для 26-ці гадовага нежанатага ардыната. Трэба было атрымаць адмысловы царскі "ўказ", які Аляксандр II напачатку адмовіўся падпісаць. Калі, дзякуючы пратэкцыі генерала Патапава, ён усё ж падпісаў неабходную паперу, дык зрабіў гэта з заўвагай: "Хіба гэты малады чалавек хоча стаць ксяндзом". [...]

Я мусіў спыніць сваё жыццё ў Фларэнцыі, бо адначасова атрымаў ад маці кароткі, а ад бацькі вялікі, але няўцямны ліст, з якіх выходзіла, што пасля майго ад'езду, на тле праектаванага падзелу маёмасці, паміж маім старэйшым братам і маці - за аднаго боку і маім бацькам - з другога, узнікла вялікае непаразуменне, у выніку якога, мой брат па даверанасці ад маці, атрымаў яе маёмасць, а пакрыўджаны бацька з'ехаў у Ніцу.

Праз тыдзень я быў у Ніцы і знайшоў бацьку вельмі сярдзітым. Потым, пасля некалькіх дзён у Парыжы, я вярнуўся ў Вільню. Тут я імкнуўся захаваць нейтралітэт паміж роўна любімымі мной бацькамі і як дрэнны дыпламат атрымаў незадавальненне з абодвух бакоў. У выніку сталася так, што мой брат атрымаў увесь маёнтак і рэзідэнцыю Геранёны, а таксама 3/4 вялікага ключа Лугамовічы (галоўнай яго вартасцю былі вялікія абшары некранутых лясоў), а я 1/3 гэтага ключа з дваром с. п. дзеда Самуэля Ваўка і ўвесь маёнтак Лаздуны, пасля смерці бацькі (ён жыў яшчэ 30 гадоў) я таксама павінен быў атрымаць і яго дзедзічны маёнтак Цыцін. [...]

Я атрымаў сваю маёмасць восенню 1877 г., і з гэтага пачаўся 20-ці гадовы кавалак жыцця - паміж маімі 28 і 50 самымі плённымі гадамі, якія ў выніку аказаліся настолькі нуднымі і нават бескарыснымі, што я пастараюся, як падарожнік па глухой і манатоннай раўніне, перасекчы гэтую прастору часу ... рыссю.

## *Раздзел XIII*

## *Сельская гаспадарка. Аляксандр III. Пецярбург. Масква*

На першы погляд, ва ўзросце 28 гадоў мець больш за 8000 га літоўскай зямлі сярэдняй якасці без якіх-небудзь даўгоў і выплат, выглядала прыгожым падарункам лёсу і, верагодна, выклікала зайздрасць у многіх маладых людзей майго класа. Але, фактычна, жыццё з гэтым капіталам у спалучэнні з маім выхаваннем і мінулым, гарантавалі мне ўмовы жыцця раба на галерах, якога будуць выпускаць для кароткага адпачынку за мяжу на вольнае паветра - штогод на два-тры месяцы. І што яшчэ горш, добраахвотны галернік павінен быў заўсёды памятаць пра свой абавязак.

Размяшчэнне маёнтка было наступным: самая блізкая чыгуначная станцыя - Вільня, да яе 120 км. Пошта два разы на тыдзень - на пачатку 60 км а потым толькі 15. Каля мяне 5 вялікіх маёнткаў, у якіх спрадвеку не жылі

спадкаемцы а толькі эканомы і арандатары. Ніякай рэзідэнцыі - у Лугамовічах стаяў прадзядоўскі драўляны "палац" часткова заняты адміністрацыяй, нежылая частка (2/3 "палаца") не ацяплялася ўжо 20 гадоў, яна была заражана невылечным грыбком, і "палац" трэба было пакінуць дагніваць ці ад падмурка пабудаваць новы. У суседніх Лаздунах бацька перад самым паўстаннем пачаў будаваць фундаментальны, вялікі і вельмі добра распланаваны мураваны "палац", пабудаваў сутарэнні і 1-шы паверх, але, пасля паўстання, накрыў яго і перавёў сюды эканомаў і частку чэлядзі з ужо гнілога радзівілаўскага "палаца".

Што тычыцца гаспадарання, дык з 9 вялікіх фальваркаў, 3 былі ў арэндзе ў вучняў Трыпталема (герой грэцкіх міфаў, з яго імем звязваюць увядзенне ў Грэцыі земляробства - *Л. Л.*), а ў 6 іншых, плошчай у 3500 га палёў і лугоў, выкарыстоўвалася аграномія часоў Вергілія - драўляныя сохі, бораны, драўляныя восі ў вазах, малатарні і манежы. Трохполле, толькі дванаццатая частка палёў бачыла ўгнаенні, астатнія - т. з. "простаполле". Аралі валамі, мелася 200 штук быдла і гадавы надой з каровы быў 600 літраў. У выніку штогадовы дэфіцыт папаўняўся з так званых "гатовых грошай", з якіх дзедзічу заставалася менш, чым сума выплат заробкаў чыноўнікаў, г. з. столькі, колькі трэба для сціплага жыцця ў нашым краі без мары пра выезды за мяжу, без якіх, я ведаў, мяне хутка ахопіць чорная меланхолія. Я не сумняваўся, што ўспадкаваная маёмасць пры адпаведнай працы можа прынесці дастатковы даход, для гэтага ў мяне меўся абаротны капітал і адукацыя. Між тым, прынцып не дазваляў узяць пазыку ў Зямельным банку - я лічыў яго Дантавым пеклам. А што датычыць адукацыі, дык павага да мяне з боку успадкаванага ад бацькі эканома моцна знізілася, калі мы з ім праязджалі каля поля, на якім нешта зелянела, і я, з душэўнай прастатой, спытаў у яго: "Гарох гэта ці бульба?". Гісторыкі, філосафы і літаратары, усе яны маўчалі пра гэта, хоць валасы ірві на галаве!

Мяне выратавала шчаслівая акалічнасць і, як і раней, мудры і добры чалавек. Менавіта ў 1877 г. з-за турэцкай вайны, засухі ў чарназёмнай Расіі і абвалу валюты, цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю хутка выраслі з 50-60 кап за пуд жыта да 1 ці нават 1,2 руб, а кошт рабочай сілы не рушыў з месца. Гэтак працягвалася цэлых 3 гады, і я адразу ліквідаваў грашовы дэфіцыт, бо пераважна яго стваралі крадзяжы, марнатраўства і неахайнасць. Як шалёны я лётаў на конях, заглядваў у кожны куток, не шкадаваў вінаватым "моцнага слова", хоць і на іншай мове і ў іншым стылі, чым у Касацыйным парыжскім судзе. Я не выкараніў зло (а хто гэта можа?), але правёў значную "санацыю", і гэта адразу адбілася на даходах.

А "добрага самарыцяніна" я знайшоў у асобе мудрага і зычлівага … немца. Ва ўсім краі была толькі адна гаспадарка (да адмену прыгону і паўстання), якая вялася прагрэсіўна і рацыянальна, а менавіта гаспадарка графа Храптовіча, апошняга па-мячы нашчадка гэтага знакамітага літоўскага роду, зяця графа Несяльродэ. Ён меў ужо больш за 70 гадоў і кожны год на некалькі летніх месяцаў прыязджаў у свой маёнтак Шчорсы ў Навагрудскім павеце, за 10 міляў ад Лугамовічаў. Таксама ён меў агромністы маёнтак Бешанковічы на Віцебшчыне і вялікі маёнтак Вішнева на мяжы з Лаздунамі. Гэтымі двума маёнткамі здаўна кіраваў саксонец, прафесійны аграном Фішар, якога надзялілі вельмі вялікімі правамі. Ён меў вельмі высокую рэпутацыю ў нашым краі. Ведаючы, што Храптовіч, з якім я сустракаўся ў Ніцы, даручыў яму быць гасцінным для абшарнікаў, якія жадаюць агледзець гаспадарку, я зліставаўся з ім і на некалькі дзён выбраўся ў Шчорсы.

Фішар меў тады 50 гадоў, быў вельмі прыгожым мужчынам і ўжо добра размаўляў па-польску. Сустрэў мяне вельмі прыязна і цэлы тыдзень вадзіў мяне паўсюль, расказваў і ўсё тлумачыў, а я, як на курсах, усё запісваў. Праз які тыдзень, едучы ў Вішнева, ён заехаў у Лугамовічы. Відочна, ён зацікавіўся маёй гаспадаркай і дэталёва пазнаёміўся з усёй маёй эканомікай. Вельмі разумна параіў мне лічыць Шчорсы хутчэй ідэалам і пераймаць толькі тое, што дае добрыя вынікі ў Вішневе - у гаспадарцы, ідэнтычнай з маёй. Навучыў мяне галоўным прынцыпам "канстытуцыі" гаспадара, якую я запісаў і потым няўхільна прытрымліваўся на працягу амаль што 40 гадоў.

Галоўныя артыкулы гэтай канстытуцыі былі наступныя: вылучыць бюджэт на асабістыя выдаткі - ён не павінен перавышаць 2/3 чыстага даходу, а рэшту прысвяціць на прагрэсіўнае развіццё гаспадаркі, і калі часова няма аказіі з карысцю ўкласці грошы, адкласці гэтыя сродкі. Паколькі, дзякуючы вышэйназваным спрыяльным абставінам, мой асабісты даход ніколі не апускаўся ніжэй за 6000 руб, а я ў сваёй пустыні пражываў значна меней, таму я мог дазволіць сябе штогадовы адпачынак па тры - чатыры месяца ў Парыжы ці на Рыўеры і гэтак увесь час пазбягаць меланхоліі[84].

Па прынцыпе "хто шырока абдымае, той слаба сціскае", здаў у арэнду тры лугамоўскія фальваркі і сканцэнтраваў іх інвентар і сваю працу на тры лаздунскія, дзякуючы чаму, у першы ж год гэтыя тры фальваркі далі мне больш чыстага даходу, чым ранейшыя шэсць. У 1880 г. часткова адрамантаваў палац у Лаздунах і пераехаў у яго, пакінуўшы прадзедаўскі "палац" у Лугамовічах. Значна пазней, калі прадукцыя гаспадаркі і колькасць інвентару дасягнулі неабходнага максімуму, які дазваляла якасць зямлі, вярнуў з арэнды два фальваркі.

[84] Не магу не адзначыць умовы жыцця гэтага "раба на галерах". "Раб" штогод 3 - 4 месяцы праводзіў у Парыжы ці на Рыўеры, і толькі каля 8 месяцаў у год займаўся працай менеджара. Вось такое "рабства" на сваёй прыватнай маёмасці. Здаецца, аўтара ўспамінаў можна ахарактарызаваць як ганарлівага, добра адукаванага чалавека з высокай самаацэнкай, але з сярэднімі талентамі. - *Л. Л.*




Указ 10 снежня 1885 года, а таксама пастаянна абяцаныя і нават у 1887 годзе часткова рэалізаваныя пагрозы ў бок польскай уласнасці, прымушалі мяне сканцэнтраваць выдаткі на тых напрамках, якія маглі неадкладна або хутка акупіцца, як, напрыклад, шырокае выкарыстанне невядомых у той час у нас штучных угнаенняў, колькаснае павелічэнне і якаснае паляпшэнне інвентару і пазбяганне дарагой меліярацыі зямлі (дрэнажу, ірыгацыі і г. д.), якая ў выпадку экспрапрыяцыі, хоць бы нават і пры фіктыўнай, як у 1865 годзе, кампенсацыі, змарнавала б мае грошы. Гэтыя страхі і гэтая стрыманасць, як паказалі падзеі, не былі апраўданыя, бо яны скончыліся толькі пагрозамі, але ў высокай ступені яны спраўдзіліся ў больш позні час, калі ў 1919 г. край быў вызвалены як "ваенная здабыча" паноў Пілсудскага і Асмалоўскага[85], а потым, у 1920 г. падчас акупацыі на працягу года польскімі войскамі са звычайнымі ў такіх выпадках спусташэннямі, канфіскацыя зямлі для ваенных асаднікаў, надзяленне зямлёй дробных арандатараў і дваровых служкаў, сельскагаспадарчая рэформа, якая мела форму спланаванай вайны з абшарніцкай уласнасцю ў нашым краі - усё гэта прымусіла мяне і іншых абшарнікаў да ліквідацыі маёнткаў па значна ніжэйшых цэнах, чым у свой час каштавала б меліярацыя, ад якой я меў асцярожнасць устрымацца.

Галоўнай часткай загаду, які я сам сабе даў, было навучыцца майму новаму рамяству альбо з кніг, альбо праз пераймание вопыту лепшых нямецкіх, французскіх ці польскіх гаспадарак. Пры гэтым трэба было не пераймаць ніякіх новых інавацый, покуль яны не пройдуць эксперыментальнай апрабацыі ў меншым маштабе.

Не ўдаючыся ў падрабязнасці маіх дасягненняў і рэформ, адзначу, што няўхільнае і паслядоўнае прымяненне майго самазагаду, прынесла мне вялікую карысць перш за ўсё таму, што ў маіх уласных вачах, ушляхетніла, уласна кажучы, мой нескладаны занятак "грэчкасея", бо надала яму навуковую афарбоўку. Мой энтузіязм падтрымліваўся заўважным штогадовым прагрэсам. Што да вынікаў, якія і павінны быць адзіным вымярэннем чалавечай дзейнасці, дык я не толькі ператварыў пустку, якую атрымаў у 1877 г. у адну з лепшых і вядомых у нашым краі гаспадарак, але і шматразова павялічыў колькасць прадукцыі, выробленай для агульнага спажывання і яшчэ ў большай ступені павялічыў заробкі людзей вакол мяне, а таксама здолеў дасягнуць ідэалу практыкуючага абшарніка - адначасова ўзняць і ўзровень культуры маёнтка, і яго даход. Выпадкова ў мяне застаўся мой баланс за 1904 г., складзены яшчэ да смерці бацькі, ад якога я ўспадкаваў значны капітал. З балансу вынікае, што пражыўшы ў сваім маёнтку каля 30 гадоў, я аздобіў яго і павялічыў кошт і чысты даход. На 1 студзеня 1904 г. меў на некалькі дзясяткаў тысяч рублёў чыстага даходу больш, чым атрымаў ад трох буйных продажаў лесу. Іншымі словамі, з усяго, чым я займаўся ў сваім доўгім жыцці - навукі, музыкі, красамоўства, публіцыстыкі, палітыкі - адзінае, што мела сапраўдную карысць для мяне і краю, было тое, за што я, не маючы ні таленту, ні падрыхтоўкі, ні запалу, узяўся толькі з-за цяжкага націску "сабачага абавязку", і гэта была менавіта - сельская гаспадарка[86].

Сярод нуднай аднастайнасці гэтага больш, чым дваццацігадовага жыцця адукаванага "музыканта", варта згадаць два эпізоды, якім я абавязаны сваім першым знаёмствам са сталіцай маёй тагачаснай дзяржавы Пецярбургам і з аратарскім хростам на рускай мове.

У 1885 г., калі гаспадарка пачала ўжо набываць чалавечы твар, адначасова з адкрыццём руху па новапабудаванай чыгунцы (Вільня - Ліда - Баранавічы і далей на Кіеў ці Адэсу), з-за чаго да бліжэйшай для мяне станцыі сталася 55 км (замест ранейшых 110), я па рэкамендацыі старой і вельмі пабожнай сяброўкі (гэта самае небяспечнае) замяніў свайго гуляку-эканома на шляхетнага ідыёта. Меў на продаж 80 галоў буйной рагатай жывёлы. Новы эканом, які раней добра прадаваў на віленскім рынку па некалькі валоў, кіруючы малой гаспадаркай каля Вільні, замест таго каб, як раней, прадаць адразу ўвесь гурт аптавіку, угаварыў мяне дазволіць яму адвезці гурт у Вільню і прадаць быдла рэзнікам. Ён прыгнаў гурт як раз на раніцы таго дня, калі генерал Камароў пад Кушкай разбіў афганскае войска. У наступныя некалькі тыдняў, покуль не выявіліся вынікі баязлівага саперніцтва паміж Гладстанам і Аляксандрам III, уся Еўропа штогадзіны чакала вайны паміж "кітом і сланом", як казаў Бісмарк. Нядаўна закладзеная ў Лібаве англійская кампанія па экспарце марожанага мяса апавясціла па тэлеграфе па ўсёй лініі Лібава-Ровенскай і Палескай чыгунак, што спыняе справу і больш не скупляе валоў. Да гэтага дня яна штотыднёва адпраўляла ў Англію больш за 1000 валоў. І адразу на віленскім рынку, з ранку за вала пачалі даваць 60 руб, у абед - 40, назаўтра - 20, а вечарам наступнага дня меней, чым каштуе скура, акрамя таго не было корму (за мае валы можна было атрымаць каля 80 руб за галаву). Ідыёт прыгнаў быдла ў Лаздуны і разам з ім прывёў сюды чуму буйной рагатай жывёлы.

Занепакоены неасцярожнасцю майго неўдалага ідыёта, я своечасова заўважыў, што ўсё быдла ў Лаздунах асуджана і заставалася толькі ратаваць быдла ў іншых фальварках і вёсках. Паведаміў уладам і, нягледзячы ні на што, аб'явіў каранцін вакол двара. Прыехала камісія ў складзе галоўнага губернскага ветэрынара (яўрэя), нейкага ўкраінца на "-енка" і павятовага спраўніка Сабалеўскага - спецыяліста па навяртанні ў праваслаўе.

Падчас абеду ветэрынар з вялікім апломбам прачытаў нам палымяную лекцыю пра чуму буйной рагатай жывёлы, з якой вынікала, што "паводле апошніх навуковых

[85] Ежы Асмалоўскі (1872-1952), нарадзіўся ў маёнтку Падпінск (каля Пінска). У 1919-1920 гг. камісар Цывільнай ўправы ўсходніх земель. - *Л. Л.*

[86] Зараз з гэтага маёнтка і гаспадаркі нічога не засталося, але гэта іншая рэч. Тое, што варвары-немцы знішчылі Рэймскі сабор, не кажа, што ён быў дрэнна пабудаваны.

вердыктаў" пэўным і беспамылковы сімптомам гэтай хваробы з'яўляецца павышэнне тэмпературы. [...]

Камісія, не доўга думаючы, пакінула мне пратакол аб знішчэнні майго быдла і з'ехала, даручыўшы мне трымаць каранцін і дэзінфекцыю, што я і зрабіў.

Заставалася толькі ратаваць самога сябе ад цяжкіх эканамічных страт. Расійскі урад, замест таго, каб нешта ўзяць з пацярпелага за клопаты чыноўнікаў, кампенсаваў гаспадарам за забітае па яго загадзе быдла і нават, не выкручваўся ад рэальнай аплаты грашыма. Але ўлады плацілі па тарыфе, як за простыя сялянскія жывёлы. Таму за забітых у мяне 300 з нечым жывёл, я атрымаў бы больш за 8000 руб. Аднак мелася агаворка, што за пародзістае быдла выплаты могуць быць павялічаны ў два разы, і рашэнне ў гэтай справе залежала не ад губернскіх уладаў, а ад дэпартамента аховы здароўя Міністэрства ўнутраных спраў. Таму я выбраўся ў Пецярбург.

Гэты горад існуе не поўныя 200 гадоў і акрамя прыгожай Нявы, якую, калі ўбачыў, ужо ніколі не забудзеш, пакінуў у мяне ўражанне таннага Берліна[87], асабліва ў параўнанні з адвечнымі сталіцамі сапраўднай Еўропы. Тым больш, што ў той час, дзякуючы алавянай уладзе Аляксандра III, горад быў на палову мёртвы. Цар не любіў Пецярбург, у якім на яго бацьку было зроблена столькі замахаў[88], і пад уздзеяннем рускіх нацыяналістаў думаў перанесці сталіцу ў Маскву. Таму падчас майго знаходжання ў Пецярбургу, камяніцы прадаваліся за паўцаны. У горадзе я знайшоў майго дэрптцкага сябра Людвіка Гельмярсэна, які ў той час быў намеснікам дырэктара ўрадавых тэатраў. Ён паказаў мне ўвесь горад і спрыяў прыёму нядаўна прызначаным таварышам міністра фон Плеве, які быў забіты ў 1904 г. [...] Плеве пакінуў аб сябе ўражанне "бязлітаснага" квартальнага надзіраценя, сваёй казачнай кар'ерай ён быў абавязаны выпадку, пра які ў той час шмат казалі. Просты латыш (па бацьку ён паходзіў з нямецкіх дваран - *Л. Л.*), перайшоў з каталіцтва (меў імя Вацлаў) і ў канцы панавання Аляксандра II быў пракурорам Пецярбургскай судовай палаты. Пасля выбуху ў кардэгардыі Зімовага палаца[89] і размешчанай над ёй царскай сталовай ён вёў следства і зрабіўператрус усяго палаца. Як быццам, над самым тронным залам, Плеве знайшоў ... карову, якая належала аднаму з вартаўнікоў палаца[90]. Гэтая "геніяльная" знаходка зрабіла ўражанне на цара, які неадкладна прызначыў яго дырэктарам дэпартамента паліцыі, а пры Аляксандры III ён стаў таварышам міністра і меў пад сабой дэпартамент аховы здароўя. Плеве не прыняў маю прэтэнзію, бо, як быццам, такія выплаты не рабіліся з агульнадзяржаўных сродкаў, а толькі з адмысловага страхавога фонду, які ў той час заканчваўся. Я вярнуўся ні чым, дарэмна страціў тысячу рублёў на "бестэрміновую і беспрацэнтную пазыку" губернатару, вядомаму ў пецярбургскіх літаратурных і арыстакратычных колах - ён даў мне даведку аб тым, што мае быдла было пародзістым.

У гэтым месцы сумленне прымушае мяне зрабіць адступлення, каб абараніць ... расійскае царскае хабарніцтва. У той час, калі яго не было ў па-сапраўднаму цывілізаванай Еўропе, крытыка і жарты над хабарніцтвам былі цалкам зразумелымі. Сёння, калі дзякуючы прагрэсу і "пераацэнцы каштоўнасцяў" пасля Сусветнай вайны, хабарніцтва распаўсюдзілася па ўсім краі Нібелунгаў (Германіі - *Л. Л.*) і нават падчас рэпарацый за нямецкае спусташэнне дайшло да пачціівай Францыі, я смела кажу, што расійскае хабарніцтва, якое я ведаў і адчуваў на працягу 40 гадоў свайго гаспадарання, было інстытуцыяй, калі не вартай захаплення, дык па меншай меры, вартай адноснай павагі. Маючы за сваёй спіннoй стагоддзі гісторыі, гэтае хабарніцтва стварыла сваю традыцыю, сваю спецыяльную этыку, якую можна было параўнаць са свецкай ветлівасцю і іншымі звычкамі, якія сваёй устойлівасцю абавязаны доўгай гісторыі і вопыту. Галоўнымі і надзвычай каштоўнымі для прыватных асоб прынцыпамі этыкі хабарніцтва, былі: па-першае, хабар даваўся ў адпаведнасці з рангам чыноўніка (по-чину), па-другое, хабар быў строга прапарцыянальны кошту справы і цяжкасці яе выкання, г. з. ступені неабходнага пры гэтым беззаконня, па-трэцяе, хабарнік браў, але рабіў справу. Калі мой брат Ігнацы паскардзіўся губернатару Сцяблін-Каменскаму на нейкага паліцэйскага, які браў хабар і не вырашаў справы, губернатар, наогул добры да сваіх падначаленых, з вялікім абурэннем прагнаў гэтага паліцэйскага, але не за тое, што браў, а за тое, што не рабіў. Гэта быў парадак, пры якім чалавек мог займацца гаспадараннем. А сёння? Сучаснае хабарніцтва ў параўнанні з ранейшым расійскім, гэта як джаз у параўнанні з сімфоніяй Бетховена.

У часе паміж маёй першай паездкай у "матушку Россию" і наступнай паездкай у Маскву, у маім асабістым жыцці адбылася падзея, пра якую немагчыма прамаўчаць. У 1888 годзе я ажаніўся з паннай Казімірай Галынскай з роду Плятэраў. "Чаму, дзеля чаго", - як казаў Леметр пра шлюб Шатабрыяна? Ёсць наша прымаўка, што дваццацігадовага мужчыну жэніць сям'я, трыццацігадовы жэніцца сам, а саракагадовага жэніць чорт. А мне ішоў якраз саракавы год.

*(Працяг у наступным нумары.)*

[87] У той час Берлін толькі нядаўна стаў сталіцай аб'яднанай Германіі і толькі яшчэ даганяў іншыя, старыя сталіцы, у выгодах жыцця, архітэктуры і г. д. - *Л. Л.*

[88] Цар Аляксандр II перажыў 5 замахаў, 6-ты стаў для яго смяротным. - *Л. Л.*

[89] 5 лютага 1880 года, нарадаволец Халтурын, які працаваў у палацы сталяром, узарваў бомбу пад кардэгардыяй, у выніку чаго загінула шмат жаўнераў. - *Л. Л.*

[90] Карова і насамрэч тады была знойдзена ў Зімовым палацы, якую трымалі там, як быццам, дзеля малака для дзяцей лакеяў. - *Л. Л.*



№ 40 (144) 2 КАСТРЫЧНІКА 2024 г.
наша СЛОВА.pdf

### *Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Гэты шлюб з'яўляўся вынікам заўзятага палявання цнатлівых матрон на сталых халасцякоў у нашых сферах, ён не быў і не мог быць шчаслівым як з прычыны вельмі розных характараў і спосабаў мыслення парыжаніна і карэннай беларускі (менавіта гэтак у тэксце - "rdzennej Bialorusinki" - *Л. Л.*), так і з-за жаласнага стану здароўя маладой жонкі, якая была канстытуцыйна не здатная да мацярынства, гэтага моцнага цэменту, які трымае разам столькі няўдалых шлюбаў. Наш домператварыўся ў клініку на чале з сумленнай, але знеахвочанай медсястрой. Дзякуючы добраму выхаванню і адказнасці абодвух бакоў, сумеснае жыццё доўжылася 10 гадоў, закончылася добраахвотна і без усякай рэўнасці. С. п. пані Казіміра памерла толькі пасля сусветнай вайны.

Паколькі гэты змрочны перыяд майго жыцця супаў са "свінцовымі" часамі канца панавання Аляксандра III і пачаткам наступнага царавання, ён ніяк не адбіўся на маёй грамадска-палітычнай кар'еры.

Як толькі я пераняў маёнткі Лугамовічы і Лаздуны, зачыніў дзве дапатопныя вінакурні, дзе яўрэі-вінакуры мералі тэмпературу сусла сваім локцем. [...] Каля 1890-га года арганізаваў рацыянальны севазварот і павялічыў ураджай бульбы на 100 %, галоўным чынам з-за шырокай вытворчасці касцяной мукі, уведзенай па прыкладзе Шчорсаў. Для такой колькасці бульбы не было збыту, і менавіта тады, амбіцыйны дырэктар дэпартамента ўскосных падаткаў Аляксей Сяргеевіч Ярмолаў, мой пазнейшы калега па Дзяржаўнай думе, па прускім узоры, але яшчэ з большымі прывілеямі, выдаў пастанову аб сельскагаспадарчым вінакурніцтве. Тады я вырашыў заснаваць у Лаздунах магутную паравую вінакурню, якая магла вырабляць да 3000 гекталітраў бязводнага спірту. Як раз тады, у 1891-1892 гадах усю Еўрапейскую Расію напаткала падвойная бяда. За захадзе, прыкладна ад лініі Заходняй Дзвіны і Дняпра было такое дажджлівае лета, што палова бульбы згніла, а на Усходзе стаяла такая засуха, што ў 14 чарназёмных губернях, пасеяўшы, не сабралі нават на насенне. Дырэктары дэпартаментаў сельскай гаспадаркі і ўскосных падаткаў страцілі галаву ад думкі, што ў Расіі скончыцца хлеб і гарэлка, спажыванне якой давала дзяржаве галоўны даход. Першы з іх дамогся ўказу аб забароне ўсялякага вывазу збожжа за мяжу, у выніку чаго пачалася паніка і цана збожжа імкліва вырасла з 40 з лішкам капеек за пуд да 1,3 рубля. З другога боку Ярмолаў распачаў лютую прапаганду сярод уладальнікаў вінакурняў, каб яны выраблялі як мага больш спірту і аблягчыў ім імпарт бесарабскай і румынскай кукурузы, даў крэдыты і г. д. І два мудрацы дабіліся свайго, бо нягледзячы на неўраджай у 14 губернях, у 48 іншых і ў Сібіры, ураджай жыта быў такі добры, што Расія не магла яго спажыць сама. Цэны падалі яшчэ хутчэй чым узнімаліся восенню. А мудрэц Ярмолаў выклікаў такую перавытворчасць спірту, што менш прадбачлівыя вінакурныя заводы ўжо не маглі вырабляць спірт з-за недахопу месца для яго захоўвання. Сярод уладальнікаў вінакурняў па ўсёй краіне ўзняўся страшэнны гвалт, і паколькі шмат хто з іх меў моцнае становішча пры двары, Ярмолаву ўдалося атрымаць ад Аляксандра III, нягледзячы на непрыязнасць цара да ўсякіх маніфестацый і грамадскіх аб'яднанняў[91], дазвол на скліканне ў Маскве ўседзяржаўнага з'езда гаспадароў вінакурняў.

Я сам "тануў" у сваім спірце і таму паехаў на гэты з'езд. З'езд быў шматлікім, на ім сабралася каля 500 уладальнікаў вінакурняў з усёй краіны. Гэты быў першы з часоў Земскіх сабораў XVII ст. вялікі сход рускага абшарніцтва. Таму мы не ведалі, ні з чаго пачаць і ні як даць сабе рады. Большасць удзельнікаў мела вельмі слабое ўяўленне аб гэтай справе, бо яны наймалі радцаў і вінакураў. Таму ў практычных пытаннях рэй пачалі весці бал-

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[91] Мне потым расказаў тагачасны Маскоўскі губернскі прадвадзіцель дваранства князь Трубяцкі, як у той час дваранства гэтай губерні, хоць і было прасякнута манархічным духам, але выказала жаданне, каб губернскім прадвадзіцелям дазвалялася раз у год (як і губернатарам) мець асабістую аўдыенцыю ў цара для дакладу яму аб стане губерні і патрэбах дваранства. Узбуджаны такім "вольналюбствам" Аляксандр III на рапарце аб гэтым міністра унутраных спраў напісаў у народны стылі сваім знакамітым блакітным алоўкам: "Иж чего захотели?", - і справе канец.

тыйскія бароны і палякі. Памятаю Фелікса графа Чапскага, двух прадстаўнікоў варшаўскай рэктыфікарні Клянеўскага і Пражмоўскага, Мечыслава Яленскага і прадстаўніка Храптовіча - Захарэўскага.

Тым не менш, адбыліся цікавыя і ў цэлым змястоўныя дыскусіі, за выключэннем тых момантаў, калі выступаў (а гэта было па некалькі разоў на кожным пасяджэнні), вядомы потым як трыбун Дзяржаўнай думы, мой добры знаёмы Фёдар Ізмайлавіч Родзічаў, той самы, што здабыў сябе славу з-за сваёй вымовы манарху, у выніку чаго быў ён зняты з пасады абранага прадвадзіцеля дваранства. Як добры прамоўца (хоць і дэкламатар), ён умеў накіраваць усе пытанні пра бульбу, кукурузу, солад, тэхнічнае абсталяванне, рэктыфікацыю, рознічны продаж і г. д. у бок грамадзянскіх і чалавечых правоў і народнага прадстаўніцтва.

Нягледзячы на тое, што тады я ўжо даволі добра ведаў рускую мову (дзякуючы цікаўнасці да літаратуры, гісторыі і перыядычнай прэсе, а таксама звычцы асабіста вырашаць усе мае маёмасныя справы ў кабінетах і судах), я ўсё ж адчуваў слабасць у размоўнай мове, бо ў Вільні з 1865 г. мала кантактаваў з рускімі і, па меры магчымасці, карыстаўся з імі французскай мовай. Таму ў першыя дні я не браў актыўнага ўдзелу ў абмеркаваннях. Добра памятаю, як потым, калі я падумаў, што магу сказаць нешта карыснае пра рознічны гандаль і інстынктыўна падняў руку, і яшчэ да таго як Ярмолаў зрабіў мне знак, што запісаў мяне выступаць, з'явілася думка: "Ці вылезе што небудзь з майго горла, ці не?". Вылезла і нават нядрэнна, бо слухалі мяне ўважліва. Пасля гэтага я браў чынны ўдзел у дэбатах, асабліва вечарамі, калі пасля закрыцця афіцыйных пасяджэнняў, актыўныя дэлегаты з'езда збіраліся ў вялікім салоне гатэля. Менавіта падчас тых даверлівых гутарак, фактычна і быў напісаны праект увядзення гарэлачнай манаполіі, які, як вядома, стаў для расійскай адміністрацыі нечаканым поспехам.

Вяртаюся да галоўных грамадска-палітычных падзей у нашым "паўночна-заходнім краі" за гэтыя 20 гадоў (1877-1898).

Генерал Альбядзінскі[92] прабыў у нас нядоўга. У 1879 годзе ён быў пераведзены ў Варшаву, дзе і памёр, пакінуўшы пасля сябе добрую памяць. Яго змяніў герой Крымскай і апошняй Турэцкай вайны генерал Татлебен[93]. Ён, як курляндзец, не ставіўся да нас дрэнна, а наступны факт сведчыць, што ён быў даволі прыстойным чалавекам. Неяк яму прапанавалі на вельмі выгадных умовах набыць шыкоўны маёнтак Кейданы, што на Ковеншчыне, які належаў Мар'яну Чапскаму і быў канфіскаваны ў скарб. Чапскі ў той час знаходзіўся у Пецярбургу і Татлебен, сустрэўшыся з ім, сказаў, што калі Чапскі мае нават найменшую надзею аднойчы вярнуцца ў свой маёнтак, тады генерал адмаўляецца ад пакупкі, а калі не, дык просіць фармальнай згоды былога дзедзіча, бо мае намер зрабіць вялікія інвестыцыі ў гэты закінуты маёнтак і не хоча ў сваім сумленні адчуваць сябе толькі яго часовым уладальнікам. Мар'ян Чапскі не меў ілюзій і даў дазвол. Але Татлебен, як і ўсе балтыйскія немцы таго часу, быў перш за ўсё службістам. Ён прывёз з сабой кіраўніка сваёй канцылярыі, маладога і амбітнага курляндца барона Грэвеніца (пазнейшага губернатара), які марыў аб кар'еры, а найбольш лёгка яе можна было зрабіць на нашых спінах.

У гэты час памёр стары Аляксандр Дамейка, а яго пасаду губернскага маршалка заняў Адам граф Плятэр. Яшчэ быў жывы Аляксандр II, і было не вельмі зразумела ў які бок дзьме вецер. Калі ў некалькіх уплывовых абшарнікаў з'явілася думка заснаваць у Вільні сельскагаспадарчае таварыства па прыкладзе суседняй Менскай губерні, дзе такое таварыства ўзнікла дзякуючы руплівым намаганням Эдварда Вайніловіча, Плятэр па добрай волі ўзяўся за справу. Ён склікаў у сябе вельмі вялікі сход, на якім пад старшынствам цывільнага губернатара Сцебліна-Каменскага быў падрыхтаваны праект статута. Плятэра абралі старшынём, а Адольфа Ялавіцкага[94] віца-старшынём таварыства. Уся справа была перададзеная генерал-губернатару. Тут Грэвеніц убачыў магчымасць пакрасавацца і прадставіў справу як "польскую інтрыгу". Таварыства не было ні зацверджана, ні распушчана, а заснула роўна на 20 гадоў. З гэтага моманту, паколькі Зямельны банк нездарма лічыўся прыладай русіфікацыі, а ў дваранскім клубе расейска-чыноўнічы элемент ужо пераважаў над мясцовымі абшарнікамі, у Вільні засталося толькі адно, пераважна мясцовае аб'яднанне, а менавіта скакавое таварыства, якое бараніла Галоўная ўправа дзяржаўных конезаводаў. Пасля таго як сельскагаспадарчае таварыства не было дазволена, скакавое таварыства, верагодна, дзякуючы канцэпцыі Адольфа Ялавіцкага, часткова ўзяло на сябе яго ролю і пачало перыядычна арганізоўваюць выставы коней і быдла. Пасля смерці яго

[92] Альбядзінскі Пётр Паўлавіч (1826-1883), генерал-ад'ютант, генерал-лейтэнант, віленскі генерал-губернатар у 1874-1880 гг. - *Л. Л.*

[93] Татлебен Эдуард Іванавіч (1818-1884), генерал-ад'ютант, інжынер-генерал, віленскі генерал-губернатар у 1880-1884 гг. У сваім маёнтку Кейданы, які належаў яму з 1866 г., у 1880-1882 гг. зладзіў парк, збудаваў палац і мінарэт у памяць вайны з туркамі (нагадваў мінарэт у Плеўне). Гэта збудаванне захавалася да нашага часу. Мінарэт спарадзіў мясцовыя паданні пра тое, што ён пабудаваны для задавальнення рэлігійных патрэбаў палюбоўніцы-турчанкі. - *Л. Л.*

[94] Адольф Ялавіцкі, удавец пасля знакамітай некалі прыгажуні княжны Чацвярцінскай, сяброўкі імператрыцы Яўгеніі. Другі раз ажаніўся са старэйшай дачкой Марыі Тышкевіч і пасяліўся ў маёнтку Чарэчы сваёй жонкі (у Дзісненскім павеце).

галоўных стаўпоў - Грабоўскага з Любельшчыны і Урсына Нямцэвіча, які доўгі час кіраваў таварыствам разам са слынным Аўгустам Патоцкім, паважаная стайня і таварыства "захварэлі" і спынілі дзейнасць.

Трагічная смерць Аляксандра II і ўступленне на трон Аляксандра III адразу не мела непасрэднага ўплыву на наш край. Як вядома, новы імператар нядоўга вагаўся паміж нібыта прагрэсіўнай палітыкай свайго бацькі з яго дарадцам Лорыс Мелікавым, і відочна рэакцыйнай палітыкай Пабеданосцава. Хутка ён вызначыў свой бок і міністрам унутраных спраў узяў былога вядомага амбасадара ў Канстантынопалі, старога графа Ігнацьева (па мянушцы Мянцір-паша). Ігнацьеў у якасці першага леку ад ліхаманкі, якой хварэла Расія, выбраў антысемітызм. Яго "Майскія правілы" [95] пагражалі нам цяжкім эканамічным крызісам, бо, з аднаго боку, яны забаранялі любое новае пасяленне яўрэяў у сельскай мясцовасці і таму любы ізраэліт, які па любых прычынах пакінуў сваё месца жыхарства, карчму, млын, конную пошту і г. д. - мусіў перасяліцца ў горад ці ў фармальна вызначанае мястэчка, а з другога боку, гэта рабіла несапраўднымі ўсе дагаворы арэнды не толькі сельскагаспадарчых, але і нават і прамысловых аб'ектаў па-за межамі гарадоў. Аднак на самой справе, на працягу наступных 30 гадоў я не адчуваў ніякіх праблем, бо яўрэі да такой ступені давяралі нам, дурным гоям, што замест афіцыйных, яны задавальняліся прыватнымі дамовамі. А пасяленне ў фальварках ці пры корчмах, рабілася выключна праз хабар, і ў гэтым сэнсе, як я сказаў вышэй, расійскай адміністрацыя была ўзорнай.

Тупы і ўпарты нацыяналізм Аляксандра III, чалавека адначасова абмежаванага і казачнага невука[96], але па-свойму добрасумленнага, адначасова і перашкаджаў і дапамагаў нам. Яго ўступленне на трон больш-менш супала з адстаўкай генерала Татлебена, месца якога заняў яго намеснік Каханаў[97], былы губернатар у Калішы.

Каханаў адразу пачаў моцную вайну супраць ужывання польскай мовы. Сярод іншага, ён загадаў праверыць статут шляхецкага клуба, у які акрамя мясцовых абшарнікаў уваходзілі і вяршкі расійскага чынавенства. Да параграфа, які прадпісваў членам клуба выконваць правілы этыкету, Каханаў дадаў словы: "… і не ўжываць польскай мовы". Гэта дурная фантазія абурыла нават саміх рускіх, якія пачалі дэманстратыўна вітаць сваіх мясцовых калег словамі: "Маё шанаванне Пану!". Аднак гэты выбрык зрабіў сваю справу, і праз нейкі час у клубе па-польску размаўлялі толькі ўпаўголаса. Зрэшты, апрача майго бацькі і мяне, з-за гэтага ніхто з клуба не выйшаў.

Затое той жа самы глыбока рэлігійны Аляксандр III ахвотна сцвярджаў: "Больш люблю набожнага ерэтыка, чым праваслаўнага недаверка", і лічыў, што адсутнасць каталіцкага біскупа ў Віленскай дыяцэзіі не на карысць праваслаўю, бо дае зашмат волю кліру і робіць каталікоў абыякавым. Таму ён загадаў прызначыць у Вільню сталага біскупа ў асобе ксяндза Грыняўвіцкага (першага пасля выгнання біскупа Красінкага ў 1862 г.), прафесара Пецярбургскай духоўнай акадэміі. У сталіцы яго лічылі асабліва "лаяльным". Цяжка Грыняўвіцкаму давялося, бо ў Вільні самыя "гарачыя" віталі яго як "маскаля", і таму ён з першага дня імкнуўся падкрэсліць сваю незалежнасць ад уплыву ўладаў. Але быў яшчэ малады і не тактоўны ў палітычным сэнсе. Таму хутка пачаў турбаваць расейцаў і асабліва генерал-губернатара Каханава і праз некалькі гадоў быў жорстка сасланы.

Як раз у той вечар я вячэраў у рэстаране з некалькімі сябрамі, дзе мы размаўлялі пра гэты інцыдэнт. Рускі, які сядзеў каля нас, перапыніў нашу размову: "Панове, вы аднабакова думаеце пра гэта. Я бачу тут доказ таго, як мы, праваслаўныя, мімаволі надаем вашай рэлігіі і кліру вышэйшую духоўнасць, чым наша і такім чынам выказваем ім большую пашану, чым сваім. Бо вашага біскупа

[95] Майскі правілы, мелі назву "Пра парадак прывядзення ў дзеянне правілаў аб яўрэях" - нарматыўны дакумент Камітэта міністраў Расійскай імперыі, апублікаваны 3 траўня 1882 года. Дакумент рэзка абмяжоўваў правы яўрэйскага насельніцтва і фактычна стаў паваротным пунктам імперскай палітыкі ў дачыненні да яўрэяў пасля рэформ Аляксандра II. Прыняты па ініцыятыве міністра ўнутраных спраў графа Н. П. Ігнацьева. - *Л. Л.*

[96] Як вядома, Аляксандр III быў другім сынам імператара Аляксандра II і спадчынікам трона стаў нечакана, пасля смерці свайго брата Мікалая. Пазней, у Пецярбургу, адна са знатных дам пры двары Аляксандра II расказала мне наступны анекдот: "Маці гэтых маладых в. князёў папрасіла старога гр. Строганава, які лічыўся пры двары вялікім вучоным, каб той прысутнічаў на ўроках яе сыноў і дакладваў ёй аб здольнасцях, стараннасці і поспехах. Строганаў сур'ёзна паставіўся да сваёй задачы і расказаў царыцы, што старэйшы сын мае вялікія здольнасці да навукі, жаданне вучыцца і працавітасць. Але што датычыць в. князя Аляксандра (які меў ужо 18 галоў), дык трэба ужыць самыя энергічныя сродкі, бо ён не толькі не мае здольнасцяў, але і не жадае вучыцца (апрача гімнастыкі), ганарыцца сваім невуцтвам і пагарджае сваімі выкладчыкамі. […] праз два гады малады асёл стаў спадчыннікам трона.

[97] Іван Сямёнавіч Каханаў (1825-1909), генерал ад артылерыі, віленскі, ковенскі і гарадзенскі генерал-губернатар. У 1893 годзе быў прызначаны членам Дзяржаўнага Савета. Прызначэнню гэтаму, аднак папярэднічаў карупцыйны скандал. Каханаў вырашыў паставіць у Вільні помнік М.М. Мураўёву, вядомаму як "вешальнік". Быў аб'яўлены збор сродкаў, аднак грошы на помнік раскралі падначаленыя Каханава. Адзін з іх неўзабаве пасля допыту памёр. Хадзілі чуткі аб яго атручэнні, паколькі ў сваіх паказаннях ён мог указаць Каханава. Аднак скандал з крадзяжом грошай не перашкодзіў Каханаву стаць членам Дзяржаўнага савета. - *Л. Л.*

ніхто пальцам крануў, хоць я і ведаю, што калі ён атрымаў з рук афіцэра паперу ад генерал-губернатара, у якой ад біскупа ў з'едлівай форме патрабавалася нешта, што ён як каталіцкі святар зрабіць не мог, біскуп не выказаў эмоцый, але сказаў афіцэру: "Скажы свайму генералу, што ён дурань (дурак)". Ведаеце, панове, што было б, калі б гэта зрабіў праваслаўны епіскап адной з цэнтральных губерняў? Афіцэр за бараду пацягнуў бы яго ў паліцыю пасля чаго епіскапа на ўсё жыццё замкнулі б у манастыр".

Я падумаў, што калі ў нас хай толькі вясковы вікарый завітвае да якой з нашых арыстакратак, дык яго адразу садзяць за стол на лепшае месца[98]. А калі поп у Расіі аддае пашану абшарніку, той выходзіць у сені і, пакланіўшыся ў пояс, загадвае служкам "подать батюшке водочки и закуски", пасля чаго ідзе па сваіх справах.

Можа гэты рускі меў рацыю?

## *Раздзел XIV*

## *Віленскі зямельны банк. Каханаў. Аржэўскі. Крожы*

Напачатку 1880-х гадоў наша віленскае грамадства, у тым ліку і Зямельны банк, панеслі цяжкую страту - памёр адзін з яго заснавальнікаў, дырэктар пан Ян Лубанскі, пра якога я ўжо згадваў вышэй. Ён, хаця і ўнук менскага яўрэя, але калі не з выгляду, дык па характары быў класічным засцянковым шляхцюком. Добры і руплівы гаспадар, аматар прагрэсу, але асабісты вораг усякай ашчаднасці, з-за чаго ледзь зводзіў канцы з канцамі. Меў вялікі маёнтак, аднак пасля сябе ён не пакінуў іншага капіталу, акрамя пасагу сваёй жонкі з Суліструўскіх. Крышталёва сумленны ў справах, ён меў неабмежаваны давер шляхты і пры сваім жыцці змог захаваць у банку, душой якога быў, не камерцыйны, а менавіта абшарніцкі характар. Угаворваў даўжнікоў браць як мага меншыя пазыкі, часам са сваёй кішэні дапамагаў ім адтэрмінаваць спагнанне запазычанасці, якая з-за ўказу ад 10 снежня стала для іх і для краю поўнай катастрофай.

А паколькі амаль што адначасова з ім памёр і дырэктар Васільеў, былы чыноўнік дзяржаўнага банка, які кіраваў усёй бухгалтэрыяй, то сярод пяці дырэктараў трэба было мець хаця б аднаго чалавека, дасведчанага ў банкаўскай справе. І тады ковенскі маршалак і старшыня ўправы граф Зубаў, знайшоў нейкага Юзафа Мантвіла, сярэдняга абшарніка Вількамірскага ці Шаўляйскага павета, які ў Германіі закончыў вышэйшую камерцыйную школу. Яму было наканавана адыгрываць вядучую ролю ў грамадскім жыцці Вільні на працягу амаль што 30 гадоў[99]. Мантвіл быў малодшым з чатырох сыноў так званага "вольнага чалавека" - загродавага шляхціца, які яшчэ ў часы прыгону зарабіў значны капітал самым сумленным чынам - праз арэнду і гандаль льном. Не вельмі здольны, не вельмі багаты і выхаваны, ён не трымаў у сваім доме ні адной кніжкі, але быў надзелены здаровым сэнсам і выключнай працавітасцю. З-за вялікай самаўпэўненасці і грубых манер, Мантвіл меў значны ўплыў на сярэдніх абшарнікаў і гарадскую інтэлігенцыю. Нежанаты і, як усе казалі, няздольны да шлюбу (у яго на твары не было валасоў), ён не меў вялікіх асабістых патрабаванняў, пры гэтым быў адначасова і вельмі дабрачынным і бясспрэчна прагным. Пазней я па-праве абвінаваціў яго ў "пакутніцкай філантропіі". Вельмі хутка ён надаў Зямельнаму банку чыста камерцыйны характар і рабіў больш для карысці акцыянераў, чым для членаў управы і ацэначнай камісіі ці для даўжнікоў і ўладальнікаў закладных лістоў. У адносінах да гэтых апошніх у Пецярбургу быў выпрацаваны вельмі строгі статут, разлічаны на паскораны пераход зямельнай маёмасці ў рускія рукі.

Ужо праз некалькі гадоў пасля прызначэння Мантвіла, мой брат Ігнацы зрабіў вялікі продаж лесу і ўклаў выручаныя за яго паўмільёна рублёў у акцыі банка, што ў той час прыносіла яму 16 % ад укладу і 12 % ад біржавай цаны. З-за асабістых прычын ён пасварыўся са с. п. Янам Лубанскім і Адамам Плятэрам, які адначасова быў губернскім маршалкам і дырэктарам банка і распачаў супраць іх заядлую кампанію [...] якая нічым не скончылася.

Кульмінацыяй гэтай вайны стаў агульны сход акцыянераў на пачатку студзеня, у сярэдзіне 1880-х гадоў, які прайшоў не без камізму. Красамоўны і вельмі гарачы с. п. Ігнацы, здольны супернічаць з нашымі самымі вядомымі змоўшчыкамі ў пошуках розных камбінацый у стылі Шэрлака Холмса, выступіў на тым агульным сходзе з актам абвінавачвання ўправы банка, які ў значнай ступені меў абгрунтаванне, але быў сфармуляваны так жорстка, што старшыня сходу граф Зубаў пагражаў яму (не маючы на гэта права) выдаленнем з залы. "Хай, хто-небудзь паспрабуе мяне выдаліць", - усклікнуў брат і адначасова ляпнуў па левай кішэні свайго сурдута, у якім можна было лёгка заўважыць грозную выпукласць рэвальвера ва ўнутранай кішэні. Неўзабаве, дзякуючы падтасаванай большасці, старшыня сходу галопам прапусціў усе прапа-

[98] У той час усе нашы ксяндзы былі кансерватарамі. Толькі на пачатку гэтага стагоддзя, калі цэнтр "выгодаў" перамясціўся з двара ў горад, асабліва ў Літве, нашы ксяндзы ўспомнілі пра евангельскага вярблюда і сталі дэмакратамі.

[99] Мантвіл Юзаф (1850-1911) - грамадскі дзеяч у Вільні, філантроп, заснавальнік т. зв. Мантвілаўскай фундацыі танных кватэр, касы пазык сялянам і г. д. У 1906 г. ініцыятар арганізацыі Музычнага таварыства "Лютня" ў Вільні; член III Дзяржаўнай думы, дырэктар Віленскага Земскага банка, сузаснавальнік Таварыства сяброў навук у Вільні ў 1907 г. - *Л. Л.*





новы праўлення, закрыў пасяджэнне, пасля чаго да брата падышоў паліцэйскі і загадаў аддаць яму схаваную ў кішэні агнястрэльную зброю. На гэта патрабаванне Ігнацы расшпіліў сурдут, выцягнуў з кішэні і аддаў паліцыянту … загорнуты ў паперу вялікі сальцісон.

Наступнай раніцай да мяне прыйшоў Юзаф Тышкевіч і паведаміў, што Ігнацы патрабуе ад яго неадкладна ехаць да Зубава ў якасці секунданта, каб выклікаць на дуэль. Тышкевіч быў маім братэрскім сябрам, але толькі прыяцелям майго брата і адказаў, што прыме гэту місію на сябе толькі, калі я пагаджуся быць другім секундантам. Хоць у той час (па прычынах, выкладзеным вышэй), я бачыўся са сваім братам толькі, калі наведваў маці, але лічыў, што ў справах гонару сямейная салідарнасць павінна пераважаць над прыватным рознагалоссем і прыняў прапанову з умовай, што Ігнацы цалкам пагодзіцца з рашэнням, якое прымем мы з Юзафам Тышкевічам. Галоўным чынам, я баяўся, што ў выпадку нашай адмовы, наш кліент неяк асабліва груба абразіць Зубава, што было б вельмі прыкра, бо з аднаго боку Зубаў быў самы годны з рускіх, а з іншага, гэта выклікала б непрыемнасці ад генерал-губернатара Каханава.

Ігнацы прыняў мае ўмовы, мы з Тышкевічам паехалі да Зубава і ўладзілі ўсю справу пратаколам, які задавальняў абодва бакі.

А Ігнацы выпадкова зарабіў мільён рублёў бо хацеў адпомсціць, калі не Зубаву, дык яго калегу і натхняльніку Адаму Плятэру.

Спосаб, які ён выбраў, быў самы пакутлівы для маршалка: Плятэр лічыў, што яго становішча вымагае ездзіць на самам прыгожай у Вільні пары коней, а аб прыгажосці коней ён мог меркаваць толькі па сантыметрах іх вышыні. Не мог нацешыцца, калі на каранацыі Аляксандра III яму ўдалося купіць у французскага амбасадара пару вярблюдаў, якія ўжо зрабілі сваю справу, калі цягнулі па Маскве вялізную карэту. Вярблюды рухаліся толькі крокам або малой рыссю, але мелі 1,85 м вышыні і ніякія коні ў Вільні не маглі з імі раўняцца, нават і пасапраўднаму шыкоўныя коні графіні-ардынатавай Клямянціны Тышкевіч (з Патоцкіх). Гэта стала кульмінацыяй суперніцтва паміж дамамі графаў-маршалкаў Плятэраў і графаў-ардынтаў Тышкевічаў, асабліва іх жаночай часткі. Хаця сума розных пераваг абодвух бакоў была больш-менш роўная, але па конскіх сантыметрах граф-маршалак мог пахваліцца знішчальнай перавагай, і таму не было для Тышкевічаў больш балючай помсты, чым адабраць у маршалка гэты рэкорд.

Пасля скандалу ў банку і сваркі з Зубавым Ігнацы вырашыў, што яму будзе лепш на нейкі час знікнуць з далягляду і паехаў у Харкаўскую губерню, дзе мелася стайня з рысакамі каласальных памераў. Брат выбраў і прывёз адтуль чорных рысакоў, якія на цэлы вяршок (4,5 см) былі вышэйшымі за вярблюдаў Плятэра, з якімі чорныя рысакі штодзень мерыліся, калі перад Зямельным банкам іх адмыслова спынялі на некалькі хвілін каля вярблюдаў.

Па дарозе ў Харкаў мой брат сустрэў у вагоне нейкага генерала Марысіна, які, як і многія з рускіх чыноўнікаў, любіў "майстраваць бізуны з пяску", г. з. спекуляваць, не маючы грошай. Генерал расказаў пра свае клопаты: нядаўна ў Харкаўскай губерні былі знойдзены вялікія радовішчы каменнай солі, якія нічым не саступалі самым знакамітым капальням. Радовішчы набыла бельгійская кампанія і пачала выкарыстоўваць іх з вялікай карысцю. Даведаўшыся пра гэта, Марысін выкупіў у сялян каля 40 дзесяцін зямлі пасярод бельгійскай канцэсіі, але ў яго не было грошай не толькі на бурэнне, але нават на тое, каб выплаціць увесь кошт зямлі. Да таго ж аказалася, што ў гэтым месцы соль знаходзіцца на вялікай глыбіні. Справа дайшла да таго, што прама тут ў вагоне вялікі рызыкант Ігнацы адкупіў у Марысіна правы на зямлю за 55 000 рублёў, потым амаль што год бурыў зямлю і яшчэ каля 150 000 рублёў паклаў на стварэнне капальні, але калі яго соль з'явілася на рынку, дык, каб пазбегнуць канкурэнцыі, бельгійская кампанія выкупіла яго капальню і з гэтага ён меў чысты прыбытак у мільён рублёў.

У той самы час дарадцы Аляксандра III, шукаючы паратунку ад лібералізму, думалі аб праектах, якія адначасова высунулі кіеўскі генерал-губернатар Дрэнталь і старшыня Віленскай апеляцыйнай палаты Стадольскі. Справа ішла пра абмежаванне правоў католікаў на спадкаванне зямлі па прамой лініі. Да таго моманту кароткатэрміновы саюз трох імператараў распаўся, пачалася русіфікацыя балтыйскіх правінцый, і разгарэлася шалёная кампанія Бісмарка і яго сябра Блайхродэра, накіраваная на абвал папяровага рубля - усё гэта нервавала ўчарашніх саюзнікаў.

Усё канчаткова канкрэтызавалася ва ўказе ад 5 снежня 1885 г. Указ абцяжарваў куплю зямлі ад імя фальшывых рускіх ці тых, хто карыстаўся іхнімі правамі, што здаралася ўсё часцей, а пераход маёмасці ў іншыя рукі стаў магчымым толькі з дазволу генерал-губернатара. Але галоўным чынам, гэты ўказ шкодзіў нашым інтарэсам, бо забараняў замежнікам набываць зямлю ў Польскім каралеўстве і ў так званых "памежных губернях", а ў выпадку калі замежны падданы станавіўся законным спадкаемцам зямельнай маёмасці на гэтай тэрыторыі, ён быў абавязаны на працягу трох гадоў пазбавіцца маёмасці на карысць пакупніка рускага паходжання. Гэта закранула шмат якія сем'і, але ў меншай ступені балтыйскіх немцаў, якія мелі сваякоў у Германіі ці Аўстрыі.

Неўзабаве, пасля выхаду гэтага ўказа з'явілася магчымасць яго больш шырокага ўжывання і істотнага ўплыву на эканоміку краю.

*(Працяг у наступным нумары.)*




*Гіпаліт Корвін-Мілеўскі*

# Успаміны пра семдзесят гадоў (1855-1925)*

## *Кніга першая. Прыватнае жыццё (Скарочаны пераклад)*

*(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)*

Нечакана памёр Пётр Вітгенштэйн - сын апошняй Радзівілоўны па нясвіжскай лініі, унук Дамініка Радзівіла. Падобна было на тое, што атруціўся, страціўшы французскую сяброўку свайго жыцця, да якой быў вельмі прывязаны. Яго законнай спадчынніцай была адзіная родная сястра, княгіня Гогенлоэ, жонка тагачаснага амбасадара ў Парыжы, пазнейшага канцлера[100]. А паколькі, у асноўным, спадчына знаходзілася ў межах Віленскай і Менскай губерняў - больш за мільён гектараў зямлі, то было зразумела, што раптоўны продаж такой колькасці пры забароне на пакупку для большасці мясцовых жыхароў, па сутнасці з'яўляецца канфіскацыяй на карысць розных шпекулянтаў. Гэтае багацце, з-за каласальнай колькасці каштоўнага лесу, калі б яго прадаць у нармальных умовах, прынесла б больш за 100 мільёнаў рублёў, а княгіня Гогенлоэ насамрэч атрымала толькі 12,5 мільёна рублёў бруднымі з іх толькі 2,5 чыстымі грашыма, бо на маёнтках меўся іпатэчны крэдыт Віленскага банка ў 10 мільёнаў рублёў. Але яна сама была віноўніцай гэтай катастрофы, бо празмерна ганарылася сваім становішчам еўрапейскай княгіні. Яна меркавала, што сваім візітам зможа выказаць гонар Пецярбургскаму двару і адправілася туды ў надзеі дамагчыся атрымаць выключэнне на сваю карысць. Папярэджаны аб прыездзе і мэце, Аляксандр ІІІ запрасіў яе ў Зімовы палац на баль, падышоў і сказаў, што хоць яго правілы не дазваляюць рабіць выключэнняў з закону, але ведаючы мэту княгіні, радзіць ёй, каб пазбегнуць катастрафічнай ліквідацыі маёмасці і для атрымання спадчыны, аднаго з сваіх трох сыноў перавесці ў рускае падданства. Княгіня, не прыняла прапанову, бо тады б яе сын быў бы адхілены ад намінацыі князя, роўнага пануючым родам і стаў бы звычайным падданым чужой дзяржавы. Яна адказала: "Найяснейшы пане! Я падумаю аб гэтым". Імператар моўчкі сышоў і калі праз некалькі дзён княгіня папрасіла аўдыенцыі, адмовіўся яе прыняць. Аднак ён пагадзіўся падоўжыць трохгадовы тэрмін, на працягу якога продаж такой колькасці зямлі быў бы немагчымы, бо акрамя іншага, падарваў бы інтарэсы банкаў.

Уся гэта велізарная спадчына перайшла ў рукі пакупнікоў, большасць з якіх толькі пазычылі свае імёны шпекулянтам лесам. Напрыклад маёнтак Смалявічы ў 75000 га, перайшоў у рукі менскага яўрэя Суціна, вялікае і раптоўнае багацце якога, мела па-сапраўднаму камічны выток. Ён сціпла працаваў у арандатара Смалявічаў, калі той памёр. Вітгенштэйн запрасіў у гэты маёнтак на паляванне на мядзведзя нямецкага князя. Прыехаў з госцем, а тут, з-за раптоўнай адлігі, мядзведзі ўцяклі з загародак. Вітгенштэйн у роспачы. З'яўляецца Суцін і абяцае князю, што ў дзень палявання мядзведзі будуць. Задаволены і надзвычай шчодры князь гарантуе - калі яўрэй стрымае сваё абяцанне, дык атрымае любую ўзнагароду.

Дасведчаны Суцін уначы прылятае ў Менск, купляе чатырох прывучаных да танцаў мядзведзяў, якіх нейкія рускія з Архангельскай губерні паказвалі ў горадзе, дастае з іх ноздраў жалезныя кольцы і выпускае ў лес, акружаны шматлікімі загародамі. У вызначаны час умела гоніць іх на пазіцыі 2-х князёў, і кожны з іх забівае па 2 касматыя танцоры.

Мудры яўрэй не прымае ніякіх грошай, а прапануе аднолькава выгадную абодвум бакам здзелку. А менавіта, ён хоча, каб Вітгенштэйн дазволіў яму за свае грошы, але

* Пераклад Леаніда Лаўрэша паводле: *Korwin-Milewski Hipolit. Siedemdziesiat lat wspomnien (1855-1925). Poznan, 1930.*

[100] Князь Хлодвіг Карл Віктар Гогенлоэ-Шылінгсфюрст (1819-1901), палітык і дыпламат, адзін са стваральнікаў Германскай імперыі, прынц Карвейскі і Раціборскі. У 1847 годзе ажаніўся з Марыяй Вітгенштэйнам (1829-1897), дачкой Льва Пятровіча Вітгенштэйна.

У шлюбе нарадзіліся чатыры сыны і дзве дачкі:
Лізавета Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1847-1915).
Стэфані Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1851-1882).
Прынц Філіп Эрнст Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1853-1915).
Альберт Франц Дамінікус Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1857-1866).
Морыц Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1862-1940).
Аляксандр Гагенлоэ-Шылінгсфюрст (1862-1924).
Сыны былі ахрышчаны каталікамі па бацьку, дочкі пратэстанткамі па маці. - *Л. Л.*





з матэрыялаў дзедзіча, пабудаваць вялікую вінакурню, якую ён будзе выкарыстоўваць працяглы час, пакідаючы пры гэтым бясплатна на карысць маёнтка ўсю брагу. Але ўвесь час арэнды вінакурні, для сваіх патрэб (рамонт, дровы і г. д.), яўрэй будзе задарма карыстацца смалявіцкім лесам князя. Удзячны Вітгенштэйн падпісаў кантракт без усякіх агаворак. А патрэбы "і г. д." вінакурні аказаліся настолькі вялікімі, што каля яе паўсталі некалькі тартакоў, і праз нейкі час Суцін стаў першым капіталістам і самым багатым лясным купцом на Меншчыне.

З гэтага падзелу рэштнаў "каралеўства" Караля Радзівіла "Пане Каханку", скарыстаўся таксама віленскі губернатар Чапялеўскі[101], які без адзінай капейкі набыў Веркі пад Вільняй, ранейшую дасканалую рэзідэнцыю біскупа Масальскага, павешанага ў часы Касцюшкі.

Гэта справа яшчэ працягвалася, калі за злоўжыванні быў высланы віленскі генерал-губернатар Каханаў. Яго змяніў генерал Аржэўскі[102], начальнік жандармерыі ў Польскім каралеўстве. У польскіх колах да яго было самае дрэннае стаўленне, што з'яўлялася добрай рэкамендацыяй у вачах Аляксандра III. Аржэўскі многае мог сабе дазволіць, бо быў жанаты з княгіняй Шахоўскай, любімай фрэйлінай царыцы Марыі Фёдараўны. І ён знайшоў спосаб нават Каханава пераўзыйсці ў ціску на грамадства.

Адной з першых яго ахвяр стаў мой брат Ігнацы. Яшчэ пры жыцці княгіні Гогенлоэ, вядома праз нейкага падстаўнога рускага, ён купіў лес Звярынец[103], які даходзіў ажно да самага горада. Каханаў без усялякіх юрыдычных падстаў прымусіў брата адмовіцца ад гэтай справы. Ігнацы капітуляваў не адразу, і паміж "палячышкам" і яго высокаправасхадзіцельствам генерал-губернатарам распачалася жахлівая па меркаванні тагачаснага рускага чалавека, спрэчка. Скандал яшчэ не астыў, калі ўладу пераняў Аржэўскі. Жадаючы даць узорны урок "бунтаўшчыку", ён скарыстаўся з таго, што брат, дзеля свайго папскага тытулу графа і пасля смерці нашай маці (1892 г.) прыняў аўстрыйскае падданства, цалкам законна забараніў яму жыць у межах генерал-губернатарства. З-за гэтага с. п. Ігнацы мусіў пазбавіцца свайго вытанчана, па-мастацку аздобленага палацыка па вуліцы Святаярскай. За трацiну таго, што ўклаў, Ігнацы прадаў палацык Антонію Тышкевічу - новай зорцы, якая ўздымалася над віленскім гарызонтам, трэцім з пяці сыноў Юзафа Тышкевіча з Ландварава - былога ад'ютанта пры віленскім генерал-губернатары.

Зусім малады тады Антоні Тышкевіч меў прэтэнзію спаборнічаць з сапраўдным віленскім магнатам Адамам Плятэрам. Тышкевіч абвінаваціў Плятэра ў тым, што той не ўмее "кшталціць людзей" і гэтым даваў зразумець, што з вышыні свайго досведу (яму было 22 гады), цалкам здольны на гэта. Менавіта тады я даведаўся (бо ўвогуле быў заўсёды слаба інфармаваны аб патаемных справах), што акурат над бацькаўскай кватэрай, у адваката Тадэвуша Урублеўскага збіраецца ўваскрэслае з універсітэцкіх часоў "таварыства шубраўцаў". Якія думкі мелі члены гэтага таварыства, я і дагэтуль не ведаю. Але думаю, што яны абмяжоўваліся энергічным "ківаннем пальцам ў боце" і рабілі гэта так ціха і асцярожна, каб ніводзін рускі не даведаўся пра існаванне гэтага "бунту" [104].

Другой ідэяй Аржэўскага было ўстанавіць помнік Мураўёву насупраць генерал-губернатарскага палаца (і вокнаў майго бацькі). Моцную агітацыю за гэта вяла газета "Новае Время", помнік павінен быў з'явіцца нібыта з ахвяраваннаў патрыётаў, а насамрэч, зразумела, за дзяржаўны кошт.

Натуральна, Аржэўскі не мог пазбегнуць ганенняў на каталіцызм і пераводу касцёлаў у цэрквы. Але на гэтай справе ледзь не зламаў сабе шыю. У мястэчку Крожы, што ў глыбіні Жмудзі (пра літоўскі рух тады яшчэ ніхто і не думаў) стаялі 2 касцёлы: адзін мураваны і даволі вялікі, другі драўляны і значна больш сціплы. Аржэўскі вырашыў, што католікам хопіць і другога, а першы пастанавіў ператварыць ў царкву для праваслаўных, якіх у ваколіцах наогул не было. Даведаўшыся пра гэта, заўзятыя жмудзіны, каб не дапусціць захопу касцёла ўладамі, зладзілі ў ім няспынную варту днём і ноччу і ўвесь час спявалі ружанцы і малітвы. Аржэўскі загадаў ковенскаму губернатару Клінгенбергу "прыняць рашучыя меры". Гэты ўрвіс першага калібру быў моцна скампраметаваны ў вачах саміх рускіх, бо з пасады таварыша пракурора ў паважаным і годным судзе, ён згадзіўся заняць пасаду віленскага паліцмайстра. Клінгенберг хацеў пакрасавацца ў гэтай справе, бо з'яўляўся балтыйскім немцам і лютаранінам. Ён прыехаў у Крожы з казакамі і, паколькі жмудзіны не выходзілі з касцёла, увёў туды казакоў з загадам нагайкамі выгнаць вернікаў.

Узняўся скандал са скандалаў, абурыўся увесь край, абурыліся ў тым ліку і прыстойныя рускія. Аржэўскі разлічваў замяць справу, бо ў нас не было іншай прэсы, акрамя афіцыйнага "Віленскага Весніка". Аднак гэта яму не атрымалася і ў першаю чаргу з-за вельмі асцярожнага і лаяльнага, але сумленнага князя Міхала Агінскага, які здолеў данесці справу да цара. Аляксандр III, які, як я ўжо казаў, быў па-свойму добрасумленным чалавекам.

[101] Іван Ільіч Чапялеўскі (1842-1904). Маршалак лідскай шляхты з 15.05.1875 па 1881 г. і з 1890 г. па 1895 г. З 5 ліпеня 1896 г. па 24 траўня 1899 г. - Віленскі губернатар. З 24 траўня 1899 г. па 25 кастрычніка 1904 г. - Віцебскі губернатар. - гл: Лаўрэш Леанід. Маршалкі Лідскага павета // Лідскі Летапісец. 2020. № 2(90). С. 13-19. - *Л. Л.*

[102] Пётр Васільевіч Аржэўскі (1839-1897) - генерал ад кавалерыі , таварыш міністра ўнутраных спраў, камандзір асобнага корпуса жандараў, віленскі, ковенскі і гарадзенскі генерал-губернатар. - *Л. Л.*

[102] Зараз - Жвярынас, сёння раён Вільні, у паўночна-заходняй частцы горада, за ракой Віліяй. - *Л. Л.*

[103] Пра шубраўцаў і Урублеўскага, гл: Абрамовіч Людвіг. Тадэвуш Урублеўскі // Наша слова. № 38 (1501), 23 верасня 2020. - *Л. Л.*

Ён дэлегаваў у Вільню дырэктара дэпартамента замежных веравызнанняў Кантакузена. Папярэджаны Аржэўскі, пасяліў яго ў сваім палацы, і справа пайшла аб хабары, які, з-за гучнасці справы і высокай пасады Кантакузена, павінен быў быць вельмі вялікім.

У гэты час у Вільню прыбыў дацэнт Кракаўскага ўніверсітэту граф Мастоўскі, які з дзяцінства выхоўваўся ў Кракаве, але быў уладальнікам шыкоўнага маёнтка Лучай у Свянцянскім павеце. Ён не меў ніякага ўяўлення пра вартасць сваёй маёмасці і атрымліваў з яе толькі невялікі даход, які дасылаў у Кракаў упаўнаважаны эканом. На гэтым маёнтку мелася вялікая запазычанасць яго маці (каля 200 000 рублёў). Паколькі ён ажаніўся супраць яе волі, раз'юшаная пані патрабавала вярнуць ёй маёнтак. Мастоўскі, які відочна, не меў жыццёвага спрыту, прыехаў у Вільню і адразу накіраваўся ў Зямельны банк, які па-сутнасці, быў адзіным грамадскім інстытутам абшарнікаў у краі. Ён патрапіў у рукі старшыні ацэначнай камісіі Эдмунда Барткевіча, які растлумачыў, што згодна з правіламі банка, ні ў якім разе нельга атрымаць крэдыт вышэй за 160 ці можа 180 тысяч рублёў, і трэба сплаціць доўг сваёй маці, але каб атрымаць гэтыя грошы, маёнтак трэба прадаць. Выпадкова знайшоўся пакупнік у асобе праваслаўнага немца і суседа Барткевіча Зандэра. Мастоўскі прадаў маёнтак за гэтую цану і вярнуўся ў Кракаў, але Барткевіч, вельмі бедны абшарнік, ап'янеў ад поспеху гэтай аферы і замест таго, каб трымацца за плячыма намінальнага гаспадара Зандэра, адразу асабіста пасяліўся ў Лучаі. Ён пачаў панаваць там, граць ролю дзедзіча, праводзіць рэформы і г. д.

Натуральна, што Аржэўскі вельмі хутка даведаўся пра маніпуляцыю. Для грознага Кантакузена гэта было сапраўднай маннай нябеснай! Аржэўскі прывёз Зандэра і Барткевіча да сябе і паразмаўляў з імі як жандар.: "Сібір - катарга - шыбеніца - і г. д.". Малазацікаўлены Зандэр ва ўсім прызнаўся, Барткевіч спужаўся, і Аржэўскі прымусіў іх перапрадаць гэты Лучай Кантакузену за банкаўскі доўг без ніякай даплаты [...] так, каб Барткевічу за яго "заслугі перад краем" дасталася якіх 20 000 "на піва". Потым удава дырэктара дэпартамента замежных веравызнанняў, княгіня Кантакузен, спешна прадала нешта з лесу і перапрадала гэта залатое яйка былому паліцмайстру і пазнейшаму кіеўскаму генерал-губернатару Клейгяльсу за 500 з нечым тысяч рублёў, а Клейгяльс перапрадаў Лучай шпекулянту, і ў выніку гэты маёнтак, з якога Мастоўскі пасля выплаты даўгоў маці не меў і ломанага шэляга, каштаваў каля мільёна двухсот тысяч рублёў.

Дзякуючы ўсяму гэтаму, скандал у Крожах набыў памеры егіпецкай піраміды. Аляксандр III ведаў пра яго раней, чым да яго з дакладам прыйшоў Кантакузен. У дакладзе Аржэўскі быў адбелены як бальная кашулька. Цар дазволіў яму закончыць даклад, а потым праспяваў яму поўную літанію вытанчанай расійскай лаянкай - такога багатага рэпертуару няма больш ні ў адной мове - схапіў немца сваімі мядзведжымі лапамі і з усяе моцы стукнуў яго аб зямлю, а потым ударыў нагой. Беднага хабарніка вынеслі аблітага крывёй з раны на грудзях і праз тры тыдні ён памёр у Біярыцы.

У Вільні эпілогам гэтай справы стаў судовы працэс над сапраўднымі ці ўяўнымі падбухторшчыкамі крожанскіх сялян супраць уладаў. Па тагачасным заканадаўстве, працэс адбыўся ў вышэйшай палаце суда з удзелам т. з. прадстаўнікоў станаў: губернскага маршалка, галавы горада і войта гміны. Плятэр, з аднаго боку не мог галасаваць супраць абвінавачаных, а з другога, баяўся за сваю кар'еру і таму загадзя з'ехаў на вёску і там "захварэў". Прынамсі, добра зрабіў, бо яго замяніў павятовы маршалак расеец Лявонцьеў, а абурэнне сярод саміх рускіх было настолькі вялікае, што пры належным вядзенні справы старшынём суда Стадольскім (хоць і вядомым "палякажэрцам"), большасць абвінавачаных была апраўданая "з-за недахопу доказаў", а астатнія атрымалі ілюзорныя вырокі. Аднак пан губернскі маршалак пасля гэтай гісторыі, з-за свайго "я умываю рукі" атрымаў мянушку "Пілатэр".

Сам Аржэўскі, дзякуючы ўплыву сваёй жонкі, на нейкі час выкруціўся. Аднак адчуваў сябе ў вялікай небяспекі, пакутаваў ад страху і яго лебядзінай песняй было адкрыццё помніка Мураўёву, пасля чаго, нарэшце, Аржэўскі здолеў прымусіць пана Пілсудскага (бацьку будучага начальніка польскай дзяржавы) прадаць яму свой прыгожы маёнтак Зулаў[105]. Нарэшце, ужо пры Мікалаі II, Аржэўскі аддаў Люцыпару сваю "прыгожую" душу.

Урачыстае адкрыццё помніка Мураўёву, якога саромелася большасць расейцаў краю, прайшло амаль што незаўважаным. З мясцовых прысутнічаў толькі губернскі маршалак Адам граф Плятэр, якога Аржэўскі выразна папярэдзіў, што калі маршалак яшчэ раз "захварэе", дык атрымае самы сур'ёзныя наступствы не толькі ён але і Зямельны банк[106]. Не бяруся судзіць Плятэра ў такіх варунках. У тыя, па-сапраўднаму пякельныя часы цяжка было правесці строгую дэмаркацыйную лінію паміж ахвярнасцю і подласцю.

Смерць Аляксандра III і ўступленне на трон Мікалая II ад пачатку не ўнеслі ніякіх змен у палітычныя

[105] Шляхетны Міхал Агінскі паспрабаваў неяк ўратаваць Зулаў і фіктыўна купіў яго, але Ажахоўскі пра гэта пранюхаў і сарваў пакупку. У выніку Агінскі страціў некалькі дзясяткаў тысяч рублёў.

[106] Помнік быў адкрыты ў Вільні ў 1898 годзе і прастаяў да эвакуацыі ўглыб Расіі ў 1915 годзе.

Пра стаўленне да яго з боку насельніцтва, яскрава напісала ў сваіх успамінах беларуская акторка і педагог Паўліна Мядзёлка: *"Іду на Дварцовую плошчу ў шэры дом, што насупраць скверу з помнікам Мурав'ёву-вешацелю. Каля помніка шпацыруе ўзад і ўперад гарадавы. Я ўспомніла, што мне апавядалі аб гэтым помніку. Даўней не было тут гарадавога. Ён паявіўся пасля адной штукі, якую выкінула віленская моладзь. Набралі хлопцы ў бойні*




тэндэнцыі ні на краёвым ні на агульнадзяржаўным узроўнях. Аляксандр ІІІ, які меў знешне разумную, але пустую жонку, цалкам даверыў ёй выхаванне пяцярых дзяцей, з умовай, каб яна не ўмешвалася ў дзяржаўныя справы. А царыца ставілася да дарослых дзяцей, як да немаўлятаў. Ужо паўнагадовы афіцэр гвардзейскага палка, спадчыннік трона Мікалай, пасля вандроўкі ў Японію, жыў так сціпла, што калі французскі амбасадар генерал Аперт наведаў асабіста яго, [...] дык цырымоніймайстар правёў француза праз гардэроб маці будучага цара, які быў перапоўнены апранутымі драўлянымі манекенамі і з гардэроба адчыняліся дзверы ў адзіны пакой, які займаў царэвіч. Ужо пасля ўступлення на трон і жаніцьбы з нямецкай прынцэсай Аляксандрай Фёдараўне, цар займаў у палацы сваёй маці (Анічкаў палац) толькі тры пакоі: спальню, гасцёўню і невялікі кабінет, дзе ён прымаў міністраў. Усе міністры перад аўдыенцыяй у цара мелі размову з яго маці і як напісаў начальнік асабістай аховы генерал Чарэвін, калі нейкі міністр меў неасцярожнасць адказаць, што абмяркуе гэта пытанне з імператарам, царыцы-маці ўскрыкнула: "Імператарам? Імператар памёр, а вы будзеце размаўляць з маім сынам!". Чарэвін хваліўся, што ў такіх выпадках адказваў: "Для Найяснейшай Пані ён сын, а для мяне імператар". Але можна меркаваць, што гэтыя словы ён казаў толькі калі ўжо выйшаў на лесвіцу[107].

Менавіта ў той час адбылася знакамітая сцэна, якая адразу ж, роўна на 10 гадоў, развеяла ўсе ліберальныя ілюзіі наконт змены палітычнага курсу. Прымаючы даволі вялікую дэлегацыю земстваў, Мікалай ІІ у адказ на вельмі сціплы зварот з намёкам на рэформы, адказаў сабраным, што ўсе іх надзеі - гэта "бессэнсоўныя мары".

Як потым расказвалі мне калегі па Дзяржаўнай думе, цара падбухторыў непасрэдна сам Пабеданосцаў.

[...]

Мікалай ІІ наведаў Кіеў. Там, прыязджаючы ў нядзелю міма каталіцкага храма, ён убачыў вялікі натоўп вернікаў, якія маліліся на вуліцы. Цар даведаўся, што ў Кіеве на некалькі дзясяткаў тысяч католікаў маецца толькі адзін касцёл, і загадаў пабудаваць другі за дзяржаўны кошт. Даведаўся таксама, што абшарнікі-католікі ўсё яшчэ плацяць кантрыбуцыю, накладзеную на іх трыццаць з лішкам гадоў таму пры Мураўёве. На ўрачыстым прыёме ён падышоў да пані Марыі Браніцкай з Белай Царквы і пасля некалькіх сказаных галасна слоў вітання, гучным шэптам спытаў: *"Няхай графіня скажа мне, ці праўда, што польскія гаспадары яшчэ плацяць кантрыбуцыю, накладзеную ў 1863 годзе?". "Найяснейшы пане, за гэтыя апошнія гады я мусіла заплаціць больш за 50 000 рублёў"*. Пасля некалькіх іншых гучна сказаных слоў, цар выйшаў з залы, а кантрыбуцыя была хутка скасавана[108].

У нас у Вільні новыя тэндэнцыі адчуваліся перш за ўсё ў тым, што пасля смерці генерал-губернатара Аржэўскага не быў прызначаны яго заступнік. Гэтыя функцыі перадалі генералу Троцкаму[109], які ў спадчыну атрымаў начальніка канцылярыі Судзейкіна, сына забітага нігілістамі пры Аляксандры ІІІ палкоўніка жандараў. Судзейкін [...] выклікаў першыя з часоў Патапава промні святла ў нашых справах, што спрыяла майму выхаду на грамадскую арэну. Але тут я падыходжу да другога перыяду майго жыцця, з 1898 па 1914 год.

*трыбухоў і кішок, ноччу абляпілі імі помнік з галавы да ног, а на пастамент вылілі некалькі бутэлек валяр'янкі. Зляцеліся са ўсяго гораду сабакі да трыбухоў, а каты на пах валяр'янкі. І што там тварылася ля падножжа помніка, можна сабе ўявіць! З таго часу гарадавы днём і ноччу сцеражэ гэты помнік".*

Лепшы лідскі гісторык ХХ стагоддзя Міхал Шымялевіч пісаў: *"... у 1898 г. паставілі Мураўёву ў Вільні, на пляцы Напалеона, пышны помнік, на якім ён быў прадстаўлены ў велізарнай бронзавай статуі, абапёрты на тоўсты кій. Я бачыў асабіста, як у ліпені 1915 г. пры эвакуацыі ... з Вільні падымалі той помнік з гранітнага пастамента, падвешаны на ланцугах да пастаўленага трохкутніка з тоўстых бетонаў. Потым бачыў тую самую статую ў Пецярбургу пад гмахам Музея артылерыі.*

*... [для] ўшанавання памяці трагедыі пад Дубічамі* (на месцы пахавання паўстанцаў з аддзела Людвіка Нарбута разам з сваім камандзірам - *Л. Л.*) .... *паўстаў [...] помнік, паводле праекту прафесара УСБ Фердынанда Рушчыца ... коштам абываццеляў Лідскага павета..., мастак-разьбяр - прафесар УСБ Балзукевіч. ... Адкрылі помнік 6 жніўня 1933 года. На аснову помніка прывезлі з Вільні гранітны пастамент помніка Мураўёва, які там, на пляцы Напалеона, тырчаў, як агідны ўспамін пра сатрапа". - Л. Л.*

[107] Гэтага Чарэвіна я ведаў асабіста яшчэ маладым паручнікам гвардыі ў доме яго маці ў Дэрпце, дзе яна жыла са сваёй вельмі прыгожай дарослай дачкой і малым гімназістам-сынам. [...] Будучы "вялікі магістр шпіёнаў", як ён потым называў сябе, быў тады вясёлы і дасціпны малады чалавек і прафесійны п'яніца.

[108] Кантрыбуцыю плацілі і зусім небагатыя шляхціцы. У 1896 г. дзед майго цесця (прадзед жонкі) Марцін Хруль выплаціў у казну 2 рублі 90 капеек як падатак "з маёнткаў асобаў польскага паходжання" са свайго даходу ў памеры 42 рублі 70 капеек, які ён меў з 42 дзесяцінаў зямлі ў Воўкавічах і Ёдках, што пад Лідай. Гл: Виленские губернские ведомости. 1896. № 53. - *Л. Л.*

[109] Віталій Мікалаевіч Троцкі (1835-1901), генерал-ад'ютант, генерал ад інфантэрыі, з 25.02.1895 года - камандуючы войскамі Віленскай вайсковай акругі. З 1897 года і да смерці - Віленскі, Ковенскі і Гарадзенскі генерал-губернатар. - *Л. Л.*